# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

# XIX – пачатак XXI ст.

***Практыкум***

Репозиторий ВГУ

*2010*

УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73
Г51

Аўтар-складальнік: дацэнт кафедры гісторыі Беларусі УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", кандыдат гістарычных навук **М.М. Пархімовіч**

Р э ц э н з е н т ы:
дэкан ФДП ІПК і ПК УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.Дз. Тогулева*; кандыдат гістарычных навук, дацэнт *П.В. Аляксеенкаў*

Практыкум па гісторыі Беларусі :XIX – пачатак XXI ст. прызначаецца студэнтам II курса гістарычнага факультэта спецыяльнасці 1-23 01 12-04 "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм)".

У вучэбным выданні прапануюцца праграма, тэматычны план, планы семінарскіх заняткаў з асноўнымі паняццямі, тэрмінамі, назвамі, асобамі, храналогіяй, што трэба ведаць студэнту ў выніку засваення кожнай тэмы. Студэнтам прапануюцца таксама парады, што раскрываюць сутнасць кожнага пытання і арыентуюць студэнта на асноўныя моманты, на якія патрэбна звярнуць увагу, рыхтуючыся да семінару. Для ўсіх тэм дадзены спіс крыніц, асноўнай і дадатковай літаратуры. Для самакантролю па засваенню кожнай тэмы даецца тэставы блок. У практыкуме прыводзяцца пытанні да экзаменаў.

**УДК 947.6(075.8)**
**ББК 63.3(4Бел)я73**

© УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2010

Репозиторий ВГУ

## ЗМЕСТ

Уводзіны ………………………………………………… 4

Тэматычны план курса “Гісторыя Беларусі” XIX – пачатак XXI ст. ………………………………………… 6

Праграма курса “Гісторыя Беларусі” XIX – пачатак XXI ст. ……………………………………………… 8

Літаратура …………………………………………….. 40

Планы семінарскіх заняткаў па курсу “Гісторыя Беларусі” з метадычнымі парадамі і тэставымі заданнямі ……………………………………………… 47

Пытанні да экзаменаў (III, IV семестры) ……………… 134

Репозиторий ВГУ

# У В О Д З І Н Ы

Семінар – групавыя практычныя заняткі пад кіраўніцтвам выкладчыка ў вышэйшай навучальнай установе. У вывучэнні гісторыі Беларусі семінары з’яўляюцца адной з асноўных формаў вучэбнай работы. Іх мэта – паглыбленне і замацаванне ведаў, атрыманых студэнтамі на лекцыях і ў час самастойнай працы, выпрацоўка уменняў і навыкаў работы з крыніцамі і манаграфічнай літаратурай. Семінар дае магчымасць студэнту атрымаць адказы на пытанні, што ўзнікаюць у працэсе падрыхтоўкі, авалодаць уменнем структураваць уласныя выступленні, ацэньваць і браць лепшае з працы сваіх калег-студэнтаў.

Разам з тым семінарскія заняткі з’яўляюцца формай кантролю самастойнай працы студэнтаў і даюць магчымасць выкладчыку вызначаць іх здольнасці, узровень падрыхтаванасці і, зыходзячы з гэтага, накіроўваць і рэгуляваць работу.

Падрыхтоўку да семінара мэтазгодна пачынаць са знаёмства з планам заняткаў. Вельмі важна зразумець сэнс кожнага пытання прапануемага плана. Зрабіць гэта дапамогуць метадычныя парады. Яны вызначаюць асноўныя моманты, на якія студэнт павінен звярнуць увагу пры падрыхтоўцы і адказе. Падкрэслім, што дадзеныя рэкамендацыі не павінны ўспрымацца як догма і абмяжоўваць імкненне студэнтаў да ахопу шырэйшага кола праблем.

Наступным этапам падрыхтоўкі з’яўляецца вывучэнне пытанняў семінара па канспекту лекцый і асноўнай вучэбнай літаратуры. З пералічаных у спісе асноўнай літаратуры акадэмічных выданняў і вучэбных дапаможнікаў студэнт мае права выкарыстаць адно выданне на выбар. З манаграфіямі і артыкуламі патрэбна азнаёміцца абавязкова. Гэта створыць аснову ведаў і аблегчыць працу з гістарычнымі крыніцамі і дадатковай літаратурай.

Праца з крыніцамі мае асабліва важнае значэнне. Яна дазваляе адчуць дух эпохі, развівае самастойнасць і крытычнасць мыслення, дапамагае студэнту абстрагавацца ад меркаванняў даследчыкаў і выпрацаваць уласны пункт погляду на праблему. Неабходна памятаць, што гістарычныя крыніцы з’яўляюцца прадуктам мэтанакіраванай чалавечай дзейнасці. Таму пры іх

Репозиторий ВГУ

аналізе патрэбна імкнуцца да вызначэння і ўліку светапогляду і сацыяльных арыентацый аўтара. Таксама мэтазгодна параўноўваць інфармацыю розных крыніц па абмяркоўваемых пытаннях.

Знаёмства з дадатковай літаратурай дазволіць паглыбіць веды студэнта. Патрабуецца ***азнаёміцца як мінімум з адной манаграфіяй і адным артыкулам па кожнай тэме***.

Працуючы з літаратурай, студэнт павінен складаць канспект. Лепш за ўсё гэта рабіць у асобным сшытку для семінарскіх заняткаў. Канспект крыніц павінен быць падрабязным. Пры канспектаванні літаратуры дастаткова абмежавацца тэзісамі, у якіх будзе занатавана сутнасць поглядаў пэўнага даследчыка. Выпіскі павінны суправаджацца бібліяграфічнымі спасылкамі, у якіх неабходна ўказаць прозвішча і імя аўтара, назву кнігі ці артыкула, месца і год выдання (для артыкула – яшчэ назву часопіса і нумар), старонкі, на якіх змяшчаецца выпісаная інфармацыя.

Пасля вывучэння крыніц і літаратуры раім скласці на асобных аркушах разгорнуты план адказу на кожнае пытанне. План можа адпавядаць наступнай універсальнай схеме:

а) прычыны падзеі, з'явы, працэсу;

б) сутнасць;

в) вынікі;

г) значэнне.

У дадатак да разгорнутага плана можна выпісаць і растлумачыць асноўныя паняцці, звязаныя з тэмай семінара. У гэтым дапаможа даведачная літаратура. Мэтазгодна зрабіць таксама храналогію асноўных падзей.

Падчас выступлення студэнту дазваляецца карыстацца сваімі канспектамі. Сістэматычная падрыхтоўка да семінараў, актыўная праца ў час заняткаў паспрыяюць фарміраванню трывалых ведаў і дапамогуць паспяхова здаць экзамены па гісторыі Беларусі.

Рэпазіторый ВДУ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН КУРСА “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ XIX – ПАЧАТАК XXI ст.”

| № п/п | Назва тэмы | Лекцыі | Семінарскія заняткі | КСР |
|---|---|---|---|---|
| **III семестр** | | | | |
| 1. | Палітыка царызму на Беларусі ў к. XVIII – п.п. XIX ст. | 2 | | |
| 2. | Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў п.п. XIX ст. | | 2 | |
| 3. | Вайна 1812 г. на Беларусі. | 2 | 2 | |
| 4. | Грамадска-палітычны рух на Беларусі ў п.п. XIX ст. | 2 | | |
| 5. | Культура на Беларусі ў п.п. XIX ст. | 4 | 2 | |
| 6. | Буржуазныя рэформы 60–70-х гг. XIX ст. | 4 | 2 | |
| 7. | Грамадска-палітычны рух на Беларусі ў 2-й палове XIX ст. | 2 | | |
| 8. | Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 2-й палове XIX ст. | 2 | | |
| 9. | Беларусь на шляху капіталістычнага развіцця. | | 2 | |
| 10. | Беларусь у пачатку XX ст. (1900–1916 гг.). | 2 | | |
| 11. | Рэвалюцыя 1905–1907 гг. на Беларусі. | | 4 | |
| 12. | Культура на Беларусі ў 2-й палове XIX ст. – 1917 г. | | 4 | |
| 13. | Фарміраванне беларускай нацыі. | | 2 | |
| 14. | Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя на Беларусі | 4 | | |
| 15. | Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі | 4 | | |
| 16. | Беларусь у гады грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі | 2 | | |

Репозиторий ВГУ

| № п/п | Назва тэмы | Лекцыі | Семінарскія заняткі | КСР |
|---|---|---|---|---|
| 17. | Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі, грамадзянская вайна і замежная інтэрвенцыя на Беларусі (1917–1920 гг.) | | 2 | |
| 18. | Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці (1917–1927 гг.) | 4 | 4 | |
| | **Усяго** | **34** | **26** | |
| **IV семестр** | | | | |
| 19. | БССР у 1921–1939 гг. | 4 | | |
| 20. | БССР у гады НЭПа (1921–1928 гг.) | | 2 | |
| 21. | БССР у канцы 20-х–30-я гг. XX ст. | | 4 | |
| 22. | Заходняя Беларусь у складзе Польшчы. | 2 | | |
| 23. | Становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы. | | 2 | |
| 24. | Беларусь у гады Другой сусветнай вайны. | 4 | 4 | |
| 25. | Беларусь у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе | 2 | | |
| 26. | БССР у сярэдзіне 1950 – сярэдзіне 1980-х гг. | 4 | | |
| 27. | БССР з сярэдзіны 1950 – да канца 80-х гг. XX ст. | | 4 | |
| 28. | БССР у сярэдзіне 1980 – пачатку 1990-х гг. | 2 | | |
| 29. | Рэспубліка Беларусь у 1991 – 2009 гг. | 2 | | |
| 30. | Рэспубліка Беларусь на сучасным этапе. 1991–2009 гг. | | 2 | |
| | **Усяго** | **24** | **20** | |

Репозиторий ВГУ

# ПРАГРАМА КУРСА “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ” XIX – ПАЧАТАК XXI ст.

## КРЫЗІС ПРЫГОННІЦКАЙ СІСТЭМЫ (КАНЕЦ XVIII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIX СТ.)

Гістарыяграфія праблемы. Аналіз крыніц па гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст.

### Палітыка царызму на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.

Тэрытарыяльна-адміністрацыйныя падзелы Беларусі і новая адміністрацыя. Органы кіравання і суда. Ліквідацыя феадальнай анархіі. Захаванне правоў і прывілеяў шляхты Беларусі. Раздача беларускіх зямель рускім памешчыкам. Становішча сялян. Падаткі і павіннасці. «Дарчая грамата гарадам» 1785 г. і адмена юрысдыкцыі савецкіх і царкоўных феадалаў у адносінах да пражываючых на землях гараджан. «Мяжа яўрэйскай аселасці» і яе роля ў развіцці гарадоў. Адносіны царызму да уніяцкай і каталіцкай канфесій, дзейнасць езуітаў. Сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы. Палітыка царызму ў галіне духоўнай культуры і асветы. Праект аднаўлення Вялікага княства Літоўскага.

### Вайна 1812 г. на тэрыторыі Беларусі

Расійска-французскія адносіны і палітычная сітуацыя ў заходніх губернях напярэдадні вайны. Утварэнне Варшаўскага герцагства. Перадача Расіі Беластоцкай акругі. Праекты аднаўлення Польшчы і Вялікага княства Літоўскага.

Пачатак вайны. Мабілізацыя беларусаў у Расійскую армію. Адступленне рускіх армій і баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 г. Акупацыя Беларусі войскамі Напалеона. Акупацыйны рэжым. Пазіцыі магнатаў і шляхты. Дзейнасць Камісіі Часовага праўлення Вялікага княства Літоўскага. Рабаванне насельніцтва Беларусі. Падтрымка акупантамі прыгонніцкіх парадкаў. Партызанскі рух. Барацьба супраць акупантаў і мясцовых памешчыкаў. Адступленне французаў з Масквы. Ваенныя падзеі на тэрыторыі Беларусі восенню 1812 г. Вызваленне Полацка, Віцебска, бітва за мястэчка Чашнікі. Разгром французскага войска на Бярэзіне. Вызваленне Беларусі ад захопнікаў у канцы снежня 1812 г. Разарэнне краю ў ходзе вайны.

Репозиторий ВГУ

## Грамадска-палітычны рух. Паўстанне 1830–1831 гг.

Уздзеянне на Беларусь грамадска-палітычных падзей у Расіі і польскага нацыянальна-вызваленчага руху. Сацыяльна-саслоўны склад і характар грамадска-палітычнага руху. Віленская асацыяцыя. Віленскі універсітэт як цэнтр польскага апазіцыйнага і рэвалюцыйна-шляхецкага руху. «Таварыства філаматаў» (Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ян Чачот, Юзэф Яжоўскі). Дзейнасць «Таварыства аматараў навук». Дзекабрысты і Беларусь. Тайнае «Палітычнае таварыства» і яго дзейнасць. «Таварыства ваенных сяброў» у Асобным літоўскім корпусе (Гродзенская губерня). Выступленні дзекабрыстаў у літоўскім корпусе і ў Бабруйскай крэпасці. Разгром тайных таварыстваў.

Паўстанне 1830–1831 гг. у Польшчы, Літве і ў Беларусі. Яго мэты і праграма дзеянняў. Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт. Развіццё паўстання ў заходніх і паўднёвых раёнах Беларусі. Мабілізацыя сялян і мяшчан. Бітва за Вільню. Падаўленне паўстання і яго значэнне. Замежная і айчынная гістарыяграфія аб характары паўстання.

## Палітычная лінія царскага ўрада ў заходніх губернях у канцы XVIII – першай чвэрці XIX ст.

Палажэнне аб яўрэях. Ваенныя пасяленні. Скасаванне ордэна езуітаў на Беларусі. Сялянскія пытанні.

Спробы раскалоць польскі нацыянальна-вызваленчы рух і антыфеадальную барацьбу сялян. Увядзенне «Правілаў аб аддачы сялян па найму ў зямельныя і іншыя чорныя работы», люстрацыі казённых маёнткаў і інвентарызацыі маёнткаў памешчыкаў.

Курс на русіфікацыю Беларусі. Насаджэнне рускага землеўладання і чыноўніцтва. «Разбор шляхты». Закрыццё Віленскага універсітэта. «Асобны камітэт па справах заходніх губерняў». Падрыхтоўка ліквідацыі уніяцкай царквы. Полацкі царкоўны сабор і яго рашэнні. Супраціўленне ніжэйшага уніяцкага духавенства. Знішчэнне уніяцкіх кніг і царкоўнай маёмасці. Секулярызацыя царкоўных уладанняў. Адмена дзеяння ў Беларусі і Літве Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Увядзенне расійскага заканадаўства.

## Грамадска-палітычны рух у 1830–1850-я гады

Зараджэнне рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні. “Экспедыцыя Валовіча”. «Дэмакратычнае таварыства». Франц Савіч. “Саюз свабодных братоў”. Уплыў рэвалюцыйных падзей у Заходняй Еўропе на грамадска-палітычны рух у Беларусі.

Рэпазіторый ВДУ

## Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.

Гістарыяграфія пытання аб узроўні развіцця капіталістычных адносін. Сельская гаспадарка. Развіццё фальваркава-паншчыннай сістэмы. Панаванне ў эканоміцы буйных феадалаў, рост паншчыны і іншых павіннасцяў. Земляробства, жывёлагадоўля, промыслы, рамёствы. Пачатак спецыялізацыі сельскай гаспадаркі. Пашырэнне шматпольных севазваротаў, удасканаленных прылад працы і тэхнікі. Павелічэнне таварнасці сельскагаспадарчай вытворчасці. Рост ужывання наёмнай працы, найперш прымусовага найму. Маёмасная нівеліроўка сялянскіх гаспадарак. Нізкія тэмпы сацыяльнай дыферэнцыяцыі беларускага сялянства. Павелічэнне колькасці бабылёў, кутнікаў, агароднікаў.

Прамысловасць. Вотчынныя, местачковыя і гарадскія прадпрыемствы. Этапы развіцця капіталістычнай прамысловасці. Рамёствы, мануфактуры, фабрыкі. Прымусовы і вольны наём. Галіновая структура прамысловасці. Паляпшэнне шляхоў зносін. Важнейшыя гандлёвыя шляхі і кірмашы. Вузкасць унутранага рынку. Фінансы. Слабасць капіталаў беларускіх гандляроў.

Рост гарадоў і мястэчак. Колькасць, саслоўны і нацыянальна-канфесійны склад гарадскога насельніцтва. Прымусовае высяленне яўрэйскага насельніцтва ў гарады і мястэчкі Беларусі. Органы гарадскога самакіравання.

Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Заняпад сялянскай гаспадаркі ў 1840–1850-я гады. Абеззямельванне сялян. Зніжэнне ўраджайнасці і скарачэнне пасеваў. Рост нядоімак дзяржаўных падаткаў і збораў, а таксама запазычанасці ў памешчыкаў. Рэформа Кісялёва. Спробы рэгулявання ўзаемаадносін памешчыкаў і сялян паводле «Інвентарнай рэформы». Развіццё капіталістычнага ўкладу. Паншчынная сістэма як тормаз развіцця сельскай гаспадаркі, прамысловасці і гарадоў. Нарастанне антыпрыгонніцкага сялянскага руху.

## Асвета і культура Беларусі першай паловы XIX ст.

Гістарычныя ўмовы развіцця культуры. Асветніцтва і класіцызм. Уплыў польскай і рускай культур на культуру беларускага народа. Нацыянальна-культурная палітыка царызму.

Народная адукацыя і навука. Палітыка царызму ў галіне культуры. Непрызнанне існавання беларускага этнасу, яго мовы і культуры. Тыпы школ і іх колькасць. Узмацненне паланізацыі ў сістэме народнай асветы. Полацкая езуіцкая акадэмія. Віленскі універсітэт як цэнтр адукацыі і навукі ў Беларусі і Літве. Узмацненне цікавасці да гісторыі, быту і культуры беларускага народа.

Рэпазіторый ВДУ

Этнаграфічныя і гістарычныя даследаванні. Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Кнігавыдавецкая дзейнасць. Перыядычны друк. Грамадска-палітычная думка. Русіфікацыя сістэмы народнай адукацыі пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг.

Літаратура. Беларускі фальклор. Паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Беларускія матывы ў творчасці А. Міцкевіча. Беларуская плынь у польскамоўнай «краёвай» літаратуры. Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Уладзіслаў Сыракомля, Вінцэсь Каратынскі, Арцём Вярыга-Дарэўскі.

Музыка і тэатр. Збіранне і вывучэнне беларускай народнай песні, яе канцэртная прапаганда. З'яўленне опернага мастацтва ў Беларусі. Станіслаў Манюшка: оперы «Сялянка», «Галька», «Страшэнны двор». З'яўленне прафесійнай беларускай драматургіі. В. Дунін-Марцінкевіч.

Архітэктура. Панаванне класіцызму з канца XVIII ст. Складанне новых праектных планаў гарадоў, стварэнне выдатных архітэктурных ансамбляў на прынцыпах класіцызму. Іосіфаўскі сабор у Магілёве, Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі. Палацава-сядзібная архітэктура.

Выяўленчае мастацтва. Класіцызм, афіцыйны акадэмізм, рамантызм. Партрэт, пейзаж, бытавы жанр. Творчасць І.І. Аляшкевіча, В.М. Ваньковіча, І.Ф. Хруцкага, С.К. Заранкі, Я. Рустэма, Ю. Пешкі, Ю. Карчэўскага. Прыгонныя мастакі: Ц. Бычкоўскі, К. Бахметавіч, К. Русецкі, В. Дмахоўскі. Гістарычны жывапіс: Ф. Смуглевіч, Я. Дамель, Я. Сухадольскі. Манументальна-дэкаратыўны жывапіс. Класіцысцкая традыцыя. Роспісы касцёла св. Тадэвуша ў в. Лучай Пастаўскага раёна. Дэкарыраванасць Варварынскай царквы ў Пінску.

Графіка. Росквіт народнага лубка. Творчасць гравёраў М. Падалінскага, Б. Клямбоўскага, К. Кукевіча, К. Бахматовіча, Ю.Азямблоўскага. Выспяванне беларускай нацыянальнай ідэі.

Скульптура. Пераважнае развіццё манументальна-дэкаратыўнай скульптуры і мемарыяльнай пластыкі. Панаванне класіцызму і позняга барока. Закрыццё ў 1821 г. скульптурнага класа ў Віленскай мастацкай школе. Станкавая скульптура. Творчасць Караля, Яна і Казіміра Ельскіх. Рафал Слізень – аўтар медальёнаў і барэльефаў передавых дзеячаў культуры свайго часу.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Развіццё мануфактурнай вытворчасці. Ліцейнае і кавальскае рамяство. Мастацкая апрацоўка чорнага металу. Вырабы з чыгуна. Ліццё з бронзы, свінца, волава. Ювелірнае мастацтва. Пляценне з саломы. Ткацтва. Слуцкія паясы. Беларускае шкло.

Репозиторий ВГУ

## *Раздзел VII.*
## СТАНАЎЛЕННЕ БУРЖУАЗНАГА ГРАМАДСТВА Ў БЕЛАРУСІ. ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ (1861–1900 гг.)

Час, шляхі і формы станаўлення буржуазнага грамадства ў краінах Заходняй і Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Буржуазныя рэформы і іх значэнне для развіцця Беларусі. Гістарыяграфія і крыніцы па праблемах капіталістычнага развіцця Беларусі.

Новы парадак кіравання сялянамі. Адмена прыгоннага права. Абвастрэнне сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў сярэдзіне XIX ст. Пачатак падрыхтоўкі сялянскай рэформы і ініцыятыва інвентарных камітэтаў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў. Рэскрыпт Назімаву. Дзейнасць губернскіх камітэтаў. Сялянскі рух у 1859–1860 гг. Маніфест і «Палажэнні» 19 лютага 1861 г. Спецыфіка мясцовых «Палажэнняў» для Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губерняў.

Правы сялян. Умовы надзялення іх зямлёю. «Часоваабавязанае становішча». Уздым сялянскага руху. Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 г. Рэформы аграрных адносін дзяржаўных сялян і іншых катэгорый сельскага насельніцтва. Вынікі і значэнне сялянска-аграрных рэформ.

Ваенная, земская, судовая, гарадская, цэнзурная, школьная рэформы. Буржуазная сутнасць рэформ, іх непаслядоўнасць і абмежаванасць. Выключэнне з агульнага заканадаўства і дадатковыя абмежаванні, што датычыліся тэрыторыі Беларусі і Літвы. Іх прычыны. Увядзенне інстытута земскіх начальнікаў і адміністрацыйнага земства.

Развіццё сельскай гаспадаркі. Усталяванне капіталізму ў сельскай гаспадарцы краін Заходняй Еўропы. Прускі і амерыканскі шляхі развіцця аграрнага капіталізму. Цяжкасці перабудовы гаспадаркі на капіталістычны лад у Беларусі. Кабальныя адработкі. Паглыбленне крызісу памешчыцкай гаспадаркі. Скарачэнне дваранскага землеўладання і рост бессаслоўнай зямельнай уласнасці. Асаблівасці гэтага працэсу ў Беларусі. Аграрны крызіс 1880-х гадоў і яго ўплыў на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі. Галоўныя накірункі спецыялізацыі. Развіццё прадпрымальніцкай гаспадаркі. Фарміраванне сельскай буржуазіі і пралетарыяту. Падаткі і павіннасці сялян. Становішча сялянскай беднаты.

Транспарт, гандаль і крэдыт. Будаўніцтва чыгунак. Важнейшыя чыгуначныя лініі ў Беларусі. Іх уплыў на развіццё сельскай гаспадаркі і гандлю. Дзейнасць Дзяржаўнага, Сялянскага, Дваранскага і іншых



Репозиторий ВГУ

банкаў у Беларусі. Абмежаванне ў адносінах да памешчыкаў «польскага паходжання».

Развіццё прамысловасці і рост гарадоў. Важнейшыя дасягненні ў індустрыялізацыі краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы ў XIX ст. і іх уплыў на развіццё грамадства. Станаўленне фабрычнай вытворчасці Беларусі. Галіновая структура і размяшчэнне прамысловасці. Высокая ўдзельная вага дробнай вытворчасці. Замаруджаныя тэмпы пераходу да машыннай вытворчасці (фабрыкі). Прамысловае развіццё гарадоў і мястэчак. Змены ў параўнанні з першай паловай XIX ст. Прамысловасць у сельскай мясцовасці. Фарміраванне гандлёва-прамысловай буржуазіі і прамысловага пралетарыяту. Іх нацыянальны склад. Становішча прамысловых рабочых.

## Вызваленчая барацьба

Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Нацыянальныя рухі ў краінах Еўропы ў другой палове XIX ст. Прычыны паўстання. Плыні польскага нацыянальна-вызваленчага руху, “белыя” і “чырвоныя”, іх праграмы. Рэвалюцыйныя дэмакраты і шляхецкія рэвалюцыянеры. З. Серакоўскі, Л. Звяждоўскі, В. Урублеўскі, Ф. Ражанскі і інш. К. Каліноўскі, яго ідэйна-палітычныя пазіцыі і рэвалюцыйная дзейнасць. “Мужыцкая праўда”. Літоўскі правінцыяльны і Варшаўскі нацыянальны камітэты, іх узаемаадносіны. Пачатак паўстання. Праграмныя дакументы паўстання. Маніфест Часовага правінцыяльнага ўрада Літвы і Беларусі. Контррэвалюцыйны пераварот у Вільні. Пратэст К. Каліноўскага.

Рэакцыя на паўстанне ў Расіі. Партызанская тактыка паўстанцаў. Асаблівасці паўстання ў Заходняй і Усходняй Беларусі. «Мураўёўшчына» як праяўленне царска-дваранскай рэакцыі ў Беларусі. М.М. Мураўёў і яго дзейнасць у краі. Спад паўстанцкага руху. Вяртанне К. Каліноўскага да кіраўніцтва паўстаннем. Утварэнне “Літоўска-Беларускага чырвонага жонду”. Падаўленне паўстання. «Лісты з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскага. Вынікі і значэнне паўстання, яго характар.

Сялянскі і народніцкі рух. Сялянскі рух у Беларусі ў другой палове 60–90-х гг. XIX ст.: дынаміка, віды і формы барацьбы. Народніцтва ў Беларусі, вытокі і сутнасць. Першыя народніцкія гурткі ў пачатку 1870-х гг. і іх дзейнасць. Народніцкія гурткі другой паловы 1870-х гг. Спробы прапаганды сярод сялян і рабочых. Выхадцы з Беларусі ў народніцкіх арганізацыях Расіі: М. Судзілоўскі, С. Кавалік, Р. Ісаеў, І. Грынявіцкі, Г. Гельфман. Дзейнасць “Чорнага перадзелу” на тэрыторыі Беларусі. Пераход на пазіцыі “Народнай волі”. Народніцкія арганізацыі ў Беларусі ў першай палове 1880-х гг. Спробы аб’яднання. Група “Гоман” і яе погляды на развіццё Беларусі.



Репозиторий ВГУ

Ліберальныя народнікі. Народнікі Беларусі і нацыянальны рух. Адраджэнне рэвалюцыйнага народніцтва ў канцы 1890-х гг. «Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі».

Рабочы і сацыял-дэмакратычны рух. Рабочы і сацыялістычны рух у краінах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы ў другой палове XIX ст. Ідэалогія, арганізацыйны ўзровень, уплыў на грамадскае жыццё. Становішча, хваляванні і стачкі рабочых у Беларусі. Сацыяльнае аблічча ўдзельнікаў рабочага руху, іх патрабаванні. Эвалюцыя рабочага руху ў Беларусі ў 60–90-х гг. XIX ст.

Пачатак прапаганды марксізму. Першыя сацыял-дэмакратычныя гурткі і групы: Э. Абрамовіч, І. Гурвіч, В. Сяліцкі, С. Трусевіч. Польская сацыялістычная партыя.

Пераход сацыял-дэмакратаў да масавай агітацыі. “Віленская праграма”. А. Крэмер, Ю. Мартаў, Я. Спонці. Стачачныя касы. Мінская, Віцебская, Гродзенская, Брэсцкая і іншыя рабочыя арганізацыі. Утварэнне рабочых саюзаў. Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя. Утварэнне «Рабочага саюза Літвы» і Бунда, сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы. Польскі і яўрэйскі нацыянальны рух у Беларусі. Асаблівасці сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі. Уздым рабочага руху ў другой палове 1890-х гадоў. Асноўныя патрабаванні рабочых. Першыя палітычныя выступленні рабочых.

## Фарміраванне беларускай нацыі.
## Культура Беларусі ў 1860–1890 гг.

Гістарыяграфія пытання. Аналіз крыніц. Асноўныя прыкметы этнасу. Перадумовы ператварэння народнасці ў нацыю. Этнічнае вызначэнне паняцця “нацыя”. Гістарычныя ўмовы развіцця беларускай культуры ў другой палове XIX ст. і ўтварэнне беларускай нацыі. Палітыка царызму ў Беларусі па нацыянальным пытанні. Паланізацыя і русіфікацыя. Роля канфесійнага пытання. Этнічная тэрыторыя беларусаў, нацыянальны склад насельніцтва па губернях і паветах, асаблівасці саслоўнага і рэлігійнага складу, заняткаў беларускага, рускага, польскага, яўрэйскага і татарскага насельніцтва Беларусі, яго размяшчэнне ў гарадах і сельскай мясцовасці. Каланіяльная, русіфікатарская палітыка царызму на тэрыторыі Беларусі ў сацыяльна-эканамічным, палітычным і культурным жыцці. Абмежавальныя законы ў адносінах да польскага, каталіцкага і яўрэйскага насельніцтва Беларусі, і іх вынікі. Развіццё капіталістычнага рынку, ператварэнне рабочай сілы ў тавар. Паступовы распад саслоўнай структуры. Фарміраванне і нацыянальны склад пралетарыяту і буржуазіі. Слабасць эканамічных пазіцый



Репозиторий ВГУ

беларускай нацыянальнай буржуазіі як вызначальны фактар яе адносін да палітыкі царызму і беларускага нацыянальнага руху. Фарміраванне агульных нацыянальных прыкмет.

Этнічная і нацыянальная самасвядомасць. Станаўленне беларускай літаратурнай мовы. Развіццё мастацкай літаратуры. Творчасць Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, Я. Лучыны, К. Каганца і інш. Беларускае пытанне падчас паўстання 1863 г. Пазіцыя К. Каліноўскага. Тэарэтычныя распрацоўкі беларускага нацыянальнага пытання. Газета «Мінскі лісток». Студэнцкія арганізацыі ў Пецярбургу і Маскве. Брашура «Дзядзька Антон». Рост легальных публікацый на беларускай мове ў 1890-я гады. Асаблівасці нацыянальна-культурнага руху.

Асвета. Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Тыпы і колькасць школ. Афіцыйны друк. Прапаганда ідэалогіі «заходнерусізму». Беларускі фальклор. Быт і матэрыяльная культура, звычаі, абрады, нормы маралі народаў Беларусі. Этнаграфічныя і гістарычныя, моваэнаўчыя і краязнаўчыя даследаванні. Уклад беларусаў у даследаванне прыродазнаўчых навук: У. Дыбоўскі, М. Ястрэбскі, С. Кавалеўская, Г. Мінкоўскі, В. Ермакоў, А. і У. Кавалеўскія, А. Садоўскі, Я. Наркевіч-Ёдка, І. Яркоўскі, І. Дамейка, М. Судзілоўскі, Ю. Хадзько.

Музыка і тэатр. Градабудаўніцтва і архітэктура. Змяненне выгляду беларускіх гарадоў. Сядзібная архітэктура: панаванне эклектызму. Імітацыя старадаўніх феадальных рэзідэнцый. Канец сядзібнага будаўніцтва.

Жывапіс. Творчая дзейнасць вядомых мастакоў Расіі, Польшчы, Літвы, Украіны ў Беларусі. Іх уплыў на развіццё выяўленчага мастацтва. Вядучая роля гістарычнага жанру: К.Д. Альхімовіч – найбольш вядомы гістарычны жывапісец Беларусі. Развіццё бытавога жанру, краявіду і партрэта. Творчая дзейнасць Н.Ю. Сільвановіча, Д. Баркоўскага, В. Сляндзінскага, У. Дмахоўскага, Б. Русецкага, А. Ромера. А.Г. Гараўскі – найбольш яскравы прадстаўнік пейзажнага жывапісу другой паловы XIX ст. Творчасць яго брата І.П. Гараўскага. Уплыў прадстаўнікоў рускага перадвіжніцтва В. Пярова і І. Крамскога на творчасць беларускіх мастакоў.

Графіка. Падзеі паўстання 1863–1864 гг. у творчасці А. Андрыёлі, А. Гротгера. Ф. Дмахоўскі – аўтар малюнкаў-гербаў беларускіх гарадоў і літаграфічных партрэтаў беларуска-літоўскіх князёў. Адлюстраванне жыцця і побыту беларускіх сялян у творчасці А. Ромера і М.В. Мікешына. Шматнацыянальны характар культуры ў Беларусі.



Рэпазіторый ВДУ

## *Раздзел VIII.*
## БЕЛАРУСЬ У ПАЧАТКУ XX ст. (1901–1917 гг.)

### Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў пачатку XX ст.

Гістарыяграфія праблемы развіцця эканомікі Беларусі ў пачатку XX ст. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Феадальна-прыгонніцкія перажыткі. Эміграцыя. Перапляценне капіталістычных і прыгонніцкіх формаў эксплуатацыі. Сацыяльныя і нацыянальныя працэсы ў Беларусі да рэвалюцыі 1905–1907 гг. Сацыяльная структура насельніцтва. Эканамічная палітыка царызму ў Беларусі.

Развіццё прамысловасці. Эканамічны крызіс (1900–1903 гг.). Структура і характар прамысловасці ў пачатку XX ст. Пранікненне буйнога капіталу. Прамысловыя таварыствы і іх роля ва ўмацаванні цэнтралізацыі капіталу ў прамысловасці. Павелічэнне колькасці рабочага класу. Нацыянальны і сацыяльны склад рабочага класу Беларусі і яго становішча. Уздым рабочага і сялянскага руху.

### Рэвалюцыя 1905–1907 гг. у Беларусі

Гістарыяграфія пытання. Наспяванне рэвалюцыйнай сітуацыі. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцяў і нацыянальнага пытання. Уплыў эканамічнага крызісу. «Паліцэйскі сацыялізм». Яўрэйская незалежная рабочая партыя. Сіяніцкі рух у Беларусі. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Утварэнне інтэрнацыянальных арганізацый РСДРП у Беларусі. Арганізацыя партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў і Польскай партыі сацыялістычнай на Літве. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады. Яе праграма і дзейнасць у 1903–1904 гг. Уздым рабочага руху. Пераход рабочых да палітычнай барацьбы. Сялянскі рух.

Пачатак рэвалюцыі: рэвалюцыйны рух у студзені–верасні 1905 г. Студзеньскі рух салідарнасці рабочых Беларусі з рабочымі Пецярбурга. Вяснова-летні ўздым палітычных выступленняў і эканамічнай барацьбы рабочых. Уплыў рабочага руху на сялянства. Новыя формы сялянскага руху. Салдацкія выступленні. Адносіны палітычных партый, насельніцтва Беларусі да ўказа аб скліканні Булыгінскай думы.

Беларусь у перыяд найвышэйшага ўздыму рэвалюцыі. Кастрычніцкая палітычная стачка ў гарадах і мястэчках Беларусі. Вядучая роля чыгуначнікаў. Кааліцыйныя саветы і камітэты, іх партыйны склад, адрозненні ад Саветаў рабочых дэпутатаў. Маніфест 17 кастрычніка і рэпрэсіі царызму. Курлоўскі расстрэл у Мінску. Дыферэнцыяцыя грамадска-палітычных сіл. Аддзелы «Саюза рускага народа» і «Саюза 17 кастрычніка». Характар іх дзейнасці ў Беларусі.



Рэпазіторый ВГУ

Буржуазна-ліберальны рух і яго асаблівасці ў заходніх губернях. Змены ва ўмовах і характары дзейнасці дэмакратычных партый і прафесійных саюзаў. Уздым сялянскага і салдацкага руху. Снежаньская палітычная стачка ў Беларусі. Выступленні ў Гомелі, Баранавічах і іншых гарадах. Істотнае звужэнне рабочага руху ў параўнанні з кастрычнікам. Падтрымка агульнай палітычнай забастоўкі мясцовымі дэмакратычнымі партыямі, арганізацыямі і фактычная адмова іх ад ідэі ўзброенага паўстання. Падаўленне снежаньскіх выступленняў.

Адступленне рэвалюцыі. Дэпутаты Беларусі ў I і II Дзяржаўных думах. Новы выбарчы закон ад 11 снежня 1905 г. і адносіны да яго палітычных партый і арганізацый, рабочых і сялян. Прычыны правалу байкоту выбараў. Сацыяльна-класавы і партыйны склад дэпутатаў I Дзяржаўнай думы ад 5 заходніх губерняў, змены ў партыйна-палітычных пазіцыях у ходзе думскай барацьбы. Першаснае значэнне аграрнага пытання. Вяснова-летні (1906 г.) уздым рабочага, сялянскага і салдацкага руху. Адносіны кадэтаў і левых, дэмакратычных партый і плыняў да роспуску I Дзяржаўнай думы. Змены ў дынаміцы і характары рабочага руху ў другой палове 1906 г. Дзейнасць прафсаюзаў. Выбары ў II Дзяржаўную думу. Змены ў тактыцы левых партый. Левы блок. «Русский окраинный союз» і яго перадвыбарныя лозунгі. Перамога на выбарах у II Дзяржаўную думу ў 5 заходніх губернях рускіх і польскіх шавіністычна-клерыкальных груповак. Рэвалюцыйны ўздым вясною 1907 г., яго адносная слабасць.

Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. Роля Беларускай сацыялістычнай грамады ў развіцці беларускага нацыянальнага руху. Дзейнасць БСГ, яе лозунгі і патрабаванні ў 1905 г. II з’езд БСГ. Змены ў праграме руху. Рашэнні чэрвеньскай (1906 г.) канферэнцыі БСГ. Рэвалюцыйна-дэмакратычны характар газеты «Наша доля». Сацыяльна-эканамічная, палітычная і нацыянальная праграма газеты «Наша доля» (снежань 1906 г.). Пазіцыі «Нашай нівы» падчас выбараў у II Дзяржаўную думу. Агульная характарыстыка дзейнасці БСГ у перыяд рэвалюцыі. Сацыялістычная Партыя Беларусі.

### Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Сталыпінскія рэформы

Развіццё прамысловасці. Прамысловы ўздым. Рост акцыянернага капіталу і далейшая спецыялізацыя прамысловасці, развіццё профільных галін: дрэваапрацоўчай, кардонна-папяровай, запалкавай, лесахімічнай, шкляной, тэкстыльнай, гарбарна-абутковай вытворчасці, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Асаблівасці прамысловасці Беларусі: высокая ўдзельная вага дробнакапіталістычнай і рамесна-саматужнай вытворчасці,



Рэпазіторый ВДУ

пераважнае размяшчэнне прадпрыемстваў фабрычна-завадскога і мануфактурнага тыпаў у сельскай мясцовасці, адсутнасць буйных прамысловых цэнтраў і інш. Прычыны гэтых асаблівасцяў.

Аграрная рэформа і развіццё сельскай гаспадаркі. Дваранскае і надзельнае сялянскае землеўладанне як аснова феадальна-прыгонніцкіх перажыткаў і тормаз прагрэсіўнага развіцця краіны. Мэты сталыпінскай аграрнай рэформы. Разбурэнне сялянскай абшчыны, насаджэнне хутароў. Прапаганда хутарской гаспадаркі. Узмацненне агранамічнага, заатэхнічнага, ветэрынарнага, тэхнічнага абслугоўвання вёскі. Арганізацыя перасялення сялян у азіяцкую Расію. Вынікі і значэнне рэформы. Далейшая спецыялізацыя сельскай гаспадаркі і рост вытворчасці. Прамысловая перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі. Развіццё гандлёва-рынычных адносін у сельскай гаспадарцы. Узмацненне сацыяльна-класавай дыферэнцыяцыі сялянства.

Грамадскі рух у перыяд наступлення рэакцыі. Увядзенне земстваў. Выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. і яго асаблівасці ў Беларусі. Трэцячэрвеньская палітычная сістэма. Рэзкае аслабленне рэвалюцыйных партый. Спецыфіка ліберальнага руху ў Беларусі. Палітычныя пазіцыі ўрадавых партый і арганізацый. Змены ў дынаміцы і характары рабочага руху. Лакаўты. Прыкметы ажыўлення барацьбы рабочых у 1911–1913 гг. Асаблівасці рабочага руху на тэрыторыі Беларусі ў гэты перыяд. Дынаміка сялянскага руху. Нарастанне другой сацыяльнай вайны ў вёсцы. Прычыны і мэты земскай рэформы ў заходніх губернях. Яе асаблівасці. Земскі законапраект у Дзяржаўнай думе і Дзяржаўным савеце. Значэнне ўвядзення выбарных земстваў у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях.

Грамадска-палітычны рух падчас выбараў у IV Думу. Дэпутаты ад заходніх губерняў у Думе. Утварэнне Прагрэсіўнага блока. Беларускі нацыянальны вызваленчы рух у 1907–1914 гг. Гуртаванне беларускіх нацыянальных дзеячаў вакол «Нашай нівы».

**Першая сусветная вайна на тэрыторыі Беларусі (1914–1917 гг.)**

Пачатак вайны. Увядзенне ваеннага становішча ў беларускіх губернях. Мабілізацыйныя мерапрыемствы. Адносіны да вайны розных слаёў насельніцтва, палітычных і грамадскіх арганізацый, газеты «Наша Ніва».

Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1915–1916 гг. Захоп немцамі Заходняй Беларусі. Нямецкі акупацыйны рэжым. Беларускія землі ў складзе Обэр Оста. Палітыка нямецкай адміністрацыі ў адносінах да беларусаў. Дзейнасць «Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны» на тэрыторыі, акупаванай немцамі. Беларускае



Рэпазіторый ВДУ

школьніцтва, культурна-асветніцкая справа ва ўмовах нямецкай акупацыі ў 1915–1917 гг. Беларускі народны камітэт і Цэнтральны саюз беларускіх нацыянальных грамадскіх арганізацый. Стварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай групы. Заснаванне «Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага».

Становішча на беларускіх землях у складзе Расійскай дзяржавы падчас першай сусветнай вайны. Умовы існавання насельніцтва. Ваенныя павіннасці. Мілітарызацыя прамысловасці і транспарту. Заняпад сельскай гаспадаркі. Харчовы крызіс. Змены ў складзе насельніцтва. Размяшчэнне войскаў і органаў іх кіравання. Бежанства ў Беларусі. Колькасць і склад бежанцаў, умовы іх існавання. Палітыка ўлад у адносінах да бежанцаў. Асноўныя накірункі бежанства з Беларусі, месца іх канцэнтрацыі ў Расіі і грамадскія арганізацыі бежанцаў. Стварэнне «камітэтаў дапамогі ахвярам вайны» і іх дзейнасць.

Узмацненне сацыяльнай напружанасці ў 1915–1916 гг. Спецыфіка рабочага руху ў прыфрантавых умовах. Узмацненне антыпамешчыцкага, антываеннага руху сярод беларускага сялянства. Выступленні мабілізаваных запасных. Паўстанне салдат на Гомельскім размеркавальным пункце. Пачатак разлажэння арміі, рост дэзерцірства. Адносіны насельніцтва з арміяй.

Гістарыяграфія становішча Беларусі ў 1914–1916 гг. Стан вывучэння асноўных праблем: акупацыйнага рэжыму, эканамічнага становішча, бежанства, рабоча-сялянскага руху.

## Беларусь пасля падзення самадзяржаўя (сакавік–кастрычнік 1917 г.)

Крыніцы вывучэння падзей 1917 г. у Беларусі. Гістарыяграфія становішча ў грамадстве, палітычнага жыцця, рэвалюцыйных падзей, беларускага нацыянальнага руху. Савецкая і замежная гістарыяграфія аб магчымасці альтэрнатыўных шляхоў у развіцці палітычнай сітуацыі пасля падзення самаўладдзя.

Асаблівасці эканамічнага, ваеннага і палітычнага становішча ў Беларусі ў пачатку 1917 г. Лютаўская рэвалюцыя ў Беларусі. Змены органаў улады. Стварэнне Часовых грамадскіх камітэтаў парадку, назначэнне камісараў Часовага ўрада, выбары валасных, гарадскіх і павятовых камітэтаў. Утварэнне Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў у Беларусі. Іх адносіны з Петраградскім Саветам, мясцовымі органамі ўлады. Стварэнне салдацкіх камітэтаў у войсках Заходняга фронту і іх уплыў на становішча ў Беларусі. Першы з’езд ваенных і рабочых дэпутатаў арміі і тылу Заходняга фронту і яго адносіны да пытання аб вайне, да палітыкі Часовага ўрада. Стварэнне сялянскіх камітэтаў. Адносіны беларускіх сялян да рэвалюцыйных



Репозиторий ВГУ

падзей. З’езды сялянскіх дэпутатаў, адносіны да ваеннага і аграрнага пытанняў. Арганізацыя прафесійных саюзаў рабочых і служачых.

Уздым грамадска-палітычнай актыўнасці насельніцтва Беларусі. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі пасля падзення самаўладдзя. Уплыў агульнарасійскіх палітычных партый, іх групоўкі ў Беларусі. Пазіцыі асноўных партый (кадэтаў, акцябрыстаў, сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў-рэвалюцыянераў) па аграрным і нацыянальным пытаннях.

**Беларускі нацыянальны рух пасля падзення самаўладдзя**

Аднаўленне дзейнасці БСГ, яе арганізацый у гарадах Беларусі, Расіі, у арміі і на флоце. Канферэнцыя ў сакавіку 1917 г. Адносіны БСГ да Часовага ўрада, аўтаноміі Беларусі. Канферэнцыя БСГ у чэрвені 1917 г., абмеркаванне праекта новай праграмы БСГ, абранне часовага ЦК БСГ.

Узнікненне і афармленне новых беларускіх партый і арганізацый. Беларуская партыя народных сацыялістаў, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларускі саюз землеўладальнікаў, Беларускі саюз праваслаўнага духавенства, Беларуская партыя аўтанамістаў, Віцебскі саюз беларускага народа, Магілёўскі беларускі нацыянальны камітэт, Гомельскі саюз беларускай дэмакратыі і інш.

З’езд прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 сакавіка 1917 г. Прадстаўніцтва на з’ездзе. Рашэнні з’езда па пытаннях аўтаноміі Беларусі, вызначэння яе тэрыторыі, арганізацыі культурна-асветніцкай працы. Утварэнне Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК), яго склад і дзейнасць. Адносіны Часовага ўрада да набыцця Беларуссю аўтаноміі.

З’езд прадстаўнікоў беларускіх партыйных і грамадскіх арганізацый 8–10 ліпеня 1917 г. Умовы склікання з’езда, супярэчнасці паміж дэлегатамі. Ацэнка дзейнасці БНК, стану беларускіх нацыянальных арганізацый. Барацьба БСГ за лідэрства сярод беларускіх арганізацый. Вынікі работы секцый з’езда, асноўныя яго рашэнні. Абранне Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый (ЦРБА).

Дзейнасць ЦРБА. Зацвярджэнне яе Статута. Пашырэнне складу Рады. Прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху на Дзяржаўнай нарадзе ў Маскве (жнівень 1917 г.) і на Дэмакратычнай нарадзе ў Петраградзе (верасень 1917 г.). Адносіны да ідэі беларускай дзяржаўнасці. ІІІ з’езд Беларускай сацыялістычнай Грамады. Прыняцце новай праграмы БСГ. ІІ сесія ЦРБА, пераўтварэнне яе ў Вялікую Беларускую Раду (ВБР). Заснаванне Цэнтральнай беларускай вайсковай Рады (ЦБВР). Пашырэнне беларускага нацыянальнага руху ў войску. Спробы стварэння беларускіх вайсковых фарміраванняў. Актывізацыя мясцовых беларускіх нацыянальных арганізацый,

Рэпазіторый ВДУ

правядзенне з’ездаў. Газета «Вольная Беларусь». Стварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, яе платформа. Беларускі абласны камітэт пры ўсерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў (БАК).

## Культура Беларусі ў пачатку ХХ стагоддзя

Узмацненне шавінізму ў палітыцы царызму, барацьба з беларускім адраджэннем. Ідэалогія і практыка «заходнерусізму». Барацьба польскіх нацыяналістычных груповак з беларускім нацыянальным рухам. Польскі нацыянальны рух у заходніх губернях. Газета «Наша ніва» – цэнтр адраджэнцкага руху. Барацьба за адраджэнне і развіццё нацыянальнай мовы. Роля «Нашай нівы» ў развіцці нацыянальнай літаратуры, друку, фарміраванні нацыянальнай беларускай інтэлігенцыі.

Праблемы развіцця беларускай нацыянальнай культуры ва ўмовах нямецкай акупацыі Беларусі, пасля падзення самаўладдзя. Нацыянальна-культурныя пытанні ў дзейнасці БНК, ЦРБА, у першых мерапрыемствах савецкай улады на тэрыторыі Беларусі. Культурна-асветніцкая дзейнасць БНР.

Адукацыя. Школьная справа ў Беларусі на пачатку ХХ ст. Пашырэнне сеткі пачатковых школ. Паступовая замена праваслаўна-царкоўных школ «міністэрскімі» народнымі вучылішчамі. Рост колькасці агульнаадукацыйных школ, настаўніцкіх інстытутаў і семінарый.

Прафесійна-тэхнічнае навучанне. Неадпаведнасць школьнай сістэмы патрабаванням жыцця. Асветніцкая справа пасля лютаўскай рэвалюцыі ў дзейнасці БНК, ЦРБА, падчас існавання БНР. Стварэнне беларускай нацыянальнай школы. Арганізацыя падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў. Мінскі настаўніцкі інстытут. Настаўніцкія курсы і семінарыі. Стварэнне падручнікаў для нацыянальнай школы. Навуковыя даследаванні мовы, этнаграфіі і гісторыі Беларусі. Я. Карскі, М. Федароўскі, Е. Раманаў, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі, Я. Лёсік. Навуковая дзейнасць Таварыства мінскіх урачоў. Беняконьская сельскагаспадарчая і Мінская балотная даследчыя станцыі.

Якасныя зрухі ў развіцці беларускай мастацкай літаратуры, нацыянальнай драматургіі, літаратурнай крытыкі і публіцыстыкі. Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, Цётка, К. Каганец, Ц. Гартны, З. Бядуля, М. Гарэцкі. Асаблівасці бсларускай літаратуры нашаніўскага перыяду. Развіццё перыядычнага друку і кнігадрукавання. Беларускія газеты «Дзяньніца», «Вольная Беларусь», «Гоман», «Грамада» і інш. Беларускія выдавецтвы «Загляне сонца ў наша ваконца», «Наша ніва», «Саха», «Наша хата», «Беларус».

Репозиторий ВГУ

Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. «Беларускія вечарынкі», першая беларуская трупа І. Буйніцкага. «Беларускі музычна-драматычны гурток», Беларускі тэатр Ф. Аляхновіча ў Вільні, Беларускі дзяржаўны тэатр БНР. П'есы У. Галубка, К. Каганца, Я. Купалы, Ф. Аляхновіча, А. Бурбіса, Я. Коласа, М. Чарота. Роля Л. Рагоўскага, А. Грыневіча, М. Чуркіна, У. Тэраўскага, І. Шадурскага ў развіцці і папулярызацыі беларускай народнай музыкі і песні. Культурна-асветніцкія таварыствы і драматычныя гурткі ў гарадах і мястэчках Беларусі. Хор пад кіраўніцтвам У. Тэраўскага.

Градабудаўніцтва і архітэктура. Знешняе аблічча беларускіх гарадоў і мястэчак. Архітэктура культавых збудаванняў. Узнаўленне і ўзаемаўплыў розных стыляў: готыкі, раманскага, «рускага». Драўлянае дойлідства.

Жывапіс. Пераважнае развіццё жанру краявіду. Ф. Рушчыц, Г. Вейсенгоф, С. Жукоўскі, К. Стаброўскі, В. Бялыніцкі-Біруля. Развіццё бытавога жанру. Уклад у яго развіццё Ю. Пэна. Партрэты работы Я. Кругера, Л. Альпяровіча. Разнастайнасць і супярэчлівасць выяўленчага мастацтва ў рэвалюцыйны час. М. Шагал, К. Малевіч, Л. Лісіцкі, М. Філіповіч.

Графіка. Творчасць А. Каменскага, Ю. Фалата, К. Мардусевіча. Мастацкія пошукі Я. Драздовіча. Пластыка і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Шматнацыянальны характар культуры Беларусі. Адносіны беларускай інтэлігенцыі да нацыянальна-вызваленчага руху, рэвалюцыйных падзей, усталявання Савецкай улады, абвяшчэння БНР.

## *Раздзел IX.*
## БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ РЭВАЛЮЦЫІ, ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ І ВАЕННАЙ ІНТЭРВЕНЦЫІ (1917–1920 гг.)

### Усталяванне савецкай улады ў Беларусі

Уплыў Першай сусветнай вайны на сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча краін Усходняй Еўропы. Абвастрэнне класавай барацьбы. Рэвалюцыя ў Расіі і яе распаўсюджанне на Беларусь.

Кастрычніцкія падзеі ў Петраградзе і іх водгук на тэтыторыі Беларусі. Айчынная і замежная гістарыяграфія кастрычніцкіх падзей і ўстанаўленне савецкай улады ў Беларусі.

Стварэнне Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК) Заходняй вобласці і фронту. Яго склад і дзейнасць. Ліквідацыя органаў Часовага ўраду і арганізацыя савецкай улады на месцах. Барацьба за



Репозиторий ВГУ

ўсталяванне савецкай улады ў Мінску. Мінскі савет. Камітэт выратавання рэвалюцыі: яго склад, адносіны да бальшавіцкага перавароту. Дапамога Заходняга фронта ва ўсталяванні савецкай улады ў Мінску. Усталяванне савецкай улады ў Віцебску, Гомелі, Магілёве, Оршы і іншых гарадах Беларусі. Адносіны насельніцтва Беларусі да ўсталявання савецкай улады. Пазіцыя беларускіх нацыянальных партый да ўсталявання савецкай улады. «Грамата да беларускага народа» Вялікай Беларускай Рады. Вынікі выбараў ва ўсерасійскі Устаноўчы сход на заходнім фронце і ў беларускіх губернях.

Умацаванне савецкай улады ў Беларусі. Перавыбары мясцовых саветаў, умацаванне пазіцыі бальшавікоў. Рашэнні з'езда Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, III з'езда сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў. II з'езда армій Заходняга фронта. Утварэнне Аблвыканкамзаха, стварэнне СНК Заходняй вобласці, савецкіх органаў кіравання на месцах. Дзейнасць Паўночна-Заходняга камітэта бальшавіцкай партыі. А. Мяснікоў, В. Кнорын, К. Ландэр, М. Рагазінскі, М. Калмановіч, І. Алібегаў і іншыя дзеячы бальшавіцкай партыі і савецкай улады ў Беларусі.

Першыя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя пераўтварэнні савецкай улады. Асаблівасці ажыццяўлення ў Беларусі рабочага кантролю, нацыяналізацыі прамысловасці, бальшавіцкага кантролю за дзейнасцю дзяржаўных органаў. Байкот мерапрыемстваў савецкай улады і барацьба з імі ВРК. Узаемаадносіны новай улады з сялянствам, першыя крокі па ажыццяўленні «Асноўнага закону аб сацыялізацыі зямлі» ў Беларусі. Спробы вырашэння сацыяльных праблем. Ажыццяўленне Дэкрэта аб міры на Заходнім фронце.

Адносіны савецкай улады да нацыянальнага пытання і нацыянальнага руху ў Беларусі. Роля ВБР і БАК у падрыхтоўцы ўсебеларускага з'езда. Пазіцыя органаў савецкай улады да склікання ўсебеларускага з'езда. Адкрыццё ўсебеларускага з'езда (кангрэса) ў снежні 1917 г. Склад яго ўдзельнікаў, вызначэнне парадку дня, асноўных поглядаў на лёс Беларусі. Адносіны ўсебеларускага з'езда да ўлады Саветаў, мясцовых органаў савецкай улады. Разгон Усебеларускага кангрэса. Утварэнне Выканкама ўсебеларускага з'езда. Водгукі на разгон з'езда.

**Мяцеж польскага корпуса Доўбар-Муснікага**

Палітычныя мэты мяцяжу, яго тэрыторыя. Адносіны беларускага насельніцтва да польскіх легіянераў. Партызанская барацьба. Мерапрыемствы савецкай улады па падаўленні мяцяжу. Роспуск Саюза зямельных уласнікаў, Беларускай вайсковай Рады. Ваенныя дзеянні супраць корпуса Доўбар-Мусніцкага. Сувязь польскіх легіянераў з нямецкімі войскамі.



Репозиторий ВГУ

## Ваенная інтэрвенцыя Германіі

Наступленне нямецкіх войскаў у пачатку 1918 г. Захоп новых тэрыторый Беларусі. Спробы савецкай улады арганізаваць супраціўленне нямецкаму наступу. Вынікі Брэсцкага міру для Беларусі. Нямецкі акупацыйны рэжым на захопленай тэрыторыі Беларусі, адносіны да яго насельніцтва. Партызанская і падпольная барацьба супраць нямецкіх акупантаў у 1918 г. Супрацоўніцтва часткі палітычных партый і арганізацый з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі. Заканчэнне Першай сусветнай вайны. Скасаванне Брэсцкага дагавору. Наступленне Чырвонай Арміі, вызваленне тэрыторыі Беларусі ад нямецкіх войскаў. Беларускае пытанне падчас афармлення Версальскай сістэмы.

## Беларуская народная Рэспубліка

Утварэнне беларускай дзяржаўнасці падчас нямецкай акупацыі. Прыняцце Выканкамам Усебеларускага з'езда Першай Устаўнай граматы. Стварэнне Народнага Сакратарыята на чале з І. Варонкам. Другая Устаўная грамата, яе змест. Абвяшчэнне Беларускай народнай Рэспублікі (БНР). Рада БНР, яе склад і дзейнасць. Трэцяя Устаўная грамата, абвяшчэнне незалежнасці БНР. Адносіны БНР і германскіх улад. Утварэнне Беларускага народнага прадстаўніцтва (БНП). Палітычны крызіс БНР. Раскол у БСГ. Утварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (БСДП), Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў (БПСФ), Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Пазіцыі беларускіх нацыянальных партый па сацыяльна-эканамічных, аграрных і нацыянальных пытаннях. Барацьба за міжнароднае прызнанне БНР, адносіны да яе насельніцтва Беларусі, акупацыйных нямецкіх і савецкіх улад. Вядомыя грамадска-палітычныя дзеячы беларускага адраджэнцкага руху: Т. Грыб, І. Варонка, В. Ластоўскі, Я. Лёсік, А. Луцкевіч, І. Сярада, А. Смоліч, А. Цвікевіч і інш. Сучасная гістарыяграфія па праблемах утварэння БНР. Гістарычнае месца БНР у працэсе стварэння беларускай дзяржаўнасці.

## Утварэнне БССР

Савецкая і замежная гістарыяграфія ўтварэння БССР і стварэння КП(б)Б. Палітычныя перадумовы стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці. Роля Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама) пры Наркамаце па справах нацыянальнасцяў РСФСР і беларускіх секцый у РКП(б). Пазіцыя па беларускім пытанні Аблвыканкамзаха і Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б).

Супярэчнасці працэсу станаўлення беларускай савецкай дзяржаўнасці. Прыняцце вышэйшымі партыйнымі органамі рашэння



Рэпазіторый ВДУ

аб стварэнні БССР. VI абласная канферэнцыя бальшавіцкай партыі. Абвяшчэнне БССР. Утварэнне КП(б) Беларусі. Стварэнне Часовага рабоча-сялянскага ўрада БССР. Супярэчнасці яго складу. Роля З. Жылуновіча, А. Чарвякова, Я. Дыла, Ф. Шантыра, А. Мяснікова, Т. Калмановіча і іншых у стварэнні БССР. Вызначэнне тэрыторыі БССР. Уключэнне Віцебскай і Магілёўскай губерняў у склад РСФСР. Крызіс ва ўрадзе БССР. I з’езд Саветаў БССР, яго рашэнні. Першая Канстытуцыя БССР. Прыняцце рашэння аб стварэнні Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел). Палітычныя мэты аб'яднання. Урад ЛітБела, спробы арганізацыі абароны ад польскага наступу. Скасаванне Літоўска-Беларускай ССР.

Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні на савецкай частцы тэрыторыі Беларусі ў 1918–1920 гг. Другі і Трэці з’езды Саветаў Заходняй вобласці і іх рашэнні. Палітыка «ваеннага камунізму» і асаблівасці яе ажыццяўлення.

Нацыяналізацыя прамысловасці, умовы працы прадпрыемстваў, сістэма іх кіравання. Эканамічныя цяжкасці жыцця гарадскога насельніцтва. Пачатак вырашэння аграрнага пытання, надзяленне сялян зямлёй. Стварэнне саўгасаў, камун, калектыўных гаспадарак. Паскарэнне тэмпаў сацыялістычных пераўтварэнняў на вёсцы. Харчразвёрстка, яе эканамічныя і сацыяльныя вынікі. Камбеды ў Беларусі. Абвастрэнне класавай барацьбы ў вёсцы. Сялянскія хваляванні і антысавецкія выступленні, выкліканыя харчразвёрсткай, мабілізацыямі ў Чырвоную Армію. Падаўленне антысавецкіх выступленняў, кантрыбуцыі. Мяцеж Стракапытава ў Гомелі.

## Польска-савецкая вайна на тэрыторыі Беларусі

Наступленне польскіх войскаў, акупацыя тэрыторыі Беларусі. Акупацыйны рэжым польскіх улад, яго палітычныя мэты. А. Луцкевіч аб польскай акупацыі ў Беларусі. Беларускі нацыянальны рух ва ўмовах польскай акупацыі. Спробы аднавіць уладу БНР. Палітыка польскага кіраўніцтва ў дачыненні да БНР, беларускага нацыянальнага руху. Новая Рада і ўрад В. Ластоўскага. Найвышэйшая Рада і яе пазіцыя, Часовы беларускі ўрад. Раскол у беларускім грамадска-палітычным руху па пытаннях рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці. Беларускія эсэры аб «трэцім шляху» для Беларусі. Арганізацыя «Маладая Беларусь». Стварэнне Беларускай камуністычнай арганізацыі. (У. Ігнатоўскі, І. Каранеўскі, С. Булат і інш.)

Супраціўленне беларускага народа польскім акупантам. Партызанская барацьба і падпольныя арганізацыі. Супрацоўніцтва беларускіх эсэраў і камуністычных арганізацый у барацьбе супраць польскіх акупантаў. Беларускі паўстанчы камітэт і падрыхтоўка паўстання. Народная ваенная самаахова (НВС).

Репозиторий ВГУ

Наступленне Чырвонай Арміі летам і восенню 1920 г. Контрнаступленне польскіх войскаў. Аднаўленне савецкай улады на вызваленай ад палякаў тзрыторыі. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Беларусі. Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ). Канфрантацыя паміж КП(б)Б і беларускімі эсэрамі па пытаннях тэрыторыі ССРБ, прынцыпах фарміравання ўлады. Пераход беларускіх эсэраў у палітычную апазіцыю бальшавікам. Першыя палітычныя рэпрэсіі бальшавіцкай партыі супраць беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый.

Слуцкае паўстанне. З’езд і Рада Случчыны. Фарміраванне вайсковых адзінак. Супраціўленне ўсталяванню савецкай улады, прыходу Чырвонай Арміі. Заканчэнне слуцкага паўстання, лёс яго ўдзельнікаў. Сўчасная гістарыяграфія падзей на Случчыне ў лістападзе–снежні 1920 г., сэнс і значэнне слуцкага паўстання. Барацьба супраць савецкай улады атрадаў С. Булак-Балаховіча. Ліквідацыя фарміраванняў С. Булак-Балаховіча, іншых антысавецкіх выступленняў.

Аднаўленне органаў савецкай улады на Беларусі. II Усебеларускі з’езд Саветаў і яго рашэнні.

Заканчэнне савецка-польскай вайны на тэрыторыі Беларусі. Няўдачы Чырвонай Арміі на завяршальным этапе вайны. Прэлімінарныя ўмовы міру. Рыжскія перагаворы і праблемы ўдзелу ў іх прадстаўнікоў Беларусі. А.Чарвякоў аб савецка-польскіх перагаворах у Рызе. Адносіны кіраўніцтва БНР да рыжскіх перагавораў. Рыжскі мірны дагавор. Умовы міру. Падзел тэрыторыі Беларусі. Вынікі Рыжскага міру для Беларусі. Сучасная гістарыяграфія Рыжскага міру і яго наступстваў для Беларусі.

## *Раздзел X.*
## САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ У (1921–1939 гг.)

### Новая эканамічная палітыка (НЭП) у Беларусі

Эканамічнае і палітычнае становішча пасля заканчэння вайны, на пачатку 1920-х гадоў. Крызіс палітыкі «ваеннага камунізму». Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці. Антысавецкая барацьба ў памежных з Польшчай раёнах: «Зялёны Дуб», партызанскія атрады, рэйды С. Булак-Балаховіча. Падрыхтоўка антыбальшавіцкага і антыпольскага паўстання. Увядзенне ваеннага становішча ў Беларусі. Падаўленне антысавецкіх выступленняў.

Тэрыторыя і насельніцтва БССР у пачатку 1920-х гадоў. Нацыянальны склад насельніцтва. Міграцыя насельніцтва, эвакуацыя і рээвакуацыя. Нелегальныя гандлёвыя зносіны, кантрабанда. Абмежаванасць эканамічных магчымасцяў савецкай улады, матэрыяльных рзсурсаў. Пошукі шляхоў выхаду з крызісу.

Рэпазіторый ВГУ

Увядзенне новай эканамічнай палітыкі: яе мэта і сутнасць, пазіцыя бальшавіцкай партыі. Асаблівасці НЭПа ў Беларусі. Роля мясцовых дзяржаўных, партыйных і гаспадарчых органаў у распрацоўцы мерапрыемстваў НЭПа.

## Прамысловасць Беларусі ў 1920-я гады

Стан прамысловасці БССР пасля пераходу да мірных умоў развіцця. Вынікі разбурэння падчас вайны, палітыкі «ваеннага камунізму». Змены ў арганізацыі кіравання прамысловымі прадпрыемствамі, ва ўмовах іх дзейнасці пры пераходзе да НЭПа. Ліквідацыя глаўкаў і стварэнне трэстаў, сіндыкатаў. Найбольш буйныя трэсты ў Беларусі. Перавод прамысловасці на гаспадарчы разлік. Цяжкасці пры пераходзе ад камандна-адміністрацыйнай сістэмы да рынкавых адносін у прамысловасці. Беспрацоўе, недахоп кваліфікаваных кадраў, умовы існавання рабочага класа. Арэнда прамысловых прадпрыемстваў. Памеры, тэрміны і ўмовы арэнды. Склад прамысловасці Беларусі. Месца дробнай і саматужна-рамесніцкай прамысловасці. Асноўныя галіны прамысловасці Беларусі. Рост колькасці прамысловых прадпрыемстваў, занятых рабочых і выпрацоўкі прадукцыі на працягу 1921–1927 гг. Стан тэхнічнай базы прамысловасці. Галоўныя вынікі аднаўленчага перыяду ў прамысловасці. Крызісныя з’явы ў прамысловасці (крызіс збыту, таварны голад і інш.) у часы НЭПа.

## Сельская гаспадарка Беларусі ў 1920-я гады

Становішча ў сельскай гаспадарцы Беларусі на пачатку 20-х гадоў XX ст. Скарачэнні пасяўных плошчаў, колькасці жывёлы ў сялянскіх гаспадарках. Вынікі палітыкі «ваеннага камунізму». Пераход да новай эканамічнай палітыкі. Замена харчразвёрсткі харчовым падаткам. Памеры харчовага падатку. Працяг размеркавання зямлі.

Вырашэнне аграрнага пытання. Стан сялянскіх гаспадарак, яго змяненні на працягу першай паловы 20-х гадоў. Землеўпарадкаванне. Дэкрэт аб вольным выбары формаў землекарыстання. З. Прышчэпаў і яго дзейнасць. Сялянскі банк. Мерапрыемствы па ліквідацыі аграрнага перанасялення і зямельнага “голаду”. Хутары ў Беларусі. Дзяржаўная падтрымка хутарской сістэмы. Закон аб “арэндзе зямлі”. Дазвол найму рабочай сілы. Распаўсюджванне арэнды зямлі і найму рабочай сілы ў беларускай вёсцы, Рост крэдытнай спажывецкай кааперацыі. Калектыўнае землекарыстанне. Вынікі НЭПа ў сельскай гаспадарцы. Узровень яе развіцця напрыканцы 1920-х гадоў. Змяншэнне таварнасці сялянскіх гаспадарак. Згортванне НЭПа, яго вынікі і ўрокі.



Репозиторий ВГУ

## Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў 1921–1927 гг.

Пагадненні БССР з РСФСР і іншымі рэспублікамі. Удзел БССР у стварэнні СССР. IV Усебеларускі з'езд Саветаў. Падпісанне Дагавору аб стварэнні СССР. Статус БССР у складзе СССР. Фарміраванне тэрыторыі БССР. Вяртанне ўсходніх беларускіх тэрыторый у склад рэспублікі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа. Змены ў раяніраванні тэрыторыі Беларусі. Стварэнне акруг, раёнаў і сельсаветаў, іх колькасць. Нацыянальныя раёны і Саветы ў Беларусі. Канстытуцыя БССР 1927 г.

## Грамадска-палітычнае жыццё ў 1920-я гады

Асноўныя тэндэнцыі ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі. Сістэма савецкай улады. Актывізацыя дзейнасці Саветаў у пачатку 1920-х гадоў. Пашырэнне іх складу і паўнамоцтваў. Стварэнне секцый пры мясцовых Саветах. Склад дэпутатаў Саветаў у Беларусі. Рабочыя нарады. Праявы дэмакратызму ў дзейнасці грамадска-палітычных арганізацый у першай палове 20-х гадоў XX ст. Прафесійныя саюзы Беларусі: павелічэнне колькасці членаў, асноўныя функцыі. Утварэнне камсамола ў Беларусі, яго адносіны з іншымі маладзёжнымі арганізацыямі. Кампартыя Беларусі ў 20-я гады. Рост колькасці КП(б)Б, культурна-адукацыйны ўзровень, сацыяльны і нацыянальны склад яе членаў. Роля кампартыі ў жыцці беларускага грамадства, імкненне да манапалізму ў палітычным жыцці. Амністыя 1923 г. і яе ўплыў на рост даверу да саведкай улады. Самароспуск партыі беларускіх эсэраў. Утварэнне аднапартыйнай сістэмы. Канстытуцыя БССР 1927 г.

Нацыянальная палітыка ў 20-я гады. Нацыянальны склад насельніцтва БССР. Пэўныя адрозненні паміж горадам і вёскай. Неабходнасць стварэння ўмоў для адраджэння карэннай беларускай нацыі. Праблемы нацыянальных меншасцяў у Беларусі. Улік інтарэсаў і ўмоў культурнага развіцця нацыянальных меншасцяў.

Палітыка беларусізацыі. Тэарэтычная распрацоўка неабходнасці і зместу палітыкі беларусізацыі. Роля беларускіх нацыянальна-дэмакратычных дзеячаў у наданні беларусізацыі статуса нацыянальнай палітыкі. Роля КП(б)Б у стварэнні ўмоў і арганізацыйным забеспячэнні правядзення палітыкі беларусізацыі. Разгляд пытанняў нацыянальнай палітыкі на з'ездах і пленумах ЦК Кампартыі Беларусі. Першая фаза ў працэсе беларусізацыі: палітычная падрыхтоўка, тлумачэнне сэнса і зместу беларусізацыі, Стварэнне камісіі А. Хацкевіча і мясцовых камісій.

Палітыка беларусізацыі ў дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. Перавод на беларускую мову справаводства ў дзяржаўных установах. Тэрміны і умовы пераводу ў наркаматах,



Репозиторий ВГУ

дзяржаўным апараце, Саветах, партыйных камітэтах. Палітыка карэнізацыі дзяржаўнага апарату, складу Саветаў, вылучэння кадраў мясцовай нацыянальнасці. Праявы палітыкі беларусізацыі ў войску. Ваенная рэформа. Стварэнне нацыянальных тэрытарыяльных часцей і злучэнняў. Падрыхтоўка камандных кадраў. Беларусізацыя ва ўнутраным жыцці войска.

Супярэчнасці і цяжкасці ў правядзенні палітыкі беларусізацыі. Супрацьдзеянні палітыцы беларусізацыі з боку прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў, часткі дзяржаўнага і партыйнага апарату. Неабгрунтаванае фарсіраванне тэмпаў беларусізацыі, адсутнасць дастатковых матэрыяльных сродкаў і ўмоў для авалодання беларускай мовай. Змены палітыкі Кампартыі ў адносінах да беларусізацыі ў канцы 20-х гадоў. Прычыны згортвання палітыкі беларусізацыі, выкараненне яе здабыткаў.

Гістарычны вопыт палітыкі беларусізацыі 20-х гадоў і яго адлюстраванне ў беларускай гістарыяграфіі.

## Культурнае жыццё ў БССР у 1920-я гады

Палітыка савецкай улады і кіраўнікоў Кампартыі па пытаннях развіцця нацыянальнай культуры ў Беларусі: прынцыпы, асноўныя напрамкі, супярэчнасці, непаслядоўнасць, поспехі і здабыткі. Уплыў палітыкі беларусізацыі на актывізацыю нацыянальна-культурнага жыцця. Палітыка «культурнай рэвалюцыі». Узмацненне ідэалагічнага ўціску, праявы таталітарнай тэндэнцыі ў культурным жыцці.

Станаўленне і развіццё ў Беларусі савецкай сістэмы адукацыі. Барацьба з непісьменнасцю. Стварэнне агульнаадукацыйнай, спецыяльнай і вышэйшай школы. Матэрыяльная база сістэмы адукацыі, вырашэнне праблемы забеспячэння кадрамі. Праявы палітыкі беларусізацыі ў сферы адукацыі. Забеспячэнне культурных патрэб нацыянальных меншасцяў. Фарміраванне беларускай інтэлігенцыі.

Навука ў БССР. Стварэнне сістэмы навуковых устаноў. Заснаванне і дзейнасць Інбелкульта. Разгортванне навуковых даследаванняў па пытаннях беларускай мовы, гісторыі, этнаграфіі. Стварэнне Акадэміі навук БССР. У. Ігнатоўскі, С. Некрашэвіч, В. Ластоўскі, У. Пічэта, І. Замоцін, М. Прыляжаеў і іншыя вучоныя Беларусі. Сувязь навуковых даследаванняў з развіццём рэспублікі. Краязнаўства.

Развіццё беларускай савецкай літаратуры. Умовы літаратурнай дзейнасці ў пачатку 20-х гадоў. Праявы адноснай дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў творчай дзейнасці. Узнікненне і ідэйная барацьба розных плыняў і напрамкаў. Стварэнне і дзейнасць літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», «Полымя». Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў. Асноўныя тэмы ў творах 20-х гадоў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Чарота, З. Бядулі, К. Чорнага, М. Зарэцкага, А. Дудара і іншых беларускіх літаратараў.



Репозиторий ВГУ

Тэатральнае, музычнае і выяўленчае мастацтва Савецкай Беларусі. Выдатныя акцёры, рэжысёры, майстры выяўленчага мастацтва і іх творы. Рэпертуар тэатраў у Беларусі. Ф. Аляхновіч, У. Галубок, Е. Міровіч, П. Малчанаў, У. Крыловіч, Л. Ржэцкая, У. Уладамірскі і інш. Музычнае мастацтва: М. Аладаў, Р. Пукст, Н. Сакалоўскі, А. Туранкоў і інш. Віцебская мастацкая школа: Л. Лісіцкі, В. Ермалаева, К. Малевіч, М. Шагал. Тэматыка твораў мастакоў і скульптараў: В. Волкаў, Я. Кругер, У. Кудрэвіч, Ю. Пэн, М. Філіповіч, А. Бразер, А. Грубэ і інш. Культурна-асветніцкая праца. Станаўленне беларускага кіно. Ю. Тарыч, У. Корш-Саблін. Беларуская народная творчасць.

## Індустрыялізацыя

Сутнасць і неабходнасць індустрыялізацыі, асаблівасці яе правядзення ў рэспубліцы. Першы пяцігадовы план у прамысловасці Беларусі, асноўныя паказчыкі і асаблівасці. Заданні па росту аб'ёмаў. Сродкі на развіццё прамысловасці ў Беларусі. З'яўленне новых галін вытворчасці. Найбольш значныя прамысловыя прадпрыемствы, пабудаваныя за гады пяцігодкі ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Барысаве, Оршы і іншых гарадах. Змены ў сістэме кіравання. Вяртанне да каманднаадміністрацыйнай сістэмы, жорсткага планавання. Падпарадкаванне прамысловых прадпрыемстваў Беларусі агульнасаюзным органам. Метады і сродкі выканання заданняў пяцігадовага плана. Цяжкасці ў рабоце прамысловасці, умовах існавання працоўных падчас пяцігодкі. Гаспадарчыя вынікі першай пяцігодкі ў БССР.

Прамысловасць Беларусі ў гады другой пяцігодкі. Заданні па прамысловым развіцці. Новабудоўлі, тэхнічная рэканструкцыя вытворчасці. Абвастрэнне цяжкасцяў з выкананнем пяцігадовага плана. Зніжэнне тэмпаў развіцця ў БССР. Падрыхтоўка кадраў ІТР і кваліфікаваных рабочых. Разгортванне працоўнага спаборніцтва. Стаханаўскі рух у прамысловасці рэспублікі. Узмацненне адміністрацыйнага ўціску, ужыванне рэпрэсій для безумоўнага выканання вытворчых заданняў. Асноўныя вынікі ІІ пяцігодкі ў Беларусі. Прамысловасць Беларусі ў агульнасаюзным гаспадарчым комплексе.

## Калектывізацыя

Змена палітыкі камуністычнай партыі на вёсцы. Курс на калектывізацыю. Крызіс хлебанарыхтовак. Увядзенне надзвычайных мер. Канфіскацыя хлеба ў сялянства. Забарона гандлю сельгаспрадуктамі. Забарона хутарской формы землеўладкавання. Пачатак суцэльнай калектывізацыі. Тэрміны яе правядзення для Беларусі. Роля кіраўніцтва КП(б)Б у паскарэнні калектывізацыі. Забарона арэнды зямлі і найма рабочай сілы. Накіраванне на вёску рабочых для арганізацыі калгасаў, «дваццаціпяцітысячнікі».



Рэпазіторый ВГУ

Павелічэнне на працягу першых месяцаў 1930 года колькасці калгасаў і ўцягнутых у іх сялянскіх гаспадарак. Ліквідацыя «кулацкіх» гаспадарак, прымусовае ўступленне сялян у калгасы. Узмацненне напружанасці на вёсцы. Выступленні сялян супраць калектывізацыі. Адток сялянскіх гаспадарак з калгасаў вясной 1930 года. Новы наступ на сялянства восенню 1930 г. Калектывізацыя беларускай вёскі на працягу першай паловы 1930-х гадоў. «Раскулачванне», прымусовыя высылкі, рэпрэсіі. Узмацненне эканамічнага ўціску на сялян. Арганізацыя МТС і палітычных аддзелаў пры іх, роля іх у сельскагаспадарчай вытворчасці. Голад 1932–1933 гг. у Беларусі. Арганізацыйна-гаспадарчае кіраванне калгасамі і саўгасамі ў гады другой пяцігодкі. Матэрыяльна-тэхнічная база сельскай гаспадаркі. Вынікі калектывізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Колькасць калгасаў у БССР напрыканцы 30-х гадоў, стан раслінаводства, жывёлагадоўлі. Сацыяльна-палітычныя вынікі калектывізацыі, разбурэнне сялянскіх гаспадарак. Гістарыяграфія праблем калектывізацыі ў Беларусі.

**Грамадска-палітычнае жыццё ў канцы 1920-х – 1930-я гг.**

Карэнныя змены грамадска-палітычнага жыцця ў канцы 1920-х гадоў. Умацаванне таталітарнай тэндэнцыі ў палітыцы Кампартыі. Тэзіс аб узмацненні класавай барацьбы. Пашырэнне барацьбы з іншадумствам. Стварэнне рэпрэсіўнага апарату, пазасудовых органаў. Пераход да барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам (нацдэмамі). Справа «Саюза вызвалення Беларусі». Арышты і абвінавачванні па справе СВБ. Уплыў рэпрэсій на беларускае грамадства. Я. Купала, Я. Колас, У. Ігнатоўскі. Прыгавор па справе СВБ, трагічны лёс асуджаных. Дзейнасць органаў АДПУ–НКУС у Беларусі па «выкрыцці ворагаў народа». Рэпрэсіі супраць былых працаўнікоў бальшавіцкай партыі, беспадстаўныя арышты сярод інтэлігенцыі, дзяржаўнага апарату, беларускіх нацыянальных дзеячаў, розных слаёў насельніцтва. Масавы характар рэпрэсій 1937–1938 гг. у Беларусі. Рэпрэсіі ўнутры КП(б)Б. Трагічны лёс А. Чарвякова, М. Галадзеда, іншых кіраўнікоў рэспублікі. Рэпрэсіі 20–30-х гадоў – самае цяжкае злачынства сталінскага рэжыму. Агульныя лічбы аб колькасці ахвяр рэпрэсій у Беларусі.

Асноўныя рысы беларускага савецкага грамадства канца 30-х гадоў.

**Культура БССР у 1930-я гг.**

Асноўныя тэндэнцыі культурнага жыцця. Узмацненне ідэалагічнага ўціску, праявы таталітарнай тэндэнцыі ў культурным жыцці. Палітыка «культурнай рэвалюцыі». Выкараненне народнай культуры, нацыянальных традыцый і звычаяў, нормаў маралі. Ваяўнічы атэізм. Насаджэнне “пралетарскай”, “сацыялістычнай” культуры. “Сацыялістычны рэалізм”.



Рэпазіторый ВДУ

Ліквідацыя масавай непісьменнасці. Змены ў школьнай адукацыі. Пераход да сямігадовага абавязковага навучання. Вышэйшая і спецыяльная адукацыя. Навука. Галоўныя навуковыя цэнтры Беларусі і навукова-даследчая дзейнасць. Беларуская інтэлігенцыя і рэпрэсіі ў адносінах да яе.

Згортванне беларусізацыі. Рэформа беларускага правапісу. Праявы абвастрэння ідэалагічнай барацьбы 30-х гадоў у стане беларускай літаратуры. Перабудова пісьменніцкіх арганізацый. Змены ў тэматыцы і змесце мастацкіх твораў у выніку ідэалагічнага ўціску. Рэпрэсіі ў адносінах да беларускіх пісьменнікаў.

Узмацненне ўплыву ідэалогіі на мастацкую творчасць. Тэатральнае і музычнае мастацтва. Г. Глебаў, І. Ждановіч, У. Галубок. Тэатры БССР у 1930-х гг. Стварэнне беларускай музычнай школы. А. Туранкоў, М. Куліковіч-Шчаглоў, М. Равенскі, Я. Цікоцкі, Л. Александроўская.

Архітэктура і выяўленчае мастацтва. У. Волкаў, Я. Зайцаў, Р. Семашкевіч, З. Азгур, А. Арлоў, А. Бразер, А. Грубэ, І. Лангбард і інш. Рэпрэсіі супраць творчай інтэлігенцыі. Абмежаванасць працэсу нацыянальна-культурнага развіцця ў 30-я гады.

## *Раздзел XI.*
## ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Месца і роля Заходняй Беларусі ў планах Польшчы. Заходнебеларускія землі ў складзе Польскай дзяржавы: тэрыторыя, склад насельніцтва, тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел, органы кіравання. Палітыка польскіх улад у адносінах да Заходняй Беларусі, нацыянальных праблем беларусаў.

Адметныя рысы эканомікі Заходняй Беларусі, яе месца ў эканоміцы Польшчы. Стан прамысловасці, асноўныя яе галіны. Колькасць рабочых, умовы іх працы і жыцця. Праявы эканамічнага крызісу 1929–1933 гг. у Заходняй Беларусі. Рост беспрацоўя. Рабочы рух у Заходняй Беларусі. Забастоўкі ў прамысловых цэнтрах, у Белавежскай Пушчы. Аграрнае пытанне ў Заходняй Беларусі. Зямельная рэформа, парцэляцыя, камасацыя, ліквідацыя сервітутаў. Асадніцтва. Збядненне беларускага сялянства. Эканамічная эміграцыя.

Нацыянальны прыгнёт беларускага насельніцтва. Фальсіфікацыя звестак аб нацыянальным складзе насельніцтва. Нацыянальны ўціск. Закрыццё беларускіх школ. Скарачэнне для беларускага насельніцтва магчымасцяў атрымаць адукацыю, ужываць беларускую мову. Таварыства беларускай школы (ТБШ), яго культурна-асветніцкая дзейнасць.

Умовы палітычнага жыцця ў Заходняй Беларусі. Асноўныя палітычныя партыі. Выбары ў сейм 1922 г. Беларускі пасольскі клуб. Беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі. Партыя беларускіх

Рэпазіторый ВГУ

эсэраў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Стварэнне Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА). Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларускі сялянскі саюз (БСС). Утварэнне Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), яе роля ў рэвалюцыйна-вызваленчым руху. Уплыў польскіх, яўрэйскіх, іншых дэмакратычных партый на насельніцтва Заходняй Беларусі.

Афармленне Беларускай сялянска-рабочай грамады (БСРГ). Яе праграма, палітычная і арганізацыйная дзейнасць. Пераўтварэнне грамады ў масавую арганізацыю. Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Валошын, П. Мятла і іншыя кіраўнікі Беларускага нацыянальнага руху. Разгром і забарона БСРГ польскімі ўладамі.

Выбары ў сейм (1928 г.) у Заходняй Беларусі. Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб «Змаганне». Судовыя працэсы ў Заходняй Беларусі. Уздым рабочага і сялянскага руху на пачатку 30-х гадоў. Узмацненне палітычнай рэакцыі польскіх улад. Спробы стварэння антыфашысцкага народнага фронта. Беларускае народнае аб'яднанне (БНА). Роспуск КПЗБ, рэпрэсіі ў адносінах да яе кіраўнікоў.

Культура Заходняй Беларусі. Школы, друк, літаратура і мастацтва. Творы М. Танка, М. Васілька, В. Таўлая, Я. Брыля, Б. Тарашкевіча, І. Дварчаніна і інш. Народная творчасць Р. Шырма. Драматычныя секцыі пры гуртках ТБШ.

## *Раздзел XII.*
## БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

### Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР

Заходняя Беларусь у сферы савецка-германскай палітыкі. Савецка-германскі дагавор 1939 г., сакрэтныя пратаколы да яго. Пачатак Другой сусветнай вайны. Напад фашысцкай Германіі на Польшчу, разгром польскай дзяржавы. Ваенныя дзеянні на беларускай тэрыторыі.

Уступленне Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Баі супраць польскіх войскаў. Адносіны насельніцтва да прыходу Чырвонай Арміі. Лінія мяжы паміж савецкімі і германскімі войскамі ў Беларусі. Лёс польскіх вайскоўцаў, апынуўшыхся ў савецкім палоне. Праблемы бежанцаў і іх вырашэнне. Дагавор аб дружбе і граніцы СССР і Германіі.

Арганізацыя часовых органаў кіравання на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Часовыя ўправы, сялянскія камітэты і іх дзейнасць. Накіраванне ў Заходнюю Беларусь партыйных, савецкіх і дзяржаўных работнікаў з усходніх раёнаў БССР. Хуткае стварэнне арганізацый КП(б)Б, забарона дзейнасці іншых палітычных партый. Выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі, яго склад. Рашэнні Народнага сходу, ІІІ сесіі Вярхоўнага Савета БССР. Павелічэнне тэрыторыі і насельніцтва БССР. Перадача часткі беларускіх зямель Літве.

Репозиторий ВГУ

Усталяванне савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Выбары ў Вярхоўныя Саветы СССР і БССР. Нацыяналізацыя прамысловасці і яе развіццё. Пачатак стварэння калгасаў, МТС. Змены ў культурным жыцці. Антысавецкая барацьба ў Заходняй Беларусі. Польскае падполле. Дэпартацыі з Заходняй Беларусі асаднікаў, чыноўнікаў, іншых груп насельніцтва. Сучасныя ацэнкі падзей восені 1939 г., уключэння Заходняй Беларусі ў склад БССР, змен у жыцці заходнебеларускага насельніцтва.

**Беларусь напярэдадні нападу Германіі**

Развіццё БССР у гады III пяцігодкі. Стан народнай гаспадаркі, супярэчнасці сацыяльна-палітычнага жыцця. Узмацненне працоўнай дысцыпліны, жорсткасці таталітарнага рэжыму. Удзел насельніцтва БССР у абаронных мерапрыемствах, стварэнне ўмацаваных раёнаў.

**Вялікая Айчынная вайна 1941–1945 гг. у Беларусі**

Нападзенне фашысцкай Германіі на СССР. Прычыны трагічнага пачатку вайны для Чырвонай Арміі. Баі ў пагранічных раёнах БССР. Абарона Брэсцкай крэпасці. Навагрудскі кацёл. Абарона Мінска. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў першыя месяцы вайны. Спробы арганізаваць абарону на Беразіне і Дняпры. Эвакуацыя прамысловых прадпрыемстваў, дзяржаўнай і калгаснай маёмасці і насельніцтва ў савецкі тыл. Дапамога насельніцтва Чырвонай Арміі. Будаўніцтва абарончых аб’ектаў. Знішчальныя батальёны і атрады народнага апалчэння. Баі пад Бабруйскам, Барысавам, Віцебскам. Абарона Магілёва і Гомеля. Вынікі двухмесячных баёў у Беларусі.

Акупацыя тэрыторыі Беларусі германскімі войскамі. Мэты акупацыйнай палітыкі. Устанаўленне акупацыйнага рэжыму. Тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел Беларусі. Сістэма акупацыйных органаў і мясцовай улады на акупіраванай немцамі тэрыторыі. Акупацыйны апарат кіравання. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя мерапрыемствы нямецкіх акупантаў. Рабаванне гітлераўцамі гаспадарчых і культурных каштоўнасцяў. Масавае знішчэнне ваеннапалонных і насельніцтва. Вываз насельніцтва на работу ў Германію. Канцэнтрацыйныя лагеры і турмы. Карныя экспедыцыі. Яўрэйскія гета.

Беларускі нацыянальны рух, беларускія нацыянальныя арганізацыі ва ўмовах акупацыі. Беларускія калабарацыяніскія арганізацыі і іх дзейнасць, Беларуская народная самапомач. Беларуская самаахова. Саюз беларускай моладзі. Беларуская цэнтральная рада. Беларуская краёвая абарона. Другі ўсебеларускі кангрэс.

Адносіны насельніцтва Беларусі да нямецкага акупацыйнага рэжыму. Разгортванне барацьбы супраць нямецкіх войскаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Першыя партызанскія атрады і



Репозиторий ВГУ

падпольныя антыфашысцкія камітэты і групы. Дзейнасць КП(б)Б ва ўмовах акупацыі. Стварэнне сеткі падпольных партыйных і камсамольскіх органаў і арганізацый. Мінскае падполле. Падпольныя арганізацыі і барацьба з акупантамі ў Магілёве, Віцебску, Оршы, Скідалі, іншых раёнах Беларусі. Антыфашысцкія патрыятычныя арганізацыі ў заходніх абласцях рэспублікі. Супраціўленне ў гета.

Уплыў ваенных падзей на ваенна-палітычнае становішча ў Беларусі. Узмацненне партызанскай барацьбы пасля разгрому фашысцкіх войскаў пад Масквой. Партызанскія брыгады, іх баявая дзейнасць. Стварэнне і роля Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР). Арганізацыйная структура савецкага партызанскага руху. Партызанскія зоны. Рэйды партызанскіх фарміраванняў. «Рэйкавая вайна». Дапамога савецкага тылу і мясцовага насельніцтва партызанам і падпольшчыкам. Удзел насельніцтва ў зрыве палітычных і эканамічных мерапрыемстваў акупантаў. Узаемаадносіны мірнага насельніцтва і партызан. Асаблівасці антыфашысцкай барацьбы ў Заходняй Беларусі. Армія Краёва ў Беларусі: мэты, тактыка, дзейнасць, ўзаемаадносіны з савецкімі партызанамі.

Вызваленне Беларусі. Пачатак вызвалення тэрыторыі Беларусі ў канцы 1943 г. – пачатку 1944 г. Сумесныя дзеянні партызан і часцей Чырвонай Арміі. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Акружэнне і разгром фашысцкіх войскаў пад Віцебскам, Бабруйскам, Мінскам. Вызваленне Мінска, усёй тэрыторыі БССР ад нямецкіх захопнікаў. Подзвігі савецкіх воінаў падчас вызвалення Беларусі. Значэнне разгрома гітлераўскіх войскаў у Беларусі.

Аднаўленчыя мерапрыемствы на вызваленай тэрыторыі Беларусі ў гады вайны. Дапамога народаў СССР у аднаўленні гаспадаркі Беларусі. Першыя крокі па аднаўленні прамысловасці. Дапамога сельскай гаспадарцы. Аднаўленне ўстаноў адукацыі і культуры.

Удзел беларускага народа ў разгроме фашысцкай Германіі і Японіі. Беларусы на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у еўрапейскім руху Супраціўлення. Эвакуіраваныя жыхары Беларусі ў савецкім тыле. Людскія, матэрыяльныя і культурныя страты Беларусі ў час Другой сусветнай вайны.

## *Раздзел XIII.*
## БЕЛАРУСЬ У ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1945–1985 гг.)

### Беларусь у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе

БССР пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі. Разбурэнне эканомікі, шляхі і метады яе аднаўлення. Пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР 1946–1950 гг. Дасягненне даваеннага ўзроўню прамысловага развіцця. Стварэнне новых галін прамысловасці. Апераджальны рост цяжкай прамысловасці. Адміністрацыйна-бюракратычная сістэма кіравання прадпрыемствамі.



Репозиторий ВГУ

Цяжкасці і пралікі ў гаспадарчым жыцці. Працоўная актыўнасць у аднаўленчы перыяд. Сацыялістычнае спаборніцтва.

Умовы аднаўлення сельскай гаспадаркі Беларусі. Аднаўленне калгасна-саўгаснай сістэмы, МТС. Дапамога ўсходніх раёнаў СССР, вяртанне з эвакуацыі матэрыяльных каштоўнасцяў, жывёлы. Калектывізацыя ў заходніх раёнах БССР. Барацьба супраць калектывізацыі ў Заходняй Беларусі. Узбуйненне калгасаў у пачатку 1950-х гадоў. Спробы пераадолець крызісныя з’явы ў сельскай гаспадарцы. Прычыны адставання сельскагаспадарчай вытворчасці.

Грамадска-палітычнае жыццё. Аднаўленне дзейнасці партыйных, савецкіх органаў і грамадскіх арганізацый пасля вайны. Стварэнне і дзейнасць палітаддзелаў пры МТС у заходніх абласцях. Падпольныя патрыятычныя арганізацыі беларускай моладзі. Антысавецкая барацьба і бандытызм. Агітацыйная дзейнасць падчас выбарчых кампаній у Саветы. Узмацненне адміністрацыйна-каманднай сістэмы, культа асобы Сталіна і ідэалагічнага ўціску. Рэпрэсіі ў пасляваенныя гады. Абвінавачванні навуковай і творчай інтэлігенцыі рэспублікі падчас “дыскусій” па праблемах біялогіі, мовазнаўства, “справы ўрачоў”, ідэалагічных кампаній. Першыя спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця пасля смерці Сталіна.

Выхад БССР на міжнародную арэну. Стварэнне Міністэрства замежных спраў. Пашырэнне паўнамоцтваў рэспублікі ў галіне знешніх зносін. БССР – адна з краін-заснавальніц ААН. Удзел Беларусі ў дзейнасці спецыялізаваных міжнародных устаноў. Дзейнасць прадстаўнікоў БССР у ААН. Умовы развіцця замежных сувязяў.

Матэрыяльнае і бытавое становішча насельніцтва Беларусі ў пасляваенныя гады. Вастрыня жыллёвай праблемы ў гарадах і на вёсцы. Удзел жыхароў у аднаўленні. Пашырэнне камунальнай гаспадаркі і транспарту. Планы аднаўлення і рэканструкцыі гарадоў. Забеспячэнне насельніцтва прадуктамі і таварамі. Картачная сістэма, яе адмена. Пашырэнне гандлю. Наладжванне медыцынскага абслугоўвання і сацыяльнага забеспячэння.

Аднаўленне ў галіне культуры. Становішча народнай адукацыі пасля вайны. Аднаўленне і пашырэнне сеткі агульнаадукацыйных школ. Павелічэнне асігнаванняў з бюджэту на патрэбы адукацыі. Забеспячэнне настаўніцкімі кадрамі. Скарачэнне колькасці беларускіх школ. Аднаўленне сістэмы вышэйшай адукацыі. Адкрыццё новых навучальных устаноў. Забеспячэнне рэспублікі кваліфікаванымі кадрамі. Аднаўленне навуковых устаноў, дзейнасць Акадэміі навук БССР, развіццё навуковых даследаванняў. Літаратура і мастацтва ў пасляваеннае дзесяцігоддзе. Ідэалагічнае ўмяшанне ў дзейнасць творчай інтэлігенцыі. Вядучая тэматыка ў творчасці мастакоў, літаратараў, кінематаграфістаў Беларусі ў пасляваенныя гады. Творчасць М. Лынькова, І. Шамякіна, І. Мележа, Я. Брыля, К. Крапівы, А. Маўзона,



Репозиторий ВГУ

М. Танка, П. Панчанкі і інш. Рэпертуар тэатраў. Музычная культура. А. Багатыроў, Дз. Лукас, У. Алоўнікаў, Ю. Семеняка. Творчасць мастакоў І. Ахрэмчыка, Я. Зайцава, В. Волкава, Ф. Дарашэвіча, У. Сухаверхава, А. Малішэўскага, скульптараў З. Азгура, А. Бембеля, А. Глебава, С. Селіханава і інш. Аднаўленне сеткі культурна-асветніцкіх установ. Павелічэнне выпуску газет, часопісаў, кніг.

## БССР у 50–80-я гг. XX ст.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Асноўныя тэндэнцыі эканамічнага развіцця рэспублікі ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Асаблівасці навукова-тэхнічнага прагрэсу ў Беларусі. Структура прамысловасці. Стварэнне новых галін вытворчасці. Уплыў ваенна-прамысловага комплексу на тэхнічны прагрэс. Пагаршэнне экалагічнай абстаноўкі. Спробы эканамічных рэформ. Тэмпы прамысловай вытворчасці, прычыны іх зніжэння з канца 1970-х гадоў.

Становішча ў сельскай гаспадарцы рэспублікі. Пошукі шляхоў выхаду з крызісу. Рэарганізацыя МТС. Ажыццяўленне эканамічнай рэформы ў кіраванні сельскай гаспадаркай. Тэхнічная база, спецыялізацыя і канцэнтрацыя сельскагасладарчай вытворчасці, спробы яе інтэнсіфікацыі. Індустрыялізацыя яе вытворчасці. Меліярацыя. Стварэнне сельскагаспадарчых комплексаў. Харчовая праграма і яе вынікі. Дасягненні і пралікі, прычыны цяжкасцяў у аграпрамысловым комплексе рэспублікі. Рост застойных тэндэнцый у сацыяльна-эканамічным развіцці.

Грамадска-палітычнае жыццё. Спробы дэмакратызацыі грамадскага жыцця. Рэабілітацыя ахвяр культу асобы. Кампартыя Беларусі: яе склад, месца і роля ў беларускім грамадстве. Стыль і метады партыйнага кіраўніцтва дзяржаўнай, гаспадарчай і культурнай сферамі жыцця, Саветы, прафсаюзы, маладзёжныя і іншыя арганізацыі. Фармалізацыя грамадскага жыцця, асноўныя супярэчнасці паміж прапагандай і жыццём. Канстытуцыя БССР 1978 г.

Культурнае жыццё рэспублікі. Пераход да абавязковай васьмігадовай і ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы адукацыі. Вышэйшая, сярэдняя спецыяльная і прафесійна-тэхнічная адукацыя. Адкрыццё ў рэспубліцы новых навучальных устаноў. Пашырэнне універсітэцкай адукацыі. Навукова-даследчыя ўстановы рэспублікі. Асноўныя напрамкі навуковых даследаванняў, іх дасягненні. Галоўныя дасягненні ў развіцці беларускай літаратуры і мастацтва. Творы А. Адамовіча, В. Быкава, Н. Гілевіча, У. Караткевіча, К. Кірэенкі, А. Макаёнка, М. Матукоўскага, М. Лужаніна, П. Панчанкі, М. Савіцкага і інш. Абмежаванасць нацыянальна-культурнага жыцця ў Беларусі. Выцясненне беларускай мовы са сферы адукацыі, навукі і друку. Прычыны духоўнага крызісу грамадства і яго сацыяльна-псіхалагічныя вынікі.



Рэпазіторый ВДУ

## *Раздзел XIV.*
## БЕЛАРУСЬ СУЧАСНАЯ

Сацыяльна-эканамічнае становішча рэспублікі ў сярэдзіне 80-х гадоў XX ст. Неабходнасць кардынальных змен і пошукі шляхоў іх ажыццяўлення ў дзейнасці партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва рэспублікі. Асаблівасці і цяжкасці ажыццяўлення эканамічных рэформ у Беларусі. Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы. Адмаўленне ад цэнтралізаванай сістэмы кіравання эканомікай і пераход да рыначных адносін. Усталяванне розных форм маёмасці і гаспадарання. Пошукі шляхоў выпрацоўкі аграрнай палітыкі. Сацыяльна-эканамічныя праблемы ва ўмовах пераходнага перыяду і шляхі выхаду з крызісу ў эканоміцы і сацыяльных адносінах.

Новыя з’явы ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. Праявы крызісу аднапартыйнай сістэмы. Узнікненне і ўмацаванне новых палітычных сіл, партый і рухаў. Узнікненне БНФ на платформе ідэі нацыянальнага адраджэння. Аслабленне пазіцыі КПБ, зніжэнне яе ўплыву на палітычнае жыццё рэспублікі. Палітычныя платформы і дзейнасць сучасных палітычных партый у Беларусі. Іх уплыў на грамадска-палітычнае жыццё ў рэспубліцы, дзейнасць Вярхоўнага Савета РБ. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі, наданне ей статуса Канстытуцыйнага Закона. Значэнне гэтай падзеі для набыцця сапраўднай дзяржаўнай незалежнасці Беларусі.

Прызнанне замежнымі краінамі незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Пашырэнне палітычных, эканамічных і культурных сувязяў з замежнымі дзяржавамі. Роля РБ у стварэнні і развіцці ўзаемаадносін у рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Супярэчнасці, цяжкасці і здабыткі працэсу развіцця незалежнасці РБ. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Станаўленне прэзідэнцкай палітычнай сістэмы. Выбары першага Прэзідэнта, новага складу Вярхоўнага Савета. Пытанне аб дзяржаўнай сімволіцы РБ, рэферэндум у маі 1995 г. і яго вынікі. Рэферэндум у лістападзе 1996 г. Змены ў Канстытуцыі. Падпісанне саюзнага дагавора Беларусі і Расіі і будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Рэферэндум 2001 г. Прэзідэнцкія выбары 2006 г. Сучасная палітычная і эканамічная мадэль беларускай дзяржаўнасці.

Уплыў дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця на актывізацыю духоўнага патэнцыялу рэспублікі. Праграма адраджэння беларускай мовы, нацыянальнай культуры. Наданне беларускай мове статусу дзяржаўнай мовы. Закон аб адукацыі ў РБ, яго ўплыў на развіццё нацыянальнай самасвядомасці. Стварэнне і дзейнасць грамадскіх арганізацый у галіне развіцця нацыянальнай культуры, гісторыі. Нацыянальныя адносіны ў Беларусі, пошук шляхоў вырашэння праблем нацыянальных меншасцяў. Творчыя арганізацыі

Рэпазіторый ВДУ

рэспублікі. Вяртанне забытых твораў і імёнаў дзеячаў культуры. Сучасныя праблемы беларускага культурнага адраджэння.

## Беларускае замежжа

Беларуская эміграцыя як частка беларускай нацыі. Палітычныя і эканамічныя падставы для эміграцыі з Беларусі. Пачатак масавай эміграцыі з Беларусі на рубяжы XIX–XX стст., асноўныя мэты, шляхі і накірункі эміграцыі. Лёс эмігрантаў. З'яўленне арганізаванай палітычнай эміграцыі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, яе памеры і асноўныя накірункі. Кіруючыя органы БНР, беларускіх нацыянальных партый і арганізацый у эміграцыі. Вайсковыя фарміраванні БНР у эміграцыі. Кансалідацыя беларускіх сіл за мяжой. Канферэнцыі ў Рызе і Празе. Адносіны лідэраў беларускай эміграцыі да Рыжскага міру, адстойванне ідэі незалежнасці Беларусі. Спробы падрыхтоўкі ўзброенага паўстання. Адносіны беларускай эміграцыі да савецкай Беларусі. Кантакты кіраўнікоў БССР з эміграцыей. Уплыў амністыі, палітыкі беларусізацыі, гаспадарчых поспехаў у БССР на пазіцыі беларускай эміграцыі. Раскол у беларускай эміграцыі. Канферэнцыя ў Берліне (1925 г.) і яе вынікі. Рух за вяртанне. Уключэнне былых эмігрантаў у нацыянальна-культурнае адраджэнне на савецкай частцы Беларусі. Рэпрэсіі ў адносінах да беларускіх дзеячаў, вярнуўшыхся з эміграцыі.

Кіруючыя органы беларускай эміграцыі ў другой палове 20-х і ў 30-я гады XX ст. Нацыянальна-культурная дзейнасць беларускай эміграцыі. Культурныя і асветніцкія ўстановы беларусаў у Літве, Латвіі, Эстоніі, Чэхаславакіі і іншых краінах. Выдавецкая дзейнасць. Студэнцкія аб'яднанні. Жыццё беларускай эміграцыі на амерыканскім кантыненце. Роля беларускай эміграцыі ў захаванні нацыянальнай спадчыны.

Чарговая хваля эміграцыі і міграцыі ў СССР пасля Другой сусветнай вайны. Партыйна-дзяржаўная палітыка ва ўзаемаадносінах БССР з беларускай дыяспарай. Галоўныя цэнтры эміграцыі пасля Другой сусветнай вайны, іх дзейнасць. Дзейнасць Беларускага таварыства "Радзіма", Беларускага таварыства культурных сувязей з замежнымі краінамі. Беларуская дыяспара і суверэнная Беларусь – новая сістэма ўзаемадачыненняў. Стварэнне і дзейнасць грамадскага аб'яднання беларусаў свету "Бацькаўшчына". З'езды беларусаў свету. Уклад беларусаў замежжа ў развіццё навукі і культуры сусвету.

Репозиторий ВГУ

# ЛІТАРАТУРА


**Крыніцы:**

Белорусская ССР за 50 лет: статистический сб. – Мн., 1968.

Белоруссия в эпоху капитализма: сб. док. и материалов: в 2 т. – Мн., 1983, 1990.

Белоруссия в эпоху феодализма: сб. док. и материалов: в 4 т. – Мн., 1959–1979.

Беларусізацыя. 1920-я гады. Дакументы і матэрыялы. – Мн., 2001.

Белорусские остарбайтеры. Документы и материалы. – Мн., 1996–1998. – Т. 1–5.

Борьба за советскую власть в Белоруссии 1918–1920: сб. док. и материалов: в 2 т. – Мн., 1968, 1971.

Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864. Док. и материалы. – М., 1965.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Док. и материалы. – Мн., 1973–1988.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772–1903 гг.). – Мн., 1940. – Т. 2.

Документы и материалы по истории Белоруссии (1900–1917). – Мн., 1953. – Т. 3.

Дэкларацыя Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце БССР (27 ліпеня 1990 г.). – Мн., 1990.

Закон Рэспублікі Беларусь “Аб мовах у Беларускай ССР”. – Мн., 1990.

Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў.– Мн., 1997–2002. – Т. 1–5.

История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост.: Н.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Мн., 2000.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. – Мн., 1994, 1996.

Канун и начало войны. Документы и материалы. – Л., 1991.

Кооперативно-колхозное строительство в СССР. Документы и материалы. – М., 1991.

Праграмныя дакументы палітычных партый / склад. П.І. Брыгадзін. – Мн., 1994.

Публицистика белорусских народников. – Мн., 1993.

Хрестоматия по истории Белоруссии: с древнейших времен до 1917 г. – Мн., 1977.

Хрестоматия по истории БССР (1917–1983). – Мн., 1984.


Рэпазіторый ВДУ

**Асноўная:**
Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. – Мн., 1972–1975.
Гісторыя Беларусі: навуч. дапам. / А.Г. Каханоўскі [і інш.]. – Мн., 2001.
Гісторыя Беларусі: у 6 т.– Мн., 2005. – Т. 4–5.
Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – Ч.1. Ад старажытных часоў па люты 1917; – Ч. 2. Люты 1917–2000.
Гісторыя Беларусі: курс лекцый: 2 ч. – Мн., 2002. – Ч. 2. XIX–XX стст.
Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. – Мн., 1997. – Т. 1.; – Мн., 2002. – Т. 2.
Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. – Мн., 2003.
Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. – Мн., 1994.
История политических партий. Материалы для самостоятельной работы студентов / под общ. ред. В.К. Коршука, И.Ф. Романовского. – Мн., 2002.
Круталевич В.А. История Беларуси: становление национальной державности (1917–1922). – Мн., 1999.
Лыч Л.М., Навіцкі У.Л. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн., 1996.
Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / рэд. М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1994–1995.
Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік: – 2-е выд., дап. і перапрац. / В.І. Галубовіч [і інш.]; пад агульн. рэд. В.І. Галубовіча. – Мн., 2005
Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. – Мн., 1985.
Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі і права Беларусі. – Мн., 1992.

**Дадатковая:**
Актуальныя пытанні гісторыі БССР (савецкі перыяд). – Мн., 1990.
Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён. – Мн., 1992.
Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні. – Мн., 1999.
З гісторыі палітычных партый: вучэб. дапам. для студэнтаў. – Мн., 1993.
История Беларуси: учеб.-информ. пособие / под ред. А.Г. Кохановского, О.А. Яновского. – Мн., 2001.
История политических партий России и Беларуси (конец XIX – первая четверть XX в.). – Мн., 2001.
Ковкель И.И., Ярмусик Э.С. История Беларуси. – Мн., 1998.
Матэрыялы па гісторыі Беларусі. – Мн., 2000.

Рэпазіторый ВГУ

Октябрь и судьбы политической оппозиции. – Гомель, 1993.

Очерки истории, науки и культуры Беларуси. IX–XX вв. – Мн., 1996.

Антон Луцкевич: Материалы следственного дела НКВД БССР / науч. ред. В.Н. Михнюк. – Мн., 1997.

Вішнеўскі А.Ф., Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права ў Беларусі ў дакументах і матэрыялах. – Мн., 2003.

Каліноўскі К. На нашу вольнасць: Творы, дакументы. – Мн., 1999.

Калиновский К. Из печатного и рукописного наследия. – Мн., 1988.

Луцкевіч А. За 25 гадоў (1903–1928). Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый: БРГ, БСГ. – Мн., 1991.

На крутым павароце. Ідэолага-палітычная барацьба на Беларусі ў 1919–1931 гг. Дакументы, матэрыялы, аналіз. – Мн., 1999.

Народное образование в БССР: сб. док. и материалов: в 2 т. – Мн., 1979–1980.

«Нацистское золото» из Беларуси: док. и материалы. – Мн., 1998.

Платонаў Р.П. Беларусь у міжваенны перыяд. Старонкі палітычнай гісторыі ў святле архіўных крыніц. – Мн., 2001.

Платонов Р.П. Белоруссия, 1941-й: известный и неизвестный. По документам Национального архива Республики Беларусь. – Мн., 2000.

Польско-советская война 1919–1920: (Ранее не опубликованные документы и материалы). – М., 1994. – Ч. 1–2.

Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг. Сб. док. – М., 1964.

Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах. – Мн., 2001.

Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии. Сб. док. и материалов. – Мн., 1988.

Федеративный договор. Документы. – М., 1992.

Фисенко В.Н. Хартия сотрудничества. – Мн., 1993.

Адамушка У.І. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гг. на Беларусі. – Мн., 1994.

Актуальные проблемы формирования правового государства в Республике Беларусь. – Мн., 1996.

Арлоў У.А. Таямніцы полацкай гісторыі. – Мн., 1994.

Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / І.М. Абрамаў [і інш.]. – Мн., 2000.

Беларусь на пути к европейской интеграции: вопросы суверенитета. – Мн., 1997.

Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. – Мн., 1997. – Ч. 1, 2.

Репозиторий ВГУ

Беларусазнаўства: навук. дапам. / пад рэд. П.І. Брыгадзіна. – Мн., 1997.

Белоруссия и Россия: отечества и государства. – М., 1997.

Біч М. Беларускае адраджэнне ў XIX – пачатку XX ст. – Мн., 1993.

Блинова Т. Иезуиты в Белоруссии. – Мн., 1990.

Бригадин П.И. Эсеры в Беларуси (конец XIX в. – февраль 1917 г.). – Мн., 1994.

Брыгадзін П.І., Мацяс І.Д. Усевалад Ігнатоўскі: Палітычны дзеяч, вучоны. – Мн., 1998.

Бяспалая М. Беларуская вёска ў першыя гады НЭПа (1921–1923). – М., 1999.

Валаханович И.А. Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944–1953 гг. – Мн., 2002.

Варонка Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 г. Кароткі агляд. – Мн., 1991.

Волкогонов Д.А. Семь вождей. Галерея лидеров СССР: в 2 кн. – Мн., 1995.

Врублевский А.П., Протько Т.С. Из истории репрессий против белорусского крестьянства. 1929–1934 гг. – Мн., 1992.

Гарбачова В.В. Паўстанне 1830–1831 гадоў на Беларусі. – Мн., 2001.

Глушаков В.В. Беларусь на пороге тысячелетий. – Мн., 1999.

Государственность Беларуси. Проблемы формирования в программах политических партий. – Мн., 1999.

Ермолович В.И., Жумарь С.В. Огнем и мечом: Хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939–1953 гг.). – Мн., 1994.

Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906–1917 гг.). – Мн., 1999.

Запруднік Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. – Мн., 1996.

Зелинский П.И. Политическая работа КПЗБ в массах. 1928–1939 гг. – Мн., 1988.

Ігнаценка І.М. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: Асаблівасці і вынікі. – Мн., 1995.

Ігнатоўскі У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. – Мн., 1991.

Иностранная военная интервенция в Белоруссии 1917–1920 гг. – Мн., 1990.

Каваленя А.А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. – Мн., 1999.

Кандыбовіч С. Разгром нацыянальнага руху ў Беларусі / аўт. прадм. В. Скалабан. – Мн., 2000.

Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.). – Мн., 1998.



Репозиторий ВГУ

Касцюк М.П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. – Мн., 2000.

Каханоўскі Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX ст. / навук. рэд. Л.Д. Побаль. – Мн., 1984.

Каханоўскі Г.А., Каханоўскі А.Г. Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч. – Мн., 1991.

Кісялёў Г.В. На пераломе дзвюх эпох: Паўстанне 1863 г. на Міншчыне. – Мн., 1990.

Крук У.П. Сялянскі рух на Беларусі. 1864–1900. – Мн., 1993.

Круталевич В.А. На путях национального самоопределения: БНР–БССР–РБ. – Мн., 1995.

Культурна-нацыянальныя працэсы на Беларусі ў другой палове XIX–XX ст.: зб. навук. прац / пад агульн. рэд. М. Забаўскага, І. Канапацкага. – Мн., 1998.

Куль-Сяльвёрстава С.Я. Беларусь на мяжы стагоддзяў (другая палова XVIII – 1820 г.). – Мн., 2000.

Ладысеў У.Ф., Брыгадзін П.І. На пераломе эпох: Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.). – Мн., 1999.

Ладысев В.Ф. В борьбе за демократические права и свободы: (Из исторического опыта Компартии Западной Белоруссии, 1929–1938 гг.). – Мн., 1988.

Лемяшонак У.І. Вызваленне – без грыфа «Сакрэтна». – Мн., 1996.

Літвін А.М. Акупацыя Беларусі (1941–1944): Пытанні супраціву і калабарацыі. – Мн., 2000.

Луговцова С.А. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. – Мн., 1997.

Луцкевіч А. Польская акупацыя ў Беларусі. – Мн., 1992.

Марозава С. Уніяцкая царква ў культурна-гістарычным развіцці Беларусі (1596–1839 гг.). – Гродна, 1996.

Мартос А. Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни. – Мн., 1990.

Михнюк В.Н. Социалистические преобразования в западных областях БССР (сентябрь 1939 – июнь 1941 гг.). Историографический очерк. – Мн., 1979.

Михнюк В.Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.) / под ред. П.Т. Петрикова. – Мн., 1985.

Міхнюк У.М. Арыштаваць у высылцы: Дакументальны нарыс пра А. Дудара. – Мн., 1996.

Павлов Я.С. Советско-германские договоры 1939–1941 гг.: Трагедия тайных сделок. – Мн., 1996.

Репозиторий ВГУ

Палітычныя партыі Беларусі: дапам. для вывучаючых гісторыю Беларусі. – Мн., 1994.

Первая мировая война – пролог XX века. – М., 1998.

Пилипенко М. Возникновение Белоруссии. Новая концепция. – Мн., 1991.

Платонаў Р.П. Лёсы: Гісторыка-дакументальныя нарысы аб людзях і малавядомых падзеях духоўнага жыцця ў Беларусі 20–30-х гг. – Мн., 1998.

Платонаў Р.П. На крутым павароце: Ідэолага-палітычная барацьба на Беларусі ў 1929–1931 гг. – Мн., 1999.

Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць / адк. рэд. П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў. – Мн., 2000.

Рудовіч С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 г. – Мн., 2001.

Сарокін А.М. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска (1917–1990 гг.). – Мн., 1999.

Сачанка Б. Беларуская эміграцыя. – Мн., 1991.

Сямашка Я. Армія Краёва на Беларусі. – Мн., 1994.

Слобожанин В.П. Земское самоуправление в Беларуси (1905–1917 гг.). – Мн., 1994.

Снапкоўскі У.Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі. 1944–1953 гг. – Мн., 1997.

Содружество Независимых Государств: портрет на фоне перемен / авт.-сост. А. Белько и др.; отв. ред. И.М. Коротченя. – Мн., 1996.

Соловьев А.К. Белорусская Центральная Рада: создание, деятельность, крах. – Мн., 1995.

Сосна У.А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – 1-й палове XIX ст. – Мн., 2000.

Сташкевич Н.С. Приговор революции: Крушение антисоветского движения в Белоруссии, 1917–1925. – Мн., 1985.

Страницы истории Компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты / сост.: Ю.П. Смирнов, Н.С. Сташкевич; под ред. Р.П. Платонова. – Мн., 1990.

Таляронак С. Грамадска-палітычны рух на Беларусі (канец XVIII – 30-я гг. XIX ст.). – Мн., 1998.

Тарле Е.В. Нашествие Наполеона на Россию. – М., 1992.

Тимохович И.В. Битва за Белоруссию. – Мн., 1994.

Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. – Мн., 1993.

Турук Ф.Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов / предисл. А. Кавки. – Мн., 1994.

Філаматы і філарэты. – Мн., 1998.



Репозиторий ВГУ

Ходзін С.М. Крыніцы гісторыі Беларусі (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне): вучэб. дапам. – Мн., 1999.

Ходзін С.М. Гісторыя культуры Беларусі ў 1920–1930-я гг.: дапам. для студэнтаў. – Мн., 2001.

Цвикевич А. Краткий очерк возникновения БНР. – Мн., 1990.

Цітоў В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь: краіна і людзі. – Мн., 2001.

Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадскай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. – 2-е выд. – Мн., 1993.

Шадурский В.Г. Культурные связи Беларуси со странами Центральной и Западной Европы (1945–1990 гг.). – Мн., 2000.

Шалькевич В.Ф. Кастусь Калиновский: Страницы биографии. – Мн., 1988.

Швед В.В. Беларускія старонкі дзекабрыстаў. – Мн., 1998.

Швед В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863). – Гродна, 2001.

Янушкевіч Я. Неадменны сакратар адраджэння: Вацлаў Ластоўскі. – Мн., 1995.

Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: А.А. Воінаў [і інш.]. – Мн., 1993.

Асветнікі зямлі беларускай: Энцыкл. давед. – Мн., 2001.

Беларуская Савецкая Энцыклапедыя: у 12 т. – Мн., 1969–1975. – Т. 1–2.

Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мн., 1996–2002. – Т. 1–14.

Беларуская ССР: Кароткая энцыклапедыя. – Мн., 1976–1981. – Т. 1–5.

Беларусь: Энцыкл. давед. – Мн., 1995.

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941–1945). Энцыкл. – Мн., 1990.

Бібліяграфія па гісторыі Беларусі: Феадалізм і капіталізм. – Мн., 1969.

Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. давед. – Мн., 2000. – Т. 1–6.

Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі: Ад старажытнасці да пачатку XX ст. – Мн., 1995.

История Беларуси: сл.-справ. – Мн., 2000.

Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыкл. давед. – Мн., 1995.

Ф. Скарына і яго час: энцыкл. давед. – Мн., 1988.

Храналогія гісторыі Беларусі. – Мн., 1992.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2001.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мн., 1982–1987.

Этнаграфія Беларусі: энцыкл. – Мн.

# ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ ПА КУРСУ "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ" З МЕТАДЫЧНЫМІ ПАРАДАМІ І ТЭКСТАВЫМІ ЗАДАННЯМІ

## II курс, 3–4 семестры

### Тэма 1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў п.п. ХІХ ст.

1. *Сельская гаспадарка і спробы рэфармавання феадальных адносін на вёсцы.*
2. *Прамысловасць. Шляхі зносін. Гандаль.*
3. *Гарады і мястэчкі на Беларусі.*
4. *Станы-саслоўі на Беларусі.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы*: рэформа, інвентары, люстрацыя, аброк, чынш, паншчына, памешчыкі, сяляне, латыфундыі, дзесяціна, трохпольная сістэма, феадальна-прыгонніцкая сістэма, "смык", Беларускае вольнае эканамічнае таварыства, сервітут, "месячнікі", падворнае землекарыстанне, абшчыннае землекарыстанне, дробна-таварная вытворчасць, мануфактура, фабрыка, паўперызацыя, вотчынная прамысловасць, прапінацыя, Хомск, Косава, прамысловы пераварот, "гасцінцы", Зэльва, адыходныя промыслы, дваране, мяшчане, разначынцы, ганаровыя грамадзяне, рэкруцкая павіннасць, "разбор шляхты", кагалы.

*Асобы:* Радзівілы, Вітгенштэйны, Румянцавы, Паскевіч, Кісялёў, Скірмунт, Пуслоўскі.

*Храналогія:* стварэнне і дзейнасць ў Віцебску вольнага эканамічнага таварыства, стварэнне ў Горы-Горках земляробчага інстытута, з'яўленне першых фабрык на Беларусі, пачатак рэформы ў дзяржаўнай вёсцы на Беларусі, пачатак інвентарнай рэформы.

**Крыніцы:**

1. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Мн., 1977.
2. Белоруссия в эпоху феодализма. – Мн., 1979. – Т. 4.

**Літаратура абавязковая:**

1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: ХІХ –ХХ стагоддзі.

Репозиторий ВГУ

2. Гісторыя Беларусі: у 6-ці т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.).
3. Гісторыя Беларусі: з 1795 да вясны 1917 г.: вучэбны дапаможнік / І.І. Коўкель [і інш.]. – Мн., 2001.
4. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1994. – Ч. 1.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6-ці т.– Мн., 1993–2003. – Т. 1–6; Т. 6, кн. 1–2.

**Літаратура дадатковая:**

1. Болбас М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.). – Мн., 1966.
2. Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. / пад рэд. В.І. Мялешкі [і інш.]. – Мн., 1997. – Т. 1: Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г.
3. Луговцова С.Л. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII–XİX вв. – Мн., 1997.
4. Люты А.М., Туміловіч Т.М. Дваранства Беларусі ў перыяд разлажэння і крызісу феадалізму (канец XVIII – першая палова XIX ст.): вучэб.-метад. дапам. – Мн., 1991.
5. Лютый А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века / под ред. В.В. Чепко. – Мн., 1987.
6. Сосна У.А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. – Мн., 2000.
7. Сосна У.А. Царскія падараванні сялян на Беларусі і іх сацыяльна-палітычныя наступствы // Бел. гіст. часопіс. – 1999. – № 2. – С. 14–18.
8. Чепко В.В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века. – Мн., 1966.
9. Экономическая история Беларуси: учебн. пособие: – 3-е изд. доп. / под ред. проф. В.И. Голубовича. – Мн., 2004.

У першым пытанні ахарактарызуйце становішча памешчыцкай і сялянскай гаспадаркі на Беларусі. Вызначце асаблівасці развіцця с.г. Беларусі ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Р.І. Звярніце ўвагу на працэсы, якія садзейнічалі развіццю вёскі і тыя, якія тармазілі яго. Прадэманструйце спробы рэфармавання с.г. у першай палове XIX ст. і іх вынікі. Дакажыце неабходнасць адмены прыгоннага права.

У другім пытанні ахарактарызуйце агульны стан прамысловасці на Беларусі. Вызначце яе асаблівасці. Пакажыце працэс зараджэння фабрычнай вытворчасці і яе спецыфіку на беларускіх землях. Параўнайце ўзровень прамысловага развіцця Беларусі  і рэгіёнаў РІ, а таксама краін Еўропы. Назавіце і ахарактарызуйце асноўныя шляхі зносін.



Репозиторий ВГУ

Прадэманструйце іх уплыў на развіццё эканомікі краю. Чым характарызаваўся гандаль на Беларусі? Якія тавары вывозіліся і што ўвозілі на тэрыторыю нашага краю? Наколькі шырокім было прадстаўніцтва беларусаў сярод асоб, што займаліся гандлёвымі аперацыямі?

Якім быў агульны стан гарадоў на Беларусі? У чым іх спецыфіка? Якія з беларускіх гарадоў мелі найбольшыя перспектывы для далейшага развіцця і чаму? Наколькі істотным быў уклад гарадоў у эканоміку Беларусі? Якія тры віды гарадоў існавалі на Беларусі ў азначаны час? Якая роля сярод гарадоў на Беларусі належала Віцебску?

На гэтым Вы павінны спыніцца, разглядаючы трэцяе пытанне плану.

У апошнім пытанні спыніцеся на аналізе становішча асноўных станаў-саслоўя на Беларусі: шляхты-дваранства, мяшчан, сялянства. Параўнайце правы і абавязкі вызначаных станаў у РП і PI. Растлумачце сутнасць паняцця “разбор шляхты”. Ахарактарызуйце месца і значэнне ў сацыяльнай структуры грамадства “разначынцаў” і “ганаровых грамадзян”.

**Тэсты для самакантролю:**

**1. У першай палове XIX ст. сельская гаспадарка на Беларусі была арыентавана на вытворчасць перш за ўсё:**

1) бульбы;
2) зерне;
3) прадукцыі жывёлагадоўлі;
4) прылад працы.

**2. Галоўнай прычынай крызісу сельскай гаспадаркі ў п.п. XIX ст. з’яўлялася:**

1) адсутнасць грошай у сялян;
2) прыгоннае права;
3) адсутнасць грошай у памешчыкаў;
4) сусветны эканамічны крызіс.

**3. Большасць сялян у п.п. XIX ст. адносілася да катэгорыі:**

1) дзяржаўных;
2) прыватнаўласніцкіх;
3) вольных;
4) купецкіх.

**4. У канцы XVIII – пачатку XIX ст. большасць прыватнаўласніцкіх сялян на Беларусі:**

1) выплачвалі сваім уладальнікам грашовы аброк;
2) натуральны;
3) змешаны;
4) выконвалі паншчыну.



Репозиторий ВГУ

**5. Большую частку памешчыкаў на Беларусі ў п.п. XIX ст. складалі:**

1) дробныя;
2) буйныя;
3) сярэднія;
4) казённыя.

**6. Большасць памешчыцкай зямлі на Беларусі знаходзілася ва ўладанні:**

1) дробных памешчыкаў;
2) буйных памешчыкаў;
3) сярэдніх;
4) казённых.

**7. Аснову гаспадаркі памешчыкаў у п.п. XIX ст. складала:**

1) жывёлагадоўля;
2) земляробства;
3) вінакурэнне;
4) вытворчасць будаўнічых матэрыялаў.

**8. У сярэдзіне XIX ст. большасць прыватнаўласніцкіх сялян на Беларусі:**

1) выплачвалі сваім уладальнікам грашовы аброк;
2) натуральны;
3) змешаны;
4) выконвалі паншчыну.

**9. Танкарунная авечкагадоўля на Беларусі была найбольш развіта ў п.п. XIX ст. у гаспадарках памешчыкаў:**

1) Гродзенскай губерніі;
2) Мінскай губерніі;
3) Магілёўскай;
4) Віцебскай.

**10. Асноўная сістэма земляробства ў п.п. XIX ст.:**

1) двухполле;
2) трохполле;
3) шматполле;
4) трохполле і шматполле.

**11. Асноўныя сялянскія павіннасці ў п.п. XIX ст.:**

1) грашовы аброк;
2) паншчына;
3) будаўніцтва дарог;
4) праца на панскім агародзе.

**12. Вотчыннымі прадпрыемствамі валодалі:**

1) купцы;
2) памешчыкі;
3) мяшчане;
4) дзяржава.



Репозиторий ВГУ

**13. Большую канкурэнтную здольнасць у п.п. XIX ст. праяўлялі прадпрыемствы, якімі валодалі:**

1) купцы;
2) памешчыкі;
3) мяшчане;
4) сяляне.

**14. Станаўленне капіталістычнай прамысловасці завяршаецца:**

1) выкарыстаннем машын з паравымі рухавікамі;
2) пачаткам мануфактурнай вытворчасці;
3) пачаткам працы дробнакапіталістычнай вытворчасці;
4) знікненнем апошняй рамеснай майстэрні.

**15. Суконныя фабрыкі ў мястэчках Хомск і Косава належалі:**

1) Скірмунту;
2) Пуслоўскаму;
3) Паскевічу;
4) Вітгенштэйну.

**16. У першай палове XIX ст. большасць прадпрыемстваў на Беларусі па характару вытворчасці адносіліся:**

1) да капіталістычнага ўкладу;
2) да феадальнага;
3) сацыялістычнага;
4) капіталістычна-феадальнага.

**17. Па кошту прадукцыі на першым месцы ў п.п. XIX ст. на Беларусі знаходзілася:**

1) харчовая прамысловасць;
2) тэкстыльная;
3) дрэваапрацоўчая;
4) гарбарная.

**18. Шаша Масква–Варшава прайшла на Беларусі праз губерніі:**

1) Магілёўскую;
2) Віцебскую;
3) Брэсцкую;
4) Гродзенскую.

**19. Самы буйны кірмаш у п.п. XIX ст. на Беларусі гэта:**

1) Любавіцкі;
2) Зэльвенскі;
3) Троіцкі;
4) Асвейскі.

**20. У гандлі на Беларусі ў п.п. XIX ст. назіралася тэндэнцыя:**

1) да павелічэння ролі кірмашоў;
2) да павелічэння ролі крамнага гандлю;



Репозиторий ВГУ

3) да скарачэння ролі крамнага гандлю;
4) да скарачэння ролі кірмашоў.

**21. Асноўная частка гарадскіх расходаў на Беларусі ў п.п. XIX ст. накіроўвалася на:**
1) адукацыю;
2) ахову здароўя;
3) утрыманне царскіх чыноўнікаў;
4) на утрыманне паліцыі і вайсковых гарнізонаў.

**22. Рэфармаванне дзяржаўнай вёскі арганізаваў і праводзіў:**
1) Кісялёў;
2) Бенкендорф;
3) Пацёмкін;
4) Куракін.

**23. Мэтай рэфармавання дзяржаўнай вёскі было:**
1) павышэнне велічыні паншчыны;
2) павелічэнне даходнасці дзяржаўных маёнткаў;
3) павелічэнне колькасці агароднікаў у беларускай вёсцы;
4) надзяленне зямлёй яўрэяў у "межах яўрэйскай аселасці".

**24. Рэформа дзяржаўнай вёскі прадугледжвала:**
1) падрабязнае апісанне дзяржаўных маёнткаў;
2) рост павіннасцей дзяржаўных сялян;
3) строгае вызначэнне павіннасцей дзяржаўных сялян;
4) ліквідацыя аброку, як формы павіннасці сялян.

**25. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| 1) Бярэзінскі канал; | А) Дняпра і Нёмана; |
| 2) Днепра-Бугскі; | Б) Нёмана і Віслы; |
| 3) Аўгустоўскі; | В) Дняпра і Віслы; |
| 4) Агінскага; | Г) Дняпра і Заходняй Дзвіны; |
| | Д) Нёмана і Заходняй Дзвіны. |

### Устаўце прапушчанае:

26. Нормы павіннасцей сялян у адпаведнасці з велічынёй іх зямельных надзелаў запісваліся ў спецыяльных дакументах, якія называліся ... ?

27. Прамысловыя прадпрыемствы, заснаваныя на ручной вытворчасці з падзелам працы па аперацыях называюцца ... ?

28. Беларускі памешчык, які першым на тэрыторыі нашага краю атрымаў аўтарскае пасведчанне РІ "за ўдасканаленне спосабу выпарвання цукровага сіропу", гэта ... (прозвішча).

29. Найбольш тэхнічна дасканалай у першай палове XIX ст. на Çеларусі была ...? (якая) водная сістэма.

30. Беларускае вольнае эканамічнае таварыства было створана ў горадзе ...? у ...? годзе.



Рэпазіторый ВГУ

## Тэма 2. Вайна 1812 года на Беларусі

1. *Беларусь у планах варагуючых бакоў.*
2. *Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў чэрвені–жніўні 1812 г.*
3. *Беларусь у перыяд французскай акупацыі.*
4. *Баявыя дзеянні ў верасні–лістападзе. Вынікі вайны для Беларусі.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* рэквізіцыя, Тыльзіцкі мірны дагавор, Княства (Герцагства) Варшаўскае, секвестр, “план Агінскага”, Камісія Часовага ўрада ВКЛ, Ухалоды, Студзёнка, Жарцы.

*Асобы:* Дамінік Радзівіл, М.К. Агінскі, Ф.К. Любецкі, Л. Плятэр, М.Б. Барклай дэ Толі, П.І. Баграціён, А.П. Тармасаў, С. Солтан, Ф. Міронава.

*Храналогія:* стварэнне Княства Варшаўскага, пачатак вайны Францыі і РІ, стварэнне Камісіі Часовага ўрада ВКЛ, выгнанне Напалеона з Беларусі.

**Крыніцы:**


1. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времён до 1917 г. – Мн., 1977.
2. Белоруссия в эпоху феодализма. – Мн., 1979. – Т. 4.


**Літаратура абавязковая:**


1. Гісторыя Беларусі: у 2 ч.: курс лекцый / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX –XX стагоддзі.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.)
3. Гісторыя Беларусі: з 1795 да вясны 1917 г.: вучэбны дапаможнік / І.І. Коўкель [і інш.]. – Мн., 2001.
4. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1994. – Ч. 1.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2003. – Т. 1–6; Т. 6, кн. 1–2.


**Літаратура дадатковая:**


1. Арлоў У.А. Таямніцы полацкай гісторыі. – Мн., 1994.
2. Літвінскі А. У плыні сцюдзёнай Бярэзіны // Спадчына. – 1993. – № 5–6. – С. 43–45.
3. Ліс Я. Палітыка Напалеона на Беларусі // Спадчына. – 1996. – № 5. – С. 117–122.
4. Лукашэвіч А.М. Беларусь напярэдадні і ў час вайны 1812 г. – Мн., 2004.


Репозиторий ВГУ

5. Корнейчик Е.И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 г. – Мн., 1962.
6. Французска-руская вайна 1812 г.: еўрапейскія дыскурсы і беларускі погляд. – Мн., 2003.

У першым пытанні прааналізуйце палітычныя і ваенныя планы РІ і Францыі ў дачыненні да Беларусі. Спыніцеся на захадах РІ і Францыі па прыцягненню на свой бок насельніцтва Беларусі. Пакажыце рэакцыю мясцовага насельніцтва на такія крокі варагуючых бакоў.

У другім пытанні ахарактарызуйце ход ваенных дзеянняў на Беларусі на першым этапе вайны: месцы баёў, ход, вынікі. Вызначце ступень удзелу ў ваенных дзеяннях, на баку абодвух варагуючых лагераў, выхадцаў з Беларусі.

У трэцім пытанні вызначце адміністацыйна-тэрытарыяльны падзел, які быў праведзены французскімі ўладамі на Беларусі. Пакажыце, якімі мэтамі кіраваліся французы, ствараючы Часовую камісію ўрада ВКЛ. Прадэманструйце рэакцыю розных сацыяльных катэгорый насельніцтва на палітыку акупацыйных французскіх улад.

У заключным пытанні спыніцеся на аналізе хода ваенных дзеянняў на апошнім этапе вайны. Прааналізуйце важнейшыя бітвы гэтага перыяду. Сфармулюйце прычыны поспехаў рускіх войскаў і няўдач французаў. Пакажыце рэакцыю расійскага ўрада на здраду яму мясцовых памешчыкаў. Вызначце наступствы вайны для падатковай часткі насельніцтва на Беларусі.

## Тэсты для самакантролю

**1. Французскія войскі перапраўляліся цераз р. Бярэзіну:**
1) 14–16 жніўня 1812 г.;
2) 14–16 верасня 1812 г.;
3) 14–16 лістапада 1812 г.;
4) 14–16 снежня 1812 г.

**2. У час вайны 1812 г. для перакрыцця французам шляху на Пецярбург быў пакінуты каля Полацка 25-тысячны корпус генерала:**
1) М. Раеўскага;
2) Я. Кульнёва;
3) П. Чычагова;
4) П. Вітгенштэйна.

**3. Штаб першай расійскай арміі ў пачатку вайны з Напалеонам Банапартам знаходзіўся ў:**
1) Ваўкавыску;



Репозиторий ВГУ

2) Луцку;
3) Мінску;
4) Вільні.

**4. Другую расійскую армію ў час вайны 1812 г. узначальваў:**
1) М. Кутузаў;
2) М. Барклай дэ Толі;
3) П. Баграціён;
4) А. Тормасаў.

**5. Напярэдадні вайны 1812 г. штаб другой расійскай арміі знаходзіўся ў:**
1) у Ваўкавыску;
2) Вільні;
3) Мінску;
4) Бабруйску.

**6. 12 чэрвеня 1812 г. армія Напалеона пераправілася цераз раку ... і ўступіла на тэрыторыю РІ.**

**7. Войскі Напалеона Банапарта 16 чэрвеня 1812 г. занялі горад:**
1) Мінск;
2) Смаленск;
3) Віцебск;
4) Вільню.

**8. Войскі Напалеона Банапарта ўступілі на тэрыторыю РІ:**
1) 12 чэрвеня 1812 г.;
2) 1 ліпеня 1812 г.;
3) 13 ліпеня 1812 г.;
4) 12 жніўня 1812г.

**9. Першая ў Расіі жанчына-афіцэр, удзельніца вайны 1812 года – гэта ... (прозвішча).**

**10. Партызанскі атрад жыхароў в. Жарцы Полацкага павета ў час вайны 1812 г. узначальваў(лі):**
1) Ф. Савіч;
2) Т. Барысенка;
3) Д. Давыдаў;
4) Л. Грушын.

**11. Праект "Палажэння аб праўленні аўтаномным ВКЛ" склалі:**
1) М.К. Агінскі;
2) Ф.К. Любецкі;
3) Д. Радзівіл;
4) Я.П. Кульнёў.



Репозиторий ВГУ

**12. Разгром напалеонаўскіх войскаў на р. Бярэзіне падчас пераправы каля в. Студзёнка адбыўся ў:**

1) жніўні 1812 г.;

2) лістападзе;

3) кастрычніку;

4) снежні.

**13. За ўдзел у барацьбе з Напалеонам Банапартам у 1819 г. урад выкупіў з прыгоны сялян вёскі ... .**

**14. У бітве пад Клясціцамі вызначыўся генерал-маёр расійскай арміі ... (прозвішча).**

**15. 19 чэрвеня (1 ліпня) 1812 г. у Вільні была(лі) створана(ы):**

1) беларуска-літоўскае войска;

2) Часовая камісія ўрада ВКЛ;

3) гарадскі магістрат;

4) Вышэйшая Літоўская Рада.

**16. У чэрвені–ліпені 1812 г. баі расійскай арміі з французамі адбыліся на Беларусі каля:**

1) Гомеля;

2) Кобрына;

3) Міра;

4) Полацка.

**17. Першым урачыста ўступіў у Вільню 16 чэрвеня 1812 г. уланскі полк пад камандаваннем:**

1) М.К. Агінскага;

2) Д. Радзівіла;

3) П. Сапегі;

4) Г. Храбтовіча.

**18. На тэрыторыі Беларусі войска Напалеона Банапарта панесла самыя значныя страты пад:**

1) Кобрынам;

2) в. Ухалоды;

3) в. Студзёнка;

4) Полацкам.

**19. Партызанскім атрадам, які складаўся з сялян в. Жарцы, камандаваў ...?(прозвішча).**

**20. З мэтай не дапусціць падтрымкі Напалеона памешчыкамі заходніх губерній заявіў аб намеры аднавіць ВКЛ:**

1) М.К. Агінскі;

2) Ф.К. Любецкі;

3) Аляксандр I;

4) Л. Плятэр.

Репозиторий ВГУ

**21. У чэрвені–ліпені 1812 г. адбыліся баі каля:**

1) Астроўна;
2) Салтанаўкі;
3) Мазыра;
4) Клясціц.

**22. Рускія арміі ў 1812 г. змаглі аб'яднацца пад ... (горад).**

**23. Пад Салтанаўкай, разам з сынамі, здзейсніў подзвіг расійскі генерал... (прозвішча).**

**24. Асноўныя патрабаванні, якія выставіў Напалеон да ўрада ВКЛ, – гэта:**

1) забеспячэнне французскай арміі рэкрутамі;
2) правіянтам і фуражом;
3) ліквідаваць прыгоннае права ў ВКЛ;
4) аб'яднацца у федэрацыю з Польшчай.

**25. Разам з пецярбургскімі і ноўгародскімі апалчэнцамі ў бітве за Полацк удзельнічалі сяляне беларускай вёскі ... .**

**26. Больш за 20 тыс. салдат страціў Напалеон на Беларусі ў бітве каля вёскі ... .**

**27. Ці правільна, што ў перамогу Расіі ў вайне 1812 г. зрабілі ўклад: а) салдаты-рэкруты з беларускіх губерняў: б) беларускія сяляне-партызаны:**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) два сцвярджэнні правільныя;
4) два сцвярджэнні няправільныя.

**28. Ці правільна, што ўсе сяляне, які ўдзельнічалі ў барацьбе супраць Напалеона:** а) былі вызвалены з пад прыгону; б) узнагароджаны медалямі:

1) правільна а);
2) правільна б);
3) абодва сцвярджэнні правільныя;
4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

## Тэма 3. Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.

1. *Гістарычныя ўмовы развіцця культуры на Беларусі.*
2. *Асвета і навука на Беларусі.*
3. *Літаратура, перыядычны друк.*
4. *Архітэктура, жывапіс і асаблівасці іх развіцця на Беларусі.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы.* Віленская навучальная акруга, класіцызм, рамантызм, паланізацыя, русіфікацыя, царкоўна-прыходскае вучылішча, павятовае вучылішча, гімназія, "Рабункі



Рэпазіторый ВГУ

мужыкоў”, “Вечарніцы”, “Гапон”, “Пінская шляхта”, “Беларускае вяселле”, “Групавы партрэт”, “А. Міцкевіч на скале Аюдаг”, “Мір”, “Нясвіж”, “Хрышчэнне славян”, “Возера Свіцязь”, “Кветкі і садавіна”, “Жняя”, Залессе, Шчорсы, “Беларускі архіў старажытных актаў”, “Падарожжа па Палессі і беларускім краі”, “Дзяды”, “Пан Тадэвуш”, “Гражына”, “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”.

*Асобы:* Чартарыйскі Адам, Міцкевіч Адам, Манюшка Станіслаў, Абрамовіч Антон, Даленга-Хадакоўскі З.Я., Чачот Ян, Багрым Паўлюк, Дунін-Марцінкевіч Вінцэнт, Сыракомля Уладзіслаў, Баршчэўскі Ян, Дамель Ян, Валенцій Ванькові ч, Аляшкевіч Іосіф, Хруцкі Іван, Дмахоўскі Вікенцій, Орда Напалеон, Русецкі Канут, Сямашка Іосіф, Нарбут Тэадор, Тышкевічы Яўстафій і Канстанцін, Кіркор Адам, Шпілеўскі Павел, Ельскі Міхаіл, Грыгаровіч Іван, Баброўскі Міхаіл, Цютчаў І., Шмідт К., Смуглевіч Ф., Ельскі Караль.

*Храналогія:* ліквідацыя уніяцкай царквы на Беларусі, адкрыццё і спыненне дзейнасці Віленскага універсітэта, заснаванне езуіцкай акадэміі ў Полацку, пачатак працы Горы-Горацкага земляробчага інстытута, першая пастаноўка ў Мінску “Сялянкі”, стварэнне ў Віцебску настаўніцкай семінарыі.

**Крыніцы:**


1. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Мн., 1977.
2. Белоруссия в эпоху феодализма. – Мн., 1979. – Т. 4.


**Літаратура абавязковая:**


1. Гісторыя Беларусі: у 2 ч.: курс лекцый / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX –XX стагоддзі.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.).
3. Гісторыя Беларусі: з 1795 да вясны 1917 г.: вучэбны дапаможнік / І.І. Коўкель [і інш.]. – Мн., 2001.
4. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1994. – Ч. 1.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2003. – Т. 1–6; Т. 6, кн. 1–2.


**Літаратура дадатковая:**


1. Арлоў У.А. Таямніцы полацкай гісторыі. – Мн., 1994.
2. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі са старажытных часоў да 1917 г. / пад рэд. М.А. Лазарука. – Мн., 1983.




Репозиторий ВГУ

3. Асветнікі зямлі беларускай: энцыкл. даведнік / рэд.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн., 2001.
4. Дробов Л.Н. Живопись Белоруссии XIX – начала XX века. – Мн., 1974.
5. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн., 1996.
6. Парашкоў С.А. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн., 2003.

У першым пытанні сфармулюйце асноўныя гістарычныя ўмовы развіцця культуры на Беларусі ў першай палове XIX ст. і пакажыце іх уплыў на станаўленне мовы, літаратуры, мастацтва. Вызначце станоўчыя і адмоўныя бакі ўплыву на культурнае асяроддзе факта ўваходжання беларускіх зямель у склад РІ. Растлумачце сутнасць працэсаў паланізацыі і русіфікацыі. Звярніце ўвагу на геаграфічнае становішча Беларусі і яго ўплыў на станаўленне культуры.

У другім пытанні прасачыце стварэнне сістэмы адукацыі ў РІ і асаблівасці яе развіцця на Беларусі. Пакажыце дзейнасць асноўных структурных адзінак гэтай сістэмы: прыходскіх і павятовых вучылішчаў, гімназій, ВНУ. Звярніце ўвагу на дасягненні і недахопы ў сістэме адукацыі. Дакажыце ці абвергніце саслоўны характар адукацыі і яе маладаступнасць для ніжэйшых саслоўяў.

У трэцім пытанні звярніце ўвагу на асноўныя мастацкія стылі ў літаратуры і іх асаблівасці. Пакажыце дзейнасць асноўных прадстаўнікоў літаратуры на Беларусі ў першай палове XIX ст. Звярніце ўвагу на якой мове ствралася большасць літаратурных твораў у гэты перыяд. Ці можна сцвярджаць, што ў першай палове XIX ст. пачаўся працэс стварэння новай беларускай літаратуры? Які характар меў перыядычны друк у гэты час? Наколькі ён быў беларускім і якую меў аўдыторыю?

У чацвёртым пытанні пакажыце асноўныя моманты і асаблівасці станаўлення архітэктуры ў азначаны час. Якія змены і чаму адбыліся ў першай палове XIX ст. ў архітэктурным выглядзе беларускіх гарадоў? Дзе можна было атрымаць навыкі архітэктара ў той час? Наколькі ў тагачаснай архітэктуры важкімі былі мясцовыя традыцыі? Пакажыце творчасць асноўных прадстаўнікоў жывапісу на Беларусі ў гэты час. Ці прасочваюцца ў іх творах нацыянальныя матывы? Ці ёсць у Віцебскім мастацкім музеі іх творы?

## Тэсты для самакантролю

**1. Аўтарам твора “Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” з’яўляецца:**

1) А. Міцкевіч;
2) П. Багрым;
3) У. Сыракомля;
4) Я. Баршчэўскі.



Репозиторий ВГУ

**2. Новы напрамак у культуры Беларусі, што ўзнік прыкладна з 10-х гг. XIX ст. і для якога былі характэрны перавага духоўнага пачатку над розумам, зварот да гістарычнага мінулага, ідэі народнасці і каштоўнасці нацыянальных традыцый, – гэта ... .**

**3. Беларускі кампазітар, які пісаў музыку на аснове народных песень і танцаў, аўтар музычнай паэмы "Беларускае вяселле," – гэта:**

1) Д. Стафановіч;
2) С. Манюшка;
3) М. Агінскі;
4) А. Абрамовіч.

**4. Паэт і фальклярыст першай паловы XIX ст., які выдаў 6 зборнікаў "Вясковых песень", – гэта:**

1) Я. Чачот;
2) А. Міцкевіч;
3) В. Равінскі;
4) У. Сыракомля.

**5. Да ананімных твораў першай паловы XIX ст. належыць(аць):**

1) "Зайграй, зайграй, хлопча малы..."; 
2) "Сялянка";
3) "Прамова Мялешкі";
4) "Гутарка Данілы са Сцяпанам".

**6. Найбольш значная культавая пабудова класіцызму ў Беларусі – Петрапаўлаўскі сабор – была ўзведзена ў:**

1) Мінску;
2) Гродне;
3) Гомелі;
4) Магілёве.

**7. Верагодным аўтарам "Энеіды навыварат" лічаць:**

1) Равінскага;
2) Вераніцына;
3) Баршчэўскага;
4) Чачота.

**8. Выдатны майстар нацюрмортаў, партрэтыст, які атрымаў званне акадэміка, – гэта:**

1) Н. Орда;
2) В. Дмахоўскі;
3) В. Ваньковіч ;
4) І. Хруцкі.

Репозиторий ВГУ

**9. Ураджэнец Беларусі, “бацька” польскай класічнай оперы, аўтар музыкі да сцэнічных твораў В.Дуніна-Марцінкевіча, – гэта:**

1) М. Агінскі;

2) Д. Стафановіч;

3) С. Манюшка;

4) А. Абрамовіч

**10. Паэт-селянін, аўтар верша “Зайграй, зайграй, хлопча малы”, – гэта ... .**

**11. Віленскі ўніверсітэт быў адкрыты ў ... годзе.**

**12. В. Ваньковіч, які працаваў у жанры гістарычнага жывапісу, напісаў карціну(ы):**

1) “Вызваленне Т. Касцюшкі з цямніцы”;

2) “Хрышчэнне славян”;

3) “Напалеон каля вогнішча”;

4) “А. Міцкевіч на скале Аюдаг”.

**13. Асноўнай мовай навучання ў Віленскай навучальнай акрузе ў п.п. XIX ст. прызначалася:**

1) старабеларуская;

2) руская;

3) польская;

4) літоўская.

**14. Князь А. Чартарыйскі займаў пасаду ў 10–20-я гг. XIX ст.:**

1) прафесара Віленскага універсітэта;

2) Літоўскага генерал-губернатара;

3) Гродзенскага губернатара;

4) папячыцеля Веленскай вучэбнай акругі.

**15. Аўтарам нарысаў “Падарожжа па Палессі і Беларускім краі” і “Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках” з’яўляецца:**

1) П. Шпілеўскі;

2) Я. Тышкевіч;

3) А. Кіркор;

4) П. Баброўскі.

**16. Найбольш значнай навучальнай установай каталіцкай царквы на тэрыторыі РІ ў 1812–1820 гг. была(ў):**

1) Духоўная рымска-каталіцкая акадэмія ў Вільні;

2) Віленскі універсітэт;

3) Галоўная віленскай школа;

4) Полацкая езуіцкая акадэмія.

Репозиторий ВГУ

**17. Заснавальнік рэалізму ў пейзажным жывапісе Беларусі ў п.п. XIX ст., аўтар карцін “Возера Свіцязь”, “Дом Міцкевіча ў Навагрудку”:**

1) В. Дмахоўскі;
2) М. Кулеш;
3) І. Аляшкевіч;
4) Н. Орда.

**18. Заснавальнік(і) Віленскага музея старажытнасцей – гэта:**

1) Я. Тышкевіч;
2) Т. Нарбут;
3) А. Кіркор;
4) А. Баброўскі.

**19. Музыку да п’есы “Рэкруцкі яўрэйскі набор” напісалі С. Манюшка і:**

1) К. Кжыжаноўскі;
2) А. Абрамовіч;
3) Д. Стэфановіч;
4) В. Стэфановіч.

**20. Першы папячыцель Віленскай навучальнай акругі, – гэта:**

1) А. Чартарыйскі;
2) М. Навасільцаў;
3) І. Лялевель;
4) Я. Снядэцкі.

**21. Прыгонны тэатр у Ружанах належаў:**

1) Тышкевічам;
2) Агінскім;
3) Радзівілам;
4) Сапегам.

**22. Жанр жывапісу, у якім напісана карціна Я.Дамеля “Вызваленне Т.Касцюшкі з цямніцы”, – гэта ... .**

**23. Ганаровым членам Пецярбургскай і Стакгольмскай акадэмій навук быў:**

1) А. Міцкевіч;
2) У. Сыракомля;
3) Т. Зан;
4) Я. Тышкевіч.

**24. Найбольш значнай пабудовай эпохі класіцызму ў Беларусі з’яўляўся створаны ў 1809–1819 гг.:**

1) Мінскі гарадскі тэатр;
2) Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі;
3) палац Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі;
4) будынак Віцебскай гімназіі.



Репозиторий ВГУ

**25. Віленскі музей старажытнасцей быў створаны на аснове ўласнай калекцыі:**

1) К. Тышкевіча;

2) Я. Тышкевіча;

3) П. Шэйна;

4) П. Румянцава.

**26. Аўтарам карцін на гістарычную тэму “Напалеон каля вогнішча”, “А. Міцкевіч на скале Аюдаг” з’яўляецца мастак ... . (прозвішча)**

**27. Творамі Дуніна-Марцінкевіча з’яўляюцца:**

1) “Сялянка”;

2) “Гапон”;

3) “Зайграй, зайграй, хлопча малы...”;

4) “Вясковыя песні”.

**28. У сістэму адукацыі Расіі строга саслоўны прынцып навучання быў уведзены ў … .**

1) 1828 г.;

2) 1830 г.;

3) 1848 г.;

4) 1849 г.

**29. Гомельскі палацава-паркавы комплекс графа П.А. Румянцава з’яўляецца выдатным архітэктурным помнікам, пабудаваным у стылі ...?**

**30. Езуіцкая навучальная ўстанова ў Полацку, – гэта ... .**

## Тэма 4. Буржуазныя рэформы 60–70-х гг. XIX ст.

1. *Адмена прыгоннага права і яе асаблівасці на Беларусі.*
2. *Ваенная, судовая, земская, рэформа гарадского кіравання.*
3. *Рэформы ў галіне адукацыі. Цэнзурная рэформа.*
4. *Контррэформы* на Беларусі.

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы.* Сакрэтны камітэт, губернскія дваранскія камітэты, часоваабавязанае становішча, устаўныя граматы, “Мясцовыя палажэнні”, абшчыннае землекарыстанне, падворнае землекарыстанне, выкупная аперацыя, выкупныя плацяжы, міравыя пасрэднікі, павятовыя міравыя з’езды, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці, сельскія і валасныя праўленні, прысяжныя павераныя, прысяжныя засядацелі, міравыя суды, акруговыя суды, класічныя гімназіі, рэальныя гімназіі, маёмасны цэнз.

*Асобы:* У. Назімаў, Аляксандр II, М. Мураўёў.



Репозиторий ВГУ

*Храналогія:* падпісанне Аляксандрам II дакументаў аб адмене прыгоннага права, спыненне часоваабавязанага становішча сялян на Беларусі, перавод дзяржаўных сялян на абвязковы выкуп зямельных надзелаў, пачатак земскай рэформы ў РІ і Беларусі, пачатак судовай рэформы ў РІ і Беларусі, пачатак гарадской рэформы у РІ і Беларусі, пачатак вайсковай рэформы, пачатак школьнай і цэнзупнай рэформаў, пачатак цэнзурнай рэформы.

**Крыніцы:**


1. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Мн., 1977.
2. Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов. – Мн., 1983. – Т. 1; 1990. – Т. 2.


**Літаратура абавязковая**:


1. Гісторыя Беларусі: у 2 ч.: курс лекцый / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX –XX стагоддзі.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.).
3. Гісторыя Беларусі: з 1795 да вясны 1917 г.: вучэбны дапаможнік / І.І. Коўкель [і інш.]. – Мн., 2001.
4. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1994. – Ч. 1.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2003. – Т. 1–6; Т. 6, кн. 1–2.


**Літаратура дадатковая:**


1. Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму: вучэбн. дапам.: у 5 ч. / склад. А.П. Жытко [і інш.]. – Мн., 2005. – Ч. 1. Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары экaномікі.
2. Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму: вучэбн. дапам.: у 5 ч. / склад. А.П. Жытко [і інш.]. – Мн., 2007. – Ч. 2. Актуальныя праблемы аграрнай гісторыі.
3. Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. / пад рэд. В.П. Панюціча. – Мн., 2002. – Т. 2: Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г.
4. Экономическая история Беларуси: учебн. пособие / под ред. проф. В.И. Голубовича. – 3-е изд. доп. – Мн., 2004.


Адказваючы на першае пытанне растлумачце прычыны, якія вымусілі расійскі ўрад пайсці на адмену прыгоннага права. Вызначце на падставе якіх дакументаў адмяняўся прыгон. Растлумачце сам

Репозиторий ВГУ

працэс адмены прыгоннага права і пакажыце яго асаблівасці на Беларусі. У заключэнні сфармулюйце вынікі і значэнне факта адмены прыгоннага стану сялян на Беларусі.

У другім пытанні вызначце сутнасць ваеннай, судовай, земскай і рэформы гарадскога самакіравання. Пакажыце характар гэтых рэформ, спецыфічнасць і асаблівасці рэалізацыі на Беларусі. Ахарактарызуйце іх уплыў на грамадскае развіццё Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

Сутнасць рэформаў у галіне адукацыі і цэнзурнай рэформы Вы павінны прадэманстраваць у трэцім пытанні. Прааналізуйце дзейнасць адукацыйных устаноў, створаных у выніку рэформы, пакажыце велічыню ахопу імі навучэнцаў і вынікі іх працы. Вызначце значэнне цэнзурнай рэформы ў грамадскім жыцці Беларусі.

У чацвёртым пытанні растлумачце прычыны пачатку контррэформ на Беларусі. Пакажыце іх сутнасць. Прааналізуйце асаблівасці контррэформ на Беларусі. Вызначце іх ролю ў тармажэнні працэсу рэформ.

## Тэсты для самакантролю

**1. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

1) адмена прыгоннага права;
2) земская рэформа;
3) судовая рэформа;
4) Сталыпінская аграрная;

А) увядэнне калегіі прысяжных засядацеляў;
Б) атрыманне сялянамі права паступаць на службу ці навучальную ўстанову;
В) ліквідацыя сялянскай абшчыны;
Г) увядзенне мясцовых органаў самакіравання;
Д) увядзенне усеагульнай воінскай павіннасці.

**2. Суаднясіце:**

1) адмена прыгоннага права;
2) земская рэформа;
3) судовая рэформа;
4) ваенная рэформа;

А) выбранне “гласных” у органы самкіравання;
Б) стварэнне выбарных органаў сялянскага самакіравання;
В) адмена рэкруцкай сістэмы судовых устаноў;
Г) стварэнне “нацыянальных” выбарчых курый;
Д) стварэнне агульных для ўсіх саслоўяў.



Репозиторий ВГУ

**3. Суаднясіце:**

1) валасныя праўленні;
2) міравыя суды;
3) акруговыя суды;
4) дваранскія камітэты;

А) вырашэнне судовых спраў у губернях;
Б) рэгуляванне пазямельных адносін сялян;
В) вырашэнне судовых спраў у паветах;
Г) падрыхтоўка праектаў вызвалення сялян;
Д) заключэнне пагадненняў паміж сялянамі і памешчыкамі.

**4.Суаднясіце:**

1) адмена прыгоннага права;
2) ваенная рэформа;
3) контррэформы Аляксандра III;
4) Сталыпінская аграрная рэформа;

А) Указ Мікалая II аб праве выхадзе сялян з абшчыны;
Б) "Мясцовыя палажэнні" Аляксандра II;
В) Указ аб увядзенні усеагульнай воінскай павіннасці;
Г) "Палажэнні аб мерах для аховы дзяржаўнай бяспекі і грамадскага парадку";
Д) Указ аб стварэнні міравых судоў.

**5. Асаблівасцю(ямі) вызвалення сялян у Беларусі пасля паўстання 1863–1864 гг. было(а, лі):**

1) адмена часоваабавязаных адносін;
2) зніжэнне выкупных плацяжоў на 20%;
3) павелічэнне выкупных плацяжоў на 20%;
4) передача памешчыцкай зямлі ў асабістую ўласнасць сялянам.

**6. На тэрыторыі Беларусі, пасля правядзення судовай рэформы РІ, толькі ў 1882 г. з'явіліся:**

1) міравыя пасрэднікі;
2) прысяжныя засядацелі і прысяжныя павераныя;
3) міравыя суды;
4) акруговыя суды.

**7. Суаднясіце:**

1) ваенная рэформа;
2) земская рэформа;
3) судовая рэформа;
4) школьная рэформа;

А) замацаванне прынцыпу пераемнасці і ўсесаслоўнасці;
Б) стварэнне Віленскай ваеннай акругі, у склад якой увайшлі ўсе беларускія губерні;
В) жорсткія абмежаванні на выданні, незалежныя ад урада;
Г) стварэнне "нацыянальных" выбарчых курый;
Д) абвяшчэнне прынцыпу адкрытасці і незалежнасці ад урада.



Репозиторий ВГУ

**8. Згодна з “Агульным палажэннем” рэформы 1861 г. уся зямля, якой карысталіся сяляне, прызнавалася ўласнасцю памешчыкаў, што сведчыла аб:**

1) развіцці капіталізму ў сельскай гаспадарцы па “амерыканскаму” шляху;

2) захаванні залежнасці сялян ад памешчыкаў;

3) развіцці капіталізму ў сельскай гаспадарцы па “прускаму” шляху;

4) скасаванні часоваабавязанага становішча.

**9. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) адмена прыгоннага права; | А) земскія начальнікі; |
| 2) гарадская рэформа; | Б) адрэзкі; |
| 3) “контррэформы”; | В) управы; |
| 4) сталыпінская аграрная; | Г) хутары; |
| | Д) прысяжныя паверанья. |

**10. Сталыпінская аграрная рэформа садзейнічала:**

1) распаду паўфеадальнай зямельнай уласнасці;

2) росту буржуазнай зямельнай уласнасці;

3) росту буйнога памешчыцкага землеўладання;

4) разбурэнню абшчыннай сістэмы землекарыстання.

**11. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) стварэнне выбарных органаў мясцовага кіравання; | А) прадпісанне цара на імя віленскага генерал-губернатара У. Назімава; |
| 2) забарона прымаць у гімназіі дзяцей абслуговага персаналу; | Б) “Палажэнне аб губернскіх і павятовых земскіх установах”; |
| 3) усеўладдзе дзяржаўнай бяспекі; | В) “Палажэнне аб мерах для аховы дзяржаўнай бяспекі і грамадскага спакою”; |
| 4) праект “паляпшэння быту памешчыцкіх сялян”; | Г) “Указ аб кухарчыных дзецях”; |
| | Д) Маніфест 19 лютага 1861 г. |

**12. Выбары ў земскія ўстановы ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях адбываліся па курыях:**

1) “беларускай”;

2) “польскай”;

3) “рускай”;

4) “яўрэйскай”.

**13. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) аграрная рэформа; | А) увядзенне “нацыянальных” выбарчых курый; |
| 2) гарадская рэформа; | Б) стварэнне выбарных органаў сял. самакіраван.; |
| 3) земская рэформа; | |
| 4) школьная рэформа; | |



Репозиторий ВГУ

В) пашырэнне магчымасцей друку;
Г) утварэнне органаў самакіравання на аснове маёмаснага цэнзу;
Д) адмена саслоўных абмежаванняў.

**14. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) дваранскі камітэт; | А) расклад і збор падаткаў з сялян; |
| 2) міравы суд; | Б) падрыхтоўка праектаў вызвалення сялян; |
| 3) земская ўправа; | В) непасрэднае правядзенне рэформы 1861 г.; |
| 4) валаснoе праўленне; | Г) вырашэнне дробных судовых спраў у паветах; |
| | Д) вырашэнне мясцовых пытанняў (гандлю, земляробства, будаўніцтва пачатковых школ). |

**15. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) часоваабавязаныя; | А) складальнікі "ўстаўных грамат"; |
| 2) міравыя пасрэднікі; | Б) прадстаўнікі грамадскасці ў акруговых судах; |
| 3) міравыя суддзі; | В) прадстаўнікі павятовых усесаслоўных судоў, органаў; |
| 4) прысяжныя засядацелі; | Г) сяляне да зацвярджэння ўрадам выкупной здзелкі; |
| | Д) ніжэйшыя паліцэйскія службовыя асобы. |

**16. Карэнныя змяненні становішча сялян пасля рэформы 1861 г. праявіліся ў:**

1) вызваленні сялян з-пад прыгону;
2) атрыманні асабістай свабоды;
3) праве ўласнасці на ўсю зямлю ў маёнтку;
4) права быць абраным у губернскую думу.

**17. Аграрная рэформа пачатку XX ст., у выніку якой сяляне змаглі выйсці з абшчыны, звязана з імем старшыні Савета Міністраў РІ ... (прозвішча).**

**18. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) Маніфест 19 лютага 1861 г.; | А) права сялян пераходзіць у іншыя саслоўі; |
| 2) валасны сялянскі суд; | Б) дробныя грамадзянскія і крымінальныя справы; |
| 3) міравыя пасрэднікі; | В) складанне ўстаўных грамат; |
| 4) сельскія і валасныя праўленні; | Г) раскладка і збор падаткаў; |
| | Д) адказнасць памешчыкаў за выплату сялянамі падаткаў і выкананне павіннасцей на карысць дзяржавы. |



Репозиторий ВГУ

**19. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) курыя; | А) судовая ўстанова ў губерні; |
| 2) акруговы суд; | Б) аб'яднанне выбаршчыкаў; |
| 3) стараста; | В) кіраўнік гарадскога самакіравання; |
| 4) валасны суд; | Г) кіраўнік сельскага самакіравання; |
| | Д) сялянскі суд. |

**20. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) міравы пасрэднік; | А) выбарная ўстанова ў губернях і паветах; |
| 2) управа; | Б) выканаўчы орган гарадскога самакіравання; |
| 3) прысяжны паверанны; | В) чыноўнік, які рэгуляваў пазямельныя адносіны паміж сялянамі і памешчыкамі; |
| 4) устаўная грамата; | Г) нарматыўны акт, які вызначаў пазямельныя адносіны паміж сялянамі і памешчыкамі; |
| | Д) адвакат, які не залежаў ад урада. |

**21. Гродзенскім губернатарам у 1902–1903 гг. з'яўляўся ... (прозвішча).**

**22. Адным з вынікаў паўстання 1863–1864 гг. была(о):**

1) перавага адпрацовачнага тыпу сялянскіх павіннасцей;

2) захаванне часоваабавязанага становішча памешчыцкіх сялян;

3) спыненне часоваабавязанага становішча;

4) палітыка контррэформ.

**23. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

1) выданне двух мясцовых "Палажэнняў" аб аграрнай рэформе;

2) контррэформы Аляксандра III;

3) пачатак рэформы, накіраванай на разбурэнне сялянскай абшчыны;

4) цэнзурная рэформа.

**24. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

1) контрэформы Аляксандра III;

2) рэскрыпт Аляксандра II на імя В. Назімава;

3) "Мясцовае палажэнне" для Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і часткі Віцебскай губерняў;

4) пачатак Сталыпінскай аграрнай рэформы.

**25. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

1) пачатак Сталыпінскай аграрнай рэформы;

2) увядзенне выбарных земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях;

3) пачатак земскай рэформы ў Расіі;

4) заканчэнне ваеннай рэформы ў РІ.



Репозиторий ВГУ

**26. Нарматыўныя акты, у якіх вызначаліся пазямельныя адносіны сялян і памешчыкаў па ўмовах рэформы 1861 г. і складаннем якіх займаліся міравыя пасрэднікі, – гэта ... .**

**27. Назва аграрнай рэформы, якая праводзілася ў пачатку XX ст. і была звязана з разбурэннем сялянскай абшчыны, – гэта ... .**

**28. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) кругавая парука; | А) дазвол сялянам карыстацца пэўнымі ўгоддзямі, што з'яўляліся ўласнасцю памешчыка; |
| 2) "устаўныя граматы"; | Б) абавязак селяніна адбываць паншчыну або плаціць чынш да зацвярджэння ўрадам выкупной здзелкі; |
| 3) "часоваабавязанае становішча"; | В) дакумент, які прапісваў размеркаванне зямлі паміж памешчыкамі і сялянамі, а таксама абавязкі сялян; |
| 4) сервітутнае права; | Г) калектыўная адказнасць, пры якой за селяніна, які не заплаціў падатак, адказвала ўся вёска; |
| | Д) увядзенне прыватнай уласнасці на зямлю. |

**29. "Устаўныя граматы", прынятыя ў ходзе аграрнай рэформы 1861 г., прадугледжвалі:**

1) рэгуляванне зямельных адносін паміж памешчыкамі і сялянамі;

2) ліквідацыю цераспалосіцы;

3) ліквідацыю сялянскай абшчыны;

4) замацаванне сялянскіх абавязкаў перад памешчыкамі.

**30. Спецыяльныя органы, якія былі створаны для непасрэднага правядзення сялянскай рэформы 1861 г., называліся:**

1) павятовыя міравыя з'езды;

2) павятовыя ўстаноўчыя сходы;

3) губернскія па сялянскіх справах установы;

4) валасныя праўленні.

## Тэма 5. Беларусь на шляху капіталістычнага развіцця (60–90-я гг. XIX ст.)

1. *Развіццё беларускай вёскі ва ўмовах капіталістычных адносін.*
2. *Прамысловасць. Транспарт.*
3. *Гарады і гандаль на Беларусі.*
4. *Сацыяльныя змены ў грамадстве.*



Репозиторий ВГУ

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* “прускі” шлях развіцця капіталізму, “амерыканскі” шлях развіцця капіталізму, латыфундыі, цераспалосіца, сервітуты, адпрацовачная сістэма, пралетарыят, буржуазія, стараверы, “вольныя людзі”, пачэсныя грамадзяне.

*Асобы:* І. Шарашэўскі, А. Стульгінскі, М. Эльяшаў.

*Храналогія:* сусветны аграрны крызіс, пачатак дзеяння на Беларусі першага гарадскога водаправода, пачатак электраасвятлення на Беларусі, першы электрычны трамвай на Беларусі, пачатак эксплуатацыі першай чыгункі на Беларусі, акцыянернае таварыства, месца і пачатак дзейнасці першай у РІ фабрыкі акуляраў і аптычных прылад, горад і час пачатку працы першай грамадскай тэлефоннай станцыі на Беларусі.

**Крыніцы:**

1. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Мн., 1977.
2. Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов. – Мн., 1983. – Т. 1; 1990. – Т. 2.

**Літаратура абавязковая:**

1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX –XX стагоддзі.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.).
3. Гісторыя Беларусі: з 1795 да вясны 1917 г.: вучэбны дапаможнік / І.І. Коўкель [і інш.]. – Мн., 2001.
4. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1994. – Ч. 1.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2003. – Т. 1–6; Т. 6, кн. 1–2.

**Літаратура дадатковая:**

1. Бейлькін Х. Некаторыя пытанні развіцця аграрнага капіталізму // Бел. гіст. часопіс. – 1996. – № 1. – С. 71–79.
2. Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии. – Мн., 1978.
3. Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму: вучэбн. дапам: у 5 ч. / склад. А.П. Жытко [і інш.]. – Мн., 2005. – Ч. 1. Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары эканомікі.
4. Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму: вучэбн. дапам.: у 5 ч. / склад. А.П. Жытко [і інш.]. – Мн., 2007. – Ч. 2. Актуальныя праблемы аграрнай гісторыі.

Репозиторий ВГУ

5. Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. / пад рэд. В.П. Панюціча. – Мн., 2002. – Т.2: Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г.
6. Шыбеко З.В. Минск в конце XIX – начале XX в.: Очерк социально-экономического развития. – Мн., 1985, 1994.
7. Экономическая история Беларуси: учебн. пособие / под ред. проф. В.И. Голубовича. – 3-е изд. доп. – Мн., 2004.

У першым пытанні студэнт павінен вызначыць асноўныя накірункі эканамічнага развіцця беларускай вёскі ў парэформенны час. Неабходна таксама паказаць фактары, якія садзейнічалі развіццю аграрнага сектара, і працэсы, якія перашкаджалі яго росту. Ахарактарызуйце асаблівасці развіцця беларускай вёскі. Параўнайце ўзровень развіцця беларускай вёскі і іншых рэгіёнаў РІ, ЗЕ. Паспрабуйце скласці сваю мадэль эканомікі беларускай вёскі другой паловы XIX ст.

Прычыны, што далі штуршок развіццю прамысловасці на Беларусі, Вы павінны вызначыць у другім пытанні. У гэтым жа пытанні неабходна паказаць, якія галіны прамысловасці развіваліся на Беларусі ў азначаны час. Студэнт павінен абаснаваць галіновую структуру прамысловасці і вызначыць асаблівасці яе развіцця. Тут жа Вы павінны ахарактарызаваць становішча транспарту на Беларусі, вызначыць яго асноўныя віды і ўплыў на развіццё эканомікі беларускага краю.

У трэцім пытанні ахарактарызуйце ўрбанізацыйныя працэсы на Беларусі. Вызначце фактары, якія садзейнічалі станаўленню гарадоў на Беларусі. Ахарактарызуйце эканоміку найбольш буйных гарадоў. Пакажыце іх эканамічны вес у гаспадарцы краю, параўнайце іх эканамічны стан з гарадамі іншых рэгіёнаў РІ. Тут жа пакажыце асноўныя працэсы, якія развіваліся ў гандлі на Беларусі. Якія фактары садзейнічалі, а якія перашкаджалі гандлёвым аперацыям на тэрыторыі нашага краю?

У чацвёртым пытанні спыніцеся на аналізе асноўных сацыяльных змен у грамадстве. Ахарактарызуйце асноўныя сацыяльныя катэгорыі насельніцтва, іх стан, уплыў на сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы ў краі, перспектывы развіцця. Пакажыце асаблівасць сацыяльных працэсаў на Беларусі ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі РІ.

## Тэсты для самакантролю

**1. Асаблівасць(і) аграрнай палітыкі расійскага ўрада ў Беларусі ў апошняй трэці XIX ст. праяўлялася(іся) у:**

1) забароне на продаж зямлі “асобам польскага паходжання”;
2) абмежаванні на куплю зямлі беларускімі сялянамі-католікамі;
3) забароне на куплю зямлі яўрэямі;
4) абмежаванні на куплю зямлі беларускім мяшчанам.



Репозиторий ВГУ

**2. Капіталістычныя формы гаспадарання ў парэформеннай вёсцы Беларусі праявіліся ў:**

1) арэндзе памешчыцкай зямлі;

2) адпрацоўках у панскай гаспадарцы;

3) найме сезонных рабочых;

4) інтэнсіўным выкарыстанні машыннай тэхнікі ў с.г.

**3. Прадпрыемства, капітал якога ўтвараецца з грашовых укладаў шэрагу прадпрымальнікаў і існуе ў форме каштоўных папер, што свабодна прадаюцца і купляюцца, называецца ... таварыства.**

**4. Развіццю капіталістычных адносін у вёсцы ў парэформеннай Беларусі садзейнічаў(ла):**

1) распад дваранскай зямельнай уласнасці;

2) канцэнтрацыя зямлі ў руках каталіцкай шляхты і яўрэйскай буржуазіі;

3) пераход да прадпрымальніцкай гаспадаркі пераважна ў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях;

4) пераход да прадпрымальніцкай гаспадаркі пераважна ў Магілёўскай і Віцебскай губернях.

**5. У парэформенны перыяд у сельскай гаспадарцы хутчэй развіваліся капіталістычныя адносіны ў губернях:**

1) Віленскай;

2) Мінскай;

3) Гродзенскай;

4) Віцебскай.

**6. Значнаму ўзмацненню сувязей беларускага рынку з агульнарасійскім і еўрапейскім рынкамі ў 2-й палове XIX ст. спрыяла:**

1) інтэнсіўнае будаўніцтва чыгунак;

2) рост попыту на с/г тэхніку;

3) развіццё дробнатаварнай вытворчасці;

4) аграрны крызіс 80–90-х гг. XIX ст.

**7. Формай аб’яднання прадпрымальнікаў, калі яны дамаўляюцца аб устанаўленні пэўных аб’ёмаў вытворчасці і адзінай цаны на сваю прадукцыю, з’яўляецца ... .**

**8. Сусветны эканамічны крызіс і дэпрэсія на пачатку XX ст. станоўча паўплывалі на развіццё ў Беларусі прамысловасці:**

1) рамеснай;

2) дрэваапрацоўчай;

3) цэнзавай;

4) саматужнай.



Репозиторий ВГУ

**9. Сістэма гаспадарання ў Беларусі другой паловы XIX ст., пры якой перапляталіся капіталістычныя і феадальныя формы, гэта – ... сістэма.**

**10. Для адпрацовак у парэформеннай Беларусі характэрна(ы):**

1) прымітыўныя метады земляробства;
2) выкарыстанне традыцыйных прылад працы;
3) зацікаўленасць сялян у добраякаснай працы;
4) апрацоўка зямлі інвентаром і цяглавай сілай уладальніка.

**11. Прускі шлях развіцця капіталізму ў с.г. выяўляўся ў:**

1) існаванні капіталістычнай арэнды;
2) існаванні сістэмы адпрацовак;
3) развіцці фермерскай сялянскай гаспадаркі;
4) захаванні памешчыцкага землеўладання.

**12. У другой палове XIX ст. характэрнымі тыпамі вядзення памешчыцкай гаспадаркі былі:**

1) адпрацовачны;
2) капіталістычны;
3) змешаны;
4) арэндны.

**13. Права сялян на тэрыторыі Беларусі карыстацца пэўнымі ўгоддзямі, пашай і лесам, што з'яўлялі ўласнасцю памешчыка, – гэта ... права.**

**14. Вызначальнымі рысамі змешанага тыпу вядзення памешчыцкай гаспадаркі ў 2-й палове XIX ст. былі:**

1) адпрацоўкі;
2) спецыялізацыя с/г вытворчасці;
3) выкарыстанне працы сезонных наёмных рабочых;
4) развіццё гандлёвага земляробства з увядзеннем сістэмы шматпольнага севазвароту.

**15. Асаблівасць гаспадарчага развіцця Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў у 2-й палове XIX ст. – гэта:**

1) перавага падворнага землекарыстання;
2) абшчыннага;
3) спецыялізацыя на льнаводстве;
4) на вытворчасці шкла.

**16. У 60–70-х гг. XIX ст. найважнейшай галіной с.г. Беларусі была(о):**

1) малочная жывёлагадоўля;
2) ільнаводства;
3) вінакурэнне;
4) вырошчванне збожжа.



Репозиторий ВГУ

**17. У канцы XIX ст. у галіновай структуры прамысловасці Беларусі пераважала:**

1) вінакурэнне;
2) дрэваапрацоўка;
3) сілікатная прамысловасць;
4) тэкстыльная.

**18. Шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, які прадугледжваў стварэнне самастойных сялянскіх гаспадарак, свабодных ад перажыткаў феадалізму, – гэта ... .**

**19. У другой палове XIX ст. для капіталістычнай сістэмы гаспадарання былі характэрнымі:**

1) трохпольны севазварот;
2) жалезныя плугі і бароны;
3) шматпольны севазварот;
4) праца падзёншчыкаў.

**20. У пачатку XX ст. аб паскарэнні працэсу фарміравання буржуазнай зямельнай уласнасці сведчылі наступныя з'явы:**

1) драбленне сялянскіх надзелаў;
2) рост закладу памешчыкамі сваіх зямель у банкі;
3) інтэнсіўны продаж зямлі дваранамі, чыноўнікамі, афіцэрамі;
4) купля зямлі заможнымі сялянамі, купцамі, мяшчанамі.

**21. Першая чыгунка прайшла праз Беларусь у ... годзе.**

**22. Выдзелены ў адным месцы ўчастак зямлі ўзамен палосак ("шнуроў") пры абшчынным землекарыстанні, – гэта ... .**

**23. Участак зямлі з гаспадарчымі пабудовамі і домам гаспадара за межамі вёскі, – гэта ... .**

**24. Фактары, якія стрымлівалі развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы Беларусі ў 60–70-х гг. XIX ст., – гэта:**

1) адсутнасць с/г інвентару ў гаспадарках памешчыкаў;
2) адсутнасць прадпрымальніцкага вопыту вядзення гаспадаркі;
3) атрыманне памешчыкамі вялікіх выкупных сум;
4) адпрацоўкі.

**25. Трохпольны севазварот у 60–90-х гг. XIX ст. быў больш характэрны для гаспадарак:**

1) буйных памешчыкаў;
2) беднякоў;
3) заможных сялян;
4) сераднякоў.

**26. У другой палове XIX ст. у Беларусі асноўнымі землеўласнікамі заставаліся:**

1) "літоўскія" памешчыкі;
2) "рускія" памешчыкі;



Репозиторий ВГУ

3) “польскія” памешчыкі;

4) “беларускія” памешчыкі.

**27. Укажыце горад, цэнтр губерніі, дзе ў 60–70-х гг. XIX ст. была распаўсюджана танкарунная авечкагадоўля ?**

**28. У 1880–1890-я гг. ільнаводства было распаўсюджана пераважна ў ... губерніі.**

**29. Будаўніцтва чыгунак на тэрыторыі Беларусі ў 2-й палове XIX ст. спрыяла:**

1) развіццю гандлю;

2) заняпаду галін вытворчасці, звязаных з перапрацоўкай мясцовай сыравіны;

3) спыненню выкарыстання водных шляхоў зносін;

4) масаваму перасяленню беларускіх сялян у гарады.

**30. У складзе гараджан на Беларусі ў 2-й палове XIX ст. пераважалі:**

1) беларусы;

2) рускія;

3) яўрэі;

4) палякі.

## Тэма 6. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. на Беларусі

1. *Перадумовы і прычыны рэвалюцыі.*
2. *Пачатак рэвалюцыі. Рэвалюцыйны рух у студзені–верасні 1905 г. на Беларусі.*
3. *Кастрычніцкая палітычная стачка і снежаньскія падзеі 1905 г. на Беларусі. Беларускі нацыянальны рух у гады рэвалюцыі.*
4. *Рэвалюцыя на спадзе: студзень 1906 – чэрвень 1907 гг. Прычыны паражэння і гістарычнае значэнне рэвалюцыі.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* РСДРП, ПСР, БСГ, БУНД, аб’яднаныя саветы, кааліцыйныя камітэты, курлоўскі растрэл, “мазырская рэспубліка”.

*Асобы:* Г. Гапон, Курлоў, П. Сталыпін.

*Храналогія:* пачатак першай расійскай рэвалюцыі, падпісанне маніфеста Мікалаем II аб скліканні законадарадчай Дзяржаўнай думы, падпісанне Мікалаем II Маніфеста “Аб ўдасканаленні дзяржаўнага парадку”, стварэнне Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі, пачатак працы першай Дзяржаўнай думы РІ, роспуск першай Дзяржаўнай думы, пачатак працы другой Дзяржаўнай думы, канец першай расійскай рэвалюцыі.

Рэпазіторый ВГУ

**Крыніцы:**

1. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Мн., 1977.
2. Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов. – Мн., 1983. – Т. 1; 1990. – Т. 2.
3. Дакументы Беларускае сацыялістычнае грамады часоў рэвалюцыі 1905 г. // Спадчына. – 1991. – № 3. – С. 36–43.

**Літаратура абавязковая:**

1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX –XX стагоддзі.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.).
3. Гісторыя Беларусі: з 1795 да вясны 1917 г.: вучэбны дапаможнік / І.І. Коўкель [і інш.]. – Мн., 2001.
4. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1994. – Ч. 1.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2003. – Т. 1–6; Т. 6, кн. 1–2.

**Літаратура дадатковая:**

1. Бригадин П.И. Эсеры в Беларуси (конец XVIII – февраль 1917 г.). – Мн., 1994.
2. З гісторыі палітычных партый: Вучэб. дапам. для студэнтаў / У.К. Коршук ( адк. рэд.) [і інш.]. – Мн., 1993.
3. Забаўскі М.М., Пуцік У.С. Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе Расіі (1906–1917 гг.). – Мн., 1998.
4. Шабуня К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг. – Мн., 1962.

У першым пытанні вызначце сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і нацыянальныя праблемы, якія прывялі краіну да рэвалюцыі. Пакажыце спецыфіку “беларускіх” прычын рэвалюцыі 1905–1907 гг.

У другім пытанні адзначце, з якіх падзей пачалася першая расійская рэвалюцыя на Беларусі. Пакажыце ход рэвалюцыйных падзей у студзені–верасні 1905 гг. і вызначце іх характэрныя рысы і асаблівасці. Параўнайце развіццё падзей на Беларусі і ў іншых рэгіёнах РІ.

У трэцім пытанні растлумачце, што такое кастрычніцкая палітычная стачка. Пакажыце, наколькі шырока яна ахапіла тэрыторыю Беларусі і як царскі ўрад адрэагаваў на гэтую падзею.



Репозиторий ВГУ

Звярніце ўвагу, наколькі вялікім быў размах снежаньскіх падзей 1905 г. на Беларусі. У гэтым жа пытанні ахарактарызуйце стан беларускага нацыянальнага руху і яго ўплыў на рэвалюцыйныя падзеі. Пры гэтым ахарактарызуйце дзейнасць яго прадстаўнікоў, праграму, вызначце уплыў на агульны ход рэвалюцыйных падзей.

У чацвёртым пытанні Вам трэба будзе разгледзець ход рэвалюцыі ў студзені 1906 – чэрвені 1907 гг. і вызначыць асаблівасці гэтага перыяду. Пакажыце прычыны паражэння рэвалюцыі, абгрунтуйце іх. Вызначце вынікі рэвалюцыі для Беларусі. Ці можна ацаніць іх адназначна?

## Тэсты для самакантролю

**1. Прычынамі рэвалюцыі 1905–1907 гг. з'яўляліся:**

1) няздольнасць самадзяржаўя вырашыць аграрнае пытанне;

2) нежаданне царскай улады дараваць народу дэмакратычныя свабоды;

3) адсутнасць адзінства сярод нацыянал-дэмакратаў;

4) схільнасць сялян да радыкальных дзеянняў.

**2. У 1905–1907 гг. эсэры і меншавікі выступалі з патрабаваннямі:**

1) пераходу да парламенцкай манархіі;

2) знішчэння самадзяржаўя;

3) нацыяналізацыі зямлі;

4) устанаўлення дэмакратычнай рэспублікі.

**3. Маніфестам 17 кастрычніка 1905 г. Мікалай II дараваў сваім падданым:**

1) парламент з заканадаўчымі паўнамоцтвамі;

2) свабоду сходаў;

3) усеагульнае выбарчае права;

4) прыватную ўласнасць на зямлю.

**4. Суаднясіце назву партыі з прозвішчам заснавальніка або актыўнага дзеяча:**

| | |
|---|---|
| 1) Р. Гершуні; | А) кадэты; |
| 2) У. Ленін; | Б) РСДРП; |
| 3) А. Луцкевіч; | В) ПСР; |
| 4) П. Мілюкоў; | Г) БСГ. |

**5. Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў утварылася ў ... годзе.**

**6. Удзельнік стварэння БСГ. Загадчык першай нацыянальнай кнігарні ў Вільні, сакратар рэдакцыі газеты "Наша ніва". У 1910 г. выдаў "Кароткую гісторыю Беларусі" (прозвішча).**



Рэпазіторый ВДУ

**7. Калектыўнае спыненне працы рабочымі і служачымі з прад'яўленнем прадпрымальніку ці ўраду эканамічных ці палітычных патрабаванняў, – гэта ... .**

**8. Суаднясіце палітычныя партыі і іх праграмныя палажэнні:**

| | |
|---|---|
| 1) акцябрысты; | А) абмежаванне самаўладдзя, увядзенне канстытуцыі; |
| 2) БСГ; | Б) сацыялізацыя зямлі; |
| 3) эсэры; | В) раўнапраўе грамадзян Расіі; |
| 4) кадэты; | Г) захаванне адзінай і непадзельнай Расіі. |

**9. Першая руская рэвалюцыя пачалася падзеяй, якая вызначаецца тэрмінам ... .**

**10. Першая руская рэвалюцыя пачалася... (чысло месяца).**

**11. Ці правільна, што ў РІ ў пачатку ХХ ст. існавала: а) неабмежаваная манархія; б) самадзяржаўе;**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) абодва сцвярджэнні правільныя;
4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**12. Перадача ўсёй зямлі ва ўласнасць народу і ўраўняльнае надзяленне сялян зямлёй без права куплі-продажу, – гэта ...? (тэрмін).**

**13. Палітычныя свабоды былі дараваны Мікалаем ІІ у выніку падзей, што атрымалі назву ... палітычная стачка.**

**14. Растрэл рабочага мітынгу ў Мінску 18 кастрычніка 1905 г. атрымаў назву ... растрэл.**

**15. Законадарадчая дума, ў жніўні 1905 г. атрымала назву ...?**

**16. Рэвалюцыянер, эсэр здейсніў у студзені 1905 г. замах на П. Курлова ... (прозвішча).**

**17. Найбольшую падтрымку ў гады рэвалюцыі БСГ атрымала ад ... (катэгорыя насельніцтва).**

**18. БСГ:**

1) прыняла ўдзел у выбарах у першую Дзяржаўную думу;
2) адмовілася ўдзельнічаць;
3) к таму часу спыніла сваё існаванне;
4) не паспела падаць заяву на ўдзел у выбарах.

**19. Ад Беларусі ў першую Дзяржаўную думу РІ было абрана:**

1) 20 дэпутатаў;
2) 25 дэпутатаў;
3) 30 дэпутатаў;
4) 36 дэпутатаў.

**20. Большасць дэпутатаў ад Беларусі прайшлі ў першую Дзяржаўную думу пад лозунгамі ... партыі.**



Репозиторий ВГУ

**21. Па сацыяльнаму складу большасць у першай Дзяржаўнай думе ад Беларусі склалі:**

1) сяляне;

2) дваране;

3) інтэлігенцыя;

4) святары.

**22. Галоўным у першай думе было:**

1) рабочае пытанне;

2) аграрнае;

3) палітычнае;

4) пытанне развіцця культуры і адукацыі.

**23. БСГ:**

1) прыняла ўдзел у выбарах у другую Дзяржаўную думу;

2) адмовілася ўдзельнічаць;

3) к таму часу спыніла сваё існаванне;

4) не паспела падаць заяву на ўдзел у выбарах.

**24. Перамогу на выбарах у другую Дзяржаўную думу на Беларусі атрымалі(аў):**

1) урадавы лагер;

2) рэвалюцыйныя партыі;

3) БСГ;

4) аўтанамісты.

**25. Словы:"Ім неабходны вялікія ўзрушэнні, нам патрэбна вялікая Расія", – належаць... (прозвішча).**

**26. Другі з'езд БСГ адбыўся ў студзені ...? года.**

**27. Выданне газеты "Наша ніва" пачалося ў лістападзе:**

1) 1905 г.;

2) 1906 г.;

3) 1907 г.;

4) 1908 г.

**28. Прычынамі паражэння рэвалюцыі былі:**

1) слабасць самадзяржаўя;

2) адсутнасць адзінства ў дзеяннях рэвалюцыйнага лагера;

3) адсутнасць шырокай падтрымкі рэвалюцыйнага лагера з боку большасці насельніцтва;

4) моц урадавага лагера.

**29. У выніку паражэння рэвалюцыі БСГ:**

1) спыніла сваю нелегальную дзейнасць;

2) засяродзілася на культурна-асветніцкай дзейнасці праз газету "Наша ніва";

3) перайшла да супрацоўніцтва з урадам;

4) перайшла да тактыкі тэрору.

**30. Заканчэннем першай рускай рэвалюцыі лічыцца ... чэрвеня ... года.**



Репозиторий ВГУ

## Тэма 7. Культура Беларусі ў 2-й палове XIX ст. – 1917 г.

1. *Народная асвета і навука.*
2. *Літаратура, перыядычны друк.*
3. *Архітэктура, выяўленчае мастацтва, музыка і тэатр.*
4. *Быт і ахова здароўя на Беларусі.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* "Загляне сонца і ў наша ваконца", "Наша хата", "Палачанін", "Мінчук", "Наша доля", "Наша ніва", "Гоман", "Вольная Беларусь", "Саха", "Лучынка", "Крапіва", "Мужыцкая праўда", "Лісты з-пад шыбеніцы", "Марыська чарнаброва, галубка мая", "Гутарка Данілы са Сцяпанам", "Кепска будзе", "Дудка беларуская", "Смык беларускі", "Роднай старонцы", "Вязынка", "Акты Заходняй Русі", "Акты Віленскай камісіі", "Модны шляхцюк", "Прымакі", "Паўлінка"; "Пахаванне Гедыміна", "Смерць Глінскага ў турме", "На этапе", "Парабкава хата"; "Дзеці на двары", "У школу", "Стары пастух", "Тайная вячэра"; "Вечар у Мінскай губерніі", "На радзіме", "Рака Бярэзіна", "Жанчына ў жоўтым"; "Смерць Кейстута", "Хрышчэнне язычнікаў"; эклектыка, готыка, барока, класіцызм, псеўдарускі стыль.

*Асобы:* Ф. Багушэвіч, Я. Лучына, А. Гурыновіч, М. Багдановіч, Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны, Цётка, З. Бядуля, К. Буйло, І. Насовіч, П. Шэйн, М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі, Я. Карскі, Наркевіч-Ёдка, Я. Сняткоў, А. Садоўскі, А. Яблачкіна, М. Савіна, Л. Собінаў, Ф. Шаляпін, С. Рахманінаў, А. Скрабін, І. Трутнеў, К. Альхімовіч, Н. Сілівановіч, Ф. Рушчыц, Г. Вайсенгоф, К. Стаброўскі, А. Гараўскі, В. Бялыніцкі-Біруля, Б. Русецкі, А. Ромер, М. Андрыёлі, Ф. Дмахоўскі, М. Шагал, Ю. Пэн.

*Храналогія:* час закрыцця Горы-Горацкага земляробчага інстытута, час выдання газеты "Наша ніва", час адкрыцця ў Мінску пастаяннага гарадскога тэатра, час стварэння І. Буйніцкім мастацкага калектыва, год пачатку дэманстрацыі кіно ў Мінску, час стварэння Віленскай школы малявання.

**Крыніцы:**


1. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Мн., 1977.
2. Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов. – Мн., 1983. – Т. 1; 1990. – Т. 2.


**Літаратура абавязковая:**


1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX –XX стагоддзі.




Репозиторий ВГУ

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд.: М. Касцюк [і інш.]. – Мн., 2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.).
3. Гісторыя Беларусі: з 1795 да вясны 1917 г.: вучэбны дапаможнік / І.І. Коўкель [і інш.]. – Мн., 2001.
4. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1994. – Ч. 1.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2003. – Т. 1–6; Т. 6, кн. 1–2.

**Літаратура дадатковая:**

1. Архітэктура Беларусі: Энцыклап. даведнік / рэдкал.: А.А. Воінаў [і інш.]. – Мн., 1993.
2. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. / М.А. Ткачоў [і інш.]; пад рэд. М.А. Лазарука [і інш.]. – Мн., 1985.
3. Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. – Мн., 1989. – Т. 3. Канец XVIII – пачатак XX ст.
4. Гісторыя беларускага тэатра: у 3 т. – Мн., 1983.
5. Очерки истории науки и культуры Беларуси. – Мн., 1996.
6. Дробов Л.М. Беларускія мастакі XIX ст. – Мн., 1971.
7. Дробов Л.М. Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. – Мн., 1974.
8. Мальдіс А. Падарожжа ў XIX ст. – Мн., 1969 г.

У першым пытанні вызначце сістэму асветы на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Пакажыце яе асаблівасці ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі РІ. Раскажыце аб спробах рэфармавання сістэмы адукацыі. Вызначце ўзровень адукаванасці насельніцтва Беларусі ў вывучаемы час. Зрабіце адпаведныя высновы.

Аб узроўні развіцця літаратуры раскажыце праз творчасць яе прадстаўнікоў. Вызначце асаблівасці яе развіцця і значэнне ў фарміраванні беларускай літаратурнай мовы. Пакажыце працэсы, якія садзейнічалі развіццю літаратуры, і тыя, што стрымлівалі яе развіццё.

У трэцім пытанні вызначце характэрныя рысы развіцця архітэктуры, выяўленчага мастацтва, музыкі і тэатра ў вывучаемы час. Вызначце галоўныя архітэктурныя помнікі гэтага часу. Пакажыце іх падабенства і адрозненне з помнікамі папярэдніх перыядаў. Расскажыце аб дзейнасці музыкантаў гэтага перыяду, пакажыце узровень даступнасці музыкі для большасці насельніцтва Беларусі. Раскажыце аб дзейнасці важнейшых тэатраў на Беларусі.

Рэпазіторый ВДУ

У чацвёртым пытанні звярніце ўвагу на ўмовы жыцця і быту сельскага насельніцтва на Беларусі. Ахарактарызуйце ўзровень жыцця гараджан, іх быт, ступень развіцця ЖКГ ў гарадах. Дайце характарыстыку медыцынскаму абслугоўванню сельскіх жыхароў і гараджан у вывучаемы час.

## Тэсты для самакантролю

**1. "Першая беларуская трупа" была створана ў 1907 г.:**

1) К. Кастравіцкім;
2) І. Буйніцкім;
3) М. Гарэцкім;
4) А. Бурбісам.

**2. З 1910 г. "Наша ніва" пачала друкаваць папулярнае(ыя) сярод сялян выданне(і):**

1) "Земляробчы даведнік";
2) "Беларускі каляндар;
3) "Сялянская зорка";
4) "Саха".

**3. У 1914–1915 гг. рэдактарам газеты "Наша ніва" быў:**

1) Я. Колас;
2) Я. Купала;
3) К. Кастравіцкі;
4) Ц. Гартны.

**4. Сельскагаспадарчы аддзел газеты "Наша ніва" вясной 1912 г. быў пераўтвораны ў самастойны часопіс:**

1) "Лучынка";
2) "Саха";
3) "Сялянка";
4) "Жыта".

**5. Мастак, які набыў вядомасць творамі бытавога і партрэтнага жанраў і ў 1906 г. у Мінску адкрыў школу малявання, – гэта:**

1) Ю. Пэн;
2) Я. Кругер;
3) Ф. Рушчыц;
4) Я. Драздовіч.

**6. Найбольшая колькасць карэспандэнтаў "Нашай нівы" была ў губерні:**

1) Мінскай;
2) Гродзенскай;
3) Магілёўскай;
4) Віленскай.



Репозиторий ВГУ

**7. Першую пастаноўку “Паўлінкі” здзейсніў “Беларускі музычна-драматычны гурток” пад кіраўніцтвам:**

1) Ф. Ждановіча;

2) А. Бурбіса;

3) У. Галубка;

4) І. Буйніцкага.

**8. Аўтарам карцін “Зямля”, “Вадзяны млын”, “У свет”, “Эмігранты” з’яўляецца:**

1) Г. Вайсенгоф;

2) Ф. Рушчыц;

3) Ю. Пэн;

4) В. Бялыніцкі-Біруля.

**9. Аўтарам карцін “Дзеці на двары”, “У школу”, “Стары пастух” з’яўляецца ... (прозвішча).**

**10. Званне акадэміка за ўдзел у стварэнні пано “Тайная вечара” атрымаў выхадзец з Беларусі ...?**

**11. У пачатку XX ст. на Беларусі працавалі настаўніцкія інстытуты ў:**

1) Віцебску;

2) Маладзечна;

3) Магілёве;

4) Пінску.

**12. Аўтар кнігі “Хрэст на свабоду” – гэта:**

1) Ф. Багушэвіч;

2) М. Багдановіч;

3) А. Пашкевіч;

4) З. Бядуля.

**13. Кіраўніком “Першага таварыства беларускай драмы і камедыі” быў:**

1) І. Буйніцкі;

2) Ф. Ждановіч;

3) У. Галубок;

4) В. Дунін-Марцінкевіч.

**14. Гісторык і краязнавец А. Сапуноў у пачатку 80-х гг. XIX ст. выдаў архіўныя дакументы і даследаванні пад назвай ... .**

**15. Вызначце правільную паслядоўнасць выданняў:**

1) “Мужыцкая праўда”;

2) “Наша доля”;

3) “Минский листок”;

4) “Гомон”.

Репозиторий ВГУ

**16. Сярэднія навучальныя ўстановы ў Беларусі пасля школьнай рэформы 1864 г. гэта:**

1) гарадскія вучылішчы;
2) народныя вучылішчы;
3) класічныя гімназіі;
4) царкоўна-прыходскія школы.

**17. Сярэднія навучальныя ўстановы ў Беларусі пасля школьнай рэформы 1864 г. – ... вучылішчы.**

**18. Падзея, пасля якой быў закрыты земляробчы інстытут у Горы-Горках, гэта:**

1) паўстанне 1794 г.;
2) паўстанне 1830–1831 гг.;
3) паўстанне 1863–1864 гг.;
4) выкрыццё таварыстваў філаматаў і філарэтаў.

**19. Выданне "Словаря белорусского наречия" І. Насовіча сведчыла аб:**

1) правядзенні русіфікацыі;
2) узмацненні паланізацыі;
3) развіцці беларусазнаўства;
4) умацаванні пазіцый праваслаўнай царквы.

**20. Аўтарам карцін "Вечар у Мінскай губерні", "На радзіму" з'яўляецца:**

1) К. Альхімовіч;
2) Н. Сіліvановіч;
3) А. Гараўскі;
4) І. Хруцкі.

**21. Аўтарам "Беларускага лемантара, або Першая навука чытання" быў:**

1) К. Каганец;
2) Я. Купала;
3) Я. Колас;
4) М. Багдановіч.

**22. Змешванне, злучэнне розных мастацкіх элементаў і стыляў у архітэктуры другой паловы XIX ст. называецца ... .**

**23. У перыяд з 1886 па 1902 гг. у Беларусі выдавалася газета:**

1) "Минские ведомости";
2) "Минский листок";
3) "Наша доля";
4) "Дзянніца".

**24. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

1) пачатак выдання газеты "Северо-западная жизнь";
2) прыпыненне нелегальнай дзейнасці БСГ;
3) пачатак выдання "Беларускага календара";
4) пачатак выдання газеты "Мінскі лісток".



Репозиторий ВГУ

**25. Аўтарам паэтычнага зборніка “Скрыпка беларуская” з’яляецца... (прозвішча).**

**26. Словы А. Гурыновіча “Дзякую табе, браце, Бурачок Мацею, за тое, што ў сэрцы абудзіў надзею...” адрасаваны беларускаму пісьменніку:**

1) Ф. Багушэвічу;
2) Я. Лучыне;
3) В. Дуніну-Марцінкевічу;
4) Я. Купале.

**27. Аўтарам верша “Наш палетак”, які быў надрукаваны на першай старонцы першага нумара газеты “Наша доля”, з’яўляецца ... (літ. псеўданім).**

**28. Аўтарам “Слоўніка беларускай гаворкі”, які быў выдадзены ў 1870 г. і змяшчаў больш за 30000 слоў, з’яўляецца ... (прозвішча).**

**29. Драма Я. Купалы “Раскіданае гняздо” упершыню была пастаўлена:**

1) Першым беларускім таварыствам драмы і камедыі;
2) Беларускім музычна-драматычным гуртком;
3) Першай беларускай трупай;
4) БДТ-1.

**30. Газета, якая пачала выходзіць у Вільні 10 лістапада 1906 г., гэта ... .**

## Тэма 8. Фарміраванне беларускай нацыі (другая палова XIX – пачатак XX ст.)

1. *Гістарычныя ўмовы фарміравання беларускай нацыі.*
2. *Тэрыторыя і насельніцтва на Беларусі. Фарміраванне адзінай эканамічнай прасторы.*
3. *Складанне беларускай літаратурнай мовы і нацыянальнай самасвядомасці.*
4. *Беларускі нацыянальны рух. Сацыяльна-класавыя асаблівасці беларускай нацыі.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* нацыя, нацыянальная самасвядомасць, “заходнерусізм”, “Мужыцкая праўда”, “Гоман”, БРГ, БСГ.

*Асобы:* К. Каліноўскі, А. Марчанка, Х. Ратнер, А. Гурыновіч, М. Абрамовіч, І. і А. Луцкевічы, А. Пашкевіч, А. Бурбіс, В. Іваноўскі.

*Храналогія:* год выхаду ў свет першага нумара часопіса “Гоман”, час утварэння БРГі БСГ.



Рэпозиторий ВГУ

**Крыніцы:**

1. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Мн., 1977.
2. Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов. – Мн., 1983. – Т. 1; 1990. – Т. 2.

**Літаратура абавязковая:**

1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX –XX стагоддзі.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.).
3. Гісторыя Беларусі: з 1795 да вясны 1917 г.: вучэбны дапаможнік / І.І. Коўкель [і інш.]. – Мн., 2001.
4. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1994. – Ч. 1.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2003. – Т. 6, кн. 1–2.

**Літаратура дадатковая:**

1. Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху: выбраныя творы. – Мн., 2003.
2. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – 2-е выд. – Мн., 1997.
3. Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. – Мн.. 1980.
4. Семашкевіч Р.М. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе (канец XIX – пачатак XX ст.). – Мн., 1971.
5. Снапкоўская С.В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. – Мн., 1998.
6. Цьвікевіч А. “Западно-руссизм”. Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX  і пачатку XX в. – Мн., 1993.

У першым пытанні ахарактарызуйце палітыку царызму ў адносінах да беларусаў, растлумачце сутнасць “заходнерусізму”. Пакажыце, якім чынам уплывала на фарміраванне нацыі адсутнасць уласнай дзяржавы і літаратурнай мовы. Звярніце ўвагу на фактары, якія садзейнічалі фарміраванню беларускай нацыі.

У другім пытанні засяродзьце вашу ўвагу на фарміраванні тэрыторыі беларускай нацыі. Акрэсліце яе межы, параўнайце іх з сучаснай мяжой РБ.

Звярніце ўвагу, па якому прынцыпу былі сфарміраваны губерніі ў РІ. Падумайце, ці садзейнічаў гэты падыход складванню асобных



Репозиторий ВГУ

нацый. Растлумачце, як фарміраванне агульнабеларускага рынку садзейнічала нацыятворчаму працэсу на Беларусі.

У трэцім пытанні прасачыце працэс фарміравання адзінай літаратурнай мовы. Адзначце асобы, якія прыклалі вялікія намаганні да гэтай справы. Пакажыце складанасці на шляху фарміравання нашай мовы. У гэтым жа пытанні пакажыце, у чым выражаецца нацыянальная самасвядомасць народа, у тым ліку беларусаў. Вызначце фактары, якія садзейнічалі і перашкаджалі фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа. Назавіце і пакажыце тэрыторыю распаўсюджвання этноніма (ці этнонімаў), якія былі характэрны для беларусаў у азначаны час.

У чацвёртым пытанні спыніцеся на аналізе ўзроўню развіцця беларускага нацыянальнага руху. Вызначце палітычныя партыі, арганізацыі і асобы, якія яго прадстаўлялі. Пакажыце, якім чынам яны ўплывалі на станаўленне беларускай нацыі. Тут жа прааналізуйце сацыяльна-класавыя асаблівасці беларускай нацыі. Пакажыце, пад уплывам якіх фактараў яны складваліся і ў чым заключаліся. Параўнайце сацыяльна-класавы склад беларусаў з іншымі нацыямі, вызначце агульнае і асаблівае.

## Тэсты для самакантролю

**1. Супольнасць людзей, якая склалася гістарычна і для якой характэрна адзіная тэрыторыя, мова, культура і самасвядомасць, гэта ... .**

**2. Нацыі фарміруюцца ў эпоху:**

1) феадалізму;
2) капіталізму;
3) сацыялізму;
4) камунізму.

**3. Ці правільна, што: а) беларуская нацыя фарміравалася ва ўмовах уласнай дзяржаўнасці; б) ва ўмовах адсутнасці ўласнай дзяржаўнасці:**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) абодва сцвярджэнні правільныя;
4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**4. Беларуская нацыя фарміравалася ў межах губерній:**

1) Віленскай;
2) Ковенскай;
3) Гродзенскай;
4) Сувалкаўскай.



Репозиторий ВГУ

**5. Па нацыянальным складзе (перапіс 1897 г.) большасць насельніцтва на Беларусі складалі:**

1) яўрэі;
2) палякі;
3) беларусы;
4) рускія і палякі.

**6. Асаблівасцю нацыянальнага складу гарадоў на Беларусі з'яўлялася:**

1) перавага беларусаў;
2) перавага яўрэяў;
3) рускіх і ўкраінцаў;
4) палякаў і рускіх.

**7. Сярод гарадскога пралетарыяту на Беларусі большасць складалі:**

1) яўрэі;
2) беларусы;
3) рускія;
4) палякі і ўкраінцы.

**8. Ці правільна, што: а) большасць беларусаў пражывала ў гарадах; б) большасць беларусаў пражывала ў сельскай мясцовасці:**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) абодва сцвярджэнні правільныя;
4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**9. Па канфесійнай прыналежнасці сярод беларусаў пераважалі ў канцы XIX ст.:**

1) праваслаўныя;
2) каталікі;
3) уніяты;
4) каталікі і ўніяты.

**10. Сацыяльная структура беларускага грамадства была прадстаўлена:**

1) буржуазіяй;
2) абшчынай;
3) сялянствам;
4) валасцямі.

**11. Асаблівасцю(мі) фарміравання беларускай нацыі з'яўлялася:**

1) перавага ў сацыяльнай структуры пралетарыяту;
2) перавага ў сацыяльнай структуры сялянства;
3) перавага ў сацыяльнай структуры буржуазіі;
4) перавага ў сацыяльнай структуры праваслаўных.



Репозиторий ВГУ

**12. Ці правільна, што: а) у Пецярбургу пражывала больш беларусаў, чым у Мінску; б) у Пецярбургу пражывала больш беларусаў, чым у Віцебску:**

1) правільна а);

2) правільна б);

3) абодва сцвярджэнні правільныя;

4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**13. Фарміраванню беларускай нацыі садзейнічала:**

1) будаўніцтва чыгунак у 2-й палове XIX ст.;

2) фарміраванне агульнабеларускага рынку;

3) экспарт зерне ў ЗЕ;

4) падзел грамадства на розныя канфесіі.

**14. "...мова наша ёсць такая ж людская, як і французская, альбо нямецкая і іншая якая... Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная..." (аўтар, прозвішча).**

**15. Першыя легальныя перыядычныя, беларускамоўныя выданні:**

1) "Мужыцкая праўда";

2) "Мінскі лісток";

3) "Наша доля";

4) "Наша ніва".

**16. Сукупнасць ідэй, уяўленняў, перакананняў, вераванняў, у якіх народ асэнсоўвае сябе як нацыянальную супольнасць і ўсведамляе гістарычныя карані свайго паходжання, – гэта ...?**

**17. Знешняй формай праяўлення нацыянальнай самасвядомасці з'яўляецца:**

1) назва народа;

2) назва яго з боку суседзяў;

3) усведамленне пэўным народам сваёй адметнасці ад іншых народаў;

4) фарміраванне знешняга рынку.

**18. Гістарычная супольнасць людзей, для якой характэрна пражыванне на адной тэрыторыі, адзіная эканоміка, адна літаратурная мова, агульныя рысы культуры і псіхалогіі, нацыянальная самасвядомасць, гэта ... .**

**19. Сістэма поглядаў, прыхільнікі якой адмаўлялі гістарычнасць беларусаў як самастойнага і самабытнага этнасу і атаясамлівалі іх з вялікарускім народам, гэта ... .**

**20. Шырокае ўнутранае самакіраванне, якое надаецца асобнай тэрыторыі ці народу, што кампактна пражывае ў межах дзяржавы, гэта ... .**

**21. Тэарэтычнае абгрунтаванне існавання беларускага этнасу ўпершыню распрацавалі:**

1) беларускія народнікі;

2) А. Міцкевіч;



Репозиторий ВГУ

3) К. Каліноўскі;

4) Я. Колас.

**22. Тэарэтычнае абгрунтаванне існавання беларускага этнасу ўпершыню было зроблена на:**

1) старонках “Мужыцкай праўды”;

2) часопіса “Гоман”;

3) газеты “Мінскі лісток”;

4) газеты “Наша ніва”.

**23. Рэдактарам газеты “Наша ніва” пэўны час быў:**

1) Я. Колас;

2) Я. Купала;

3) А. Пашкевіч;

4) А. Луцкевіч.

**24. Уяўленні, у якіх народ выражае сваё разуменне сябе як супольнасці людзей і сэнс свайго гістарычнага існавання, гэта ... .**

**25. Пачуццё любові да Бацькаўшчыны. Гатоўнасць верна служыць інтарэсам краіны і абараняць яе, гэта ... .**

**26. Пытанне аб рэалізацыі права народа на свабоднае. этнічнае, дзяржаўнае, культурнае самавызначэнне, гэта ... пытанне.**

**27. Упершыню ідэю аб аўтаноміі Беларусі ў складзе федэратыўнай Расіі выказалі:**

1) “Гоманаўцы”;

2) “Нашаніўцы”;

3) “Нашадольцы”;

4) К. Каліноўскі.

**28. Асноўная саманазва нашага этнасу ў канцы XIX ст.:**

1) “Тутэйшыя”;

2) “Ліцвіны”;

3) “Беларусы”;

4) “Ліцвіны-беларусцы”.

**29. Перыяыд беларускага адраджэння пачатку XX ст. атрымаў назву:**

1) “Гоманаўскі”;

2) “Нашадольскі”;

3) “Нашаніўскі”;

4) “Грамадоўскі”.

**30. Першай нацыянальнай палітычнай партыяй на Беларусі была:**

1) “Гоман”;

2) БСГ;

3) ПСР;

4) РСДРП.



Репозиторий ВГУ

## Тэма 9. Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі, грамадзянская вайна і замежная інтэрвенцыя на Беларусі (1917–1920 гг.).

1. *Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя на Беларусі: прычыны, ход, вынікі.*
2. *Усталяванне савецкай улады на Беларусі.*
3. *Беларусь у гады нямецкай акупацыі (1917–1918 гг.).*
4. *Польская акупацыя Беларусі. Савецка-польская вайна.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* рэформа, рэвалюцыя, губернскія камісары, павятовыя камісары, двоеўладдзе, БХД, БПНС, БСГ, БНГ, БНК, ВБР, "Вольная Беларусь", ЦРБА, БСДРП, КВР, ВРК, Аблвыкамзах.

*Асобы:* М. Фрунзе, А. Эверт, Б. Позерн, А. Мяснікоў, Л. Карнілаў, Р. Скірмунт, З. Жылуновіч, А. Цвікевіч, Я. Лёсік, А. Чарвякоў, К. Ландар, С. Крылоў, Ю. Пілсудскі, М. Тухачэўскі.

*Храналогія:* усталяванне двоеўладдзя, канец двоеўладдзя, час працы першага з'езда беларускіх нацыянальных партый і арганізацый, час працы другога ..., час стварэння БНК, час стварэння ЦРБА, час утварэння Аблвыкамзаха, падпісанне Брэсцкага міру, скасаванне Брэсцкага міру, захоп немцамі Мінска, вызваленне Мінска ад нямецкіх захопнікаў, захоп палякамі Мінска, вызваленне Мінска ад палякаў, падпісанне Рыжскага мірнага дагавора.

**Крыніцы:**

1. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Мн., 2000.
2. Мирный договор между Россией и Украиной, с одной стороны, и Польшей – с другой // Спадчына. – 1993. – № 4. – С. 12–22.
3. Мирный договор между Россией, с одной стороны, и Германией, Австро-Венгрией , Болгарией и Турцией – с другой (3 марта 1918 г.) // Спадчына. – 1993. – № 2. – С. 52–57.
4. Хрестоматия по истории БССР. 1917–1983 / сост. А.П. Игнатенко, В.Н. Сидорцов, П.З. Савочкин, А.И. Сидоренко. – Мн., 1984.

**Літаратура абавязковая:**

1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І.Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX –XX стагоддзі.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2006. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг.
3. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1995. – Ч. 2.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т.– Мн., 1993–2003. – Т. 1–6; Т. 6, кн. 1–2.



Репозиторий ВГУ

**Літаратура дадатковая:**

1. Ігнаценка І.М. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: асаблівасці і вынікі. – Мн., 1995.
2. Иностранная военная интервенция в Белоруссии. – Мн., 1990.
3. Мірановіч Я. Найноўшая гісторыя Беларусі. – СПб., 2003.
4. Осмоловский В.П. Советское строительство в Белоруссии (октябрь 1917 г. – май 1918 г.). – Мн., 1975.
5. Польско-советская война 1919–1920 (ранее неопубликованные документы и материалы. – М., 1994.
6. Сяменчык М.Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 г.). – Мн., 2001. – Ч. 1–2.

У першым пытанні вызначце прычыны Лютаўскай рэвалюцыі на Беларусі. Звярніце ўвагу на іх спецыфічнасць і асаблівасці ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі РІ. Пакажыце ход падзей падчас рэвалюцыі і адзначце фактары, якія садзейнічалі развіццю рэвалюцыі і тыя, што тармазілі яе. Прадэманструйце адносіны розных слаёў грамадства і палітычных партый да Лютаўскай рэвалюцыі. Падумайце над тым, чаму рэвалюцыя не прывяла да ўсталявання ў краіне буржуазна-ліберальнага ладу.

У другім пытанні пакажыце працэс усталявання савецкай улады на Беларусі. Пры гэтым засяродзьце ўвагу на асаблівасцях усталявання яе ў такіх гарадах, як Мінск, Віцебск, Гомель, Магілёў. Вызначце сілы, якія супраціўляліся гэтаму працэсу. Адзначце пазіцыю нацыянальна-дэмакратычных сіл у адносінах да новай улады. Ахарактарызуйце першыя мерапрыемствы новай улады на Беларусі.

У трэцім пытанні пакажыце ход падзей на Беларусі падчас акупацыі яе тэрыторыі нямецкімі войскамі ў 1917–1918 гг. Вызначце, якім чынам акупацыя ўплывала на палітычнае развіццё Беларусі ў гэты час. Пакажыце спробы розных палітычных сіл выкарыстаць факт нямецкай акупацыі на сваю карысць. Прадэманструйце адносіны беларускага народа да акупацыі.

У чацвёртым пытанні трэба будзе ахарактарызаваць ход падзей падчас акупацыі Беларусі польскімі войскамі. Пры гэтым неабходна засяродзіць увагу на мэтах гэтай акупацыі, пазіцыі нацыянальна-дэмакратычных сіл у адносінах да палякаў, пазіцыі бальшавікоў, простага народа. Тут жа неабходна раскрыць ход савецка-польскай вайны і падрабязна прааналізаваць Рыжскі мірны дагавор і яго наступствы для Беларусі.

Репозиторий ВГУ

## Тэсты для самакантролю

**1. У выніку перамогі Лютаўскай рэвалюцыі фактычную ўладу ў Мінску ўзяў, выбраны у ноч з 3 на 4 сакавіка 1917 г.:**

1) гарадскі грамадскі камітэт парадку;
2) гарадская ўправа;
3) губернскі земскі камітэт;
4) камітэт выратавання рэвалюцыі.

**2. Часовы ўрад Расіі 6 сакавіка 1917 г. перадаў уладу ў губерніях і паветах:**

1) Саветам;
2) камісарам;
3) губернатарам;
4) войску.

**3. На тэрыторыі Беларусі ў першыя месяцы пасля Лютаўскай рэвалюцыі найбольшы ўплыў на сялян аказвалі:**

1) бальшавікі;
2) акцябрысты;
3) эсэры;
4) бундаўцы.

**4. Старшынёй з'езда прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый (25–27 сакавіка 1917 г.) быў абраны:**

1) Р. Скірмунт;
2) Б. Тарашкевіч;
3) К. Кастравіцкі;
4) З. Жылуновіч.

**5. З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый 25–27 сакавіка 1917 г. выступаў за:**

1) аўтаномію Беларусі ў межах Расійскай дзяржавы;
2) незалежную Беларускую Рэспубліку;
3) Літоўска-Беларускую рэспубліку;
4) захаванне адзінай непадзельнай РІ.

**6. Выканаўчым органам з'езда беларускіх нацыянальных арганізацый, які адбыўся вясною 1917 г. у Мінску, стаў:**

1) Народны Сакратарыят;
2) Беларускі нацыянальны камітэт;
3) Цэнтральная Рада;
4) Вялікая беларуская Рада.

**7. Распаўсюджванне і замацаванне формаў дзяржаўнага ладу, заснаваных на прызнанні прынцыпаў народаўладдзя, свабоды, роўнасці грамадзян, гэта ... .**



Репозиторий ВГУ

**8. Аб'яднанне, саюз, пагадненне дзяржаў, палітычных партый, грамадскіх арганізацый для дасягнення агульных палітычных, ваенных, эканамічных мэт, – гэта ... .**

**9. Вясной 1917 г. Часовы ўрад перадаў уладу ў губернях сваім ... , якія выконвалі функцыі губернатараў.**

**10. Старшынёй БНК ў сакавіку 1917 г. стаў ...?(прозвішча)**

**11. Сістэма нарыхтовак с/г прадуктаў у 1919–1921гг., паводле якой сяляне абавязаны былі здаваць дзяржаве ўсе лішкі прадуктаў, што заставаліся звыш устаноўленай нормы, – гэта ... .**

**12. Карэнныя змяненні, пераварот у грамадска-палітычным ладзе, які азначае звяржэнне старога і ўстанаўленне новага дзяржаўнага ладу, – гэта ... .**

**13. Ператварэнне, змяненне якога-небудзь боку грамадскага жыцця пры захаванні асноў існуючага ладу – гэта ... .**

**14. Гвалтоўнае ўмяшанне адной ці некалькіх дзяржаў ва ўнутраныя справы іншай краіны – гэта ... .**

**15. Дзяржава, тэрыторыя якой выкарыстоўваецца ў якасці пагранічнай зоны паміж варожымі краінамі ў мэтах недапушчэння вырашэння іх канфлікту ўзброеным шляхам, – гэта ... .**

**16. Аблвыкамзах быў створаны ў ... (месяц і год).**

**17. ВРК у пачатку лістапада 1917 г. узначальваў:**

1) Ландэр;
2) Мяснікоў;
3) Кнорын;
4) Жылуновіч.

**18. Процідзеянне бальшавікам у Мінску у канцы кастрычніка 1917 г. аказаў ... (абрывіятура)**

**19. Заходняя вобласць была ўтворана ў:**

1) чэрвені 1917 г.;
2) жніўні 1917 г.;
3) кастрычніку 1917 г.;
4) студзені 1918 г.

**20. Пераход прыватных прадпрыемстваў і галін эканомікі, зямлі, транспарту, банкаў у дзяржаўную ўласнасць – гэта ... .**

**21. Прытрымлівалася ідэі пабудовы сацыялізму шляхам звяржэння Часовага ўраду, устанаўлення дыктатуры пралетарыяту і ажыццяўлення сусветнай пралетарскай рэвалюцыі:**

1) бальшавісцкая партыя;
2) меншавісцкая;
3) эсэраўская;
4) кадэцкая.



Репозиторий ВГУ

**22. Нямецкія войскі занялі Мінск у ... (месяц) ... года.**

**23. Згодна змяненням, якія былі ўнесены ў савецка-германскі дагавор ў жніўні 1918 г., немцы вызвалілі тэрыторыю Беларусі да ракі ... .**

**24. Мінск быў вызвалены ад нямецкіх акупантаў у ...?(месяц) ...? года.**

**25. "Рудабельская рэспубліка" – гэта:**

1) Тэрыторыя, што кантралявалася партызанамі ў гады нямецкай і польскай акупацыі Беларусі;

2) мясцовасць, дзе ўлада належала БНР;

3) неакупіраваная немцамі частка Заходняй Беларусі;

4) тэрыторыя Беларусі, якая адышла Расіі па Брэсцкаму мірнаму дагавору 1918 г.

**26. У выніку агрэсіі Польшчы была захоплена тэрыторыя Беларусі да ракі ... .**

**27. Падчас акупацыі Беларусі польскімі войскамі Пілсудскі дазволіў стварэнне БНР (так, не).**

**28. З польскімі войскамі змагаліся партызанскія атрады створаныя:**

1) бальшавікамі;

2) эсэрамі;

3) меншавікамі;

4) БНР.

**29. Мэтамі палякаў былі:**

1) далучэнне Беларусі да польскай дзяржавы;

2) стварэнне на тэрыторыі Беларусі незалежнай дзяржавы;

3) перадача Беларусі РСФСР;

4) аднаўленне на тэрыторыі Беларусі ВКЛ.

**30. Тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад польскіх войскаў у ... (месяц) ... года.**

## Тэма 10. Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці (1917–1927 гг.)

1. *Першы Усебеларускі з'езд.*
2. *БНР і яе роля ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці.*
3. *Утварэнне ССРБ і ЛітБел.*
4. *Аднаўленне ССРБ. Утварэнне СССР. Першае і другое ўзбуйненне БССР.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* БАК, Народны Сакратарыят, аўтаномія, Белнацкам, беларускія секцыі РКП(б), ССРБ, БССР, СССР, ЛітБел.

*Асобы:* А. Мяснікоў, Я. Канчар, І. Варонка, А. Луцкевіч, А. Чарвякоў, З. Жылуновіч.



Репозиторий ВГУ

*Храналогія:* час правядзення Першага Усебеларускага з’езда, час выдання 1-й Устаўнай граматы Выканкамам Усебеларускага з’езда, час выдання 2-й Устаўнай граматы, ... трэцяй, стварэнне Белнацкама, час выдання маніфеста аб абвяшчэнні ССРБ, прынящце рашэння ЦК РКП(б) аб выхадзе са складу ССРБ Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерній, час працы Першага Усебеларускага з’езда Саветаў, утварэнне ЛітБел, час прынящця 1-й Канстытуцыі ССРБ, час другога абвяшчэння ССРБ, час стварэння СССР, пачатак мірных перамоў у г. Рызе, першае узбуйненне БССР, другое ўзбуйненне БССР.

**Крыніцы:**


1. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост.: И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Мн., 2000.
2. Хрестоматия по истории БССР. 1917–1983 / сост.: А.П. Игнатенко, В.Н. Сидорцов, П.З. Савочкин, А.И. Сидоренко. – Мн., 1984.


**Літаратура абавязковая**:


1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX–XX стагоддзі.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2006. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг.
3. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1995. – Ч. 2.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2003. – Т. 6, кн. 1–2.


**Літаратура дадатковая:**


1. Багдановіч А. Праблемы нацыянальнай дзяржаўнасці: БНР, 1917–1918 гг. // Бел. думка. – 1996. – № 7. – С. 77–85.
2. Езавітаў К. Першы Усебеларускі з’езд // Бел. мінуўшчына. – Э1993. – № 1. – С. 25–29.
3. Круталевич В.А. История Беларуси: становление национальной дзержавности (1917–1922 гг.). – 2-е изд., доп. – Мн., 2003.
5. Ладысеў У.Ф., Брыгадін П.І. Паміж Усходам і Захадам. Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.). – Мн., 2003.
4. Міравовіч Я. Найноўшая гісторыя Беларусі. – СПб., 2003.
5. Рудовіч С. Час выбару: праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 г. – Мн., 2001.


Репозиторий ВГУ

У першым пытанні звярніце ўвагу на стаўленне розных палітычных сіл да праблемы беларускай дзяржаўнасці. Пакажыце ход падрыхтоўкі з’езда, барацьбу розных палітычных плыняў у час яго работы, вынікі працы і значэнне у далейшым лёсе фарміравання беларускай дзяржаўнасці.

У другім пытанні трэба разгледзець працэс утварэння БНР, паказаць адносіны да БНР нямецкіх акупацыйных улад, беларускага народа. Тут жа трэба ахарактарызаваць спробы лідэраў БНР дабіцца міжнароднага прызнання рэспублікі, прааналізаваць унутрыдзяржаўную дзейнасць урада БНР. Паспрабуйце даказаць ці абвергнуць факт дзяржаўнасці БНР.

У трэцім пытанні вызначце прычыны утварэння ССРБ. Пакажыце барацьбу ў гэтым пытанні паміж лідэрамі Аблвыкамзаха і Белнацкамам. Тут жа трэба разгледзець ход утварэння ССРБ і даць ацэнку яе дзяржаўнага статуса. Навошта была ЛітБел? Хто і як яе ствараў? На гэтыя пытанні Вы таксама павінны даць адказы.

У чацвёртым пытанні растлумачце: як, дзе і калі адбылося другое абвяшчэнне ССРБ? Тут жа пакажыце ўдзел прадстанікоў БССР у стварэнні СССР і статус рэспублікі ў гэтым утварэнні. У гэтым жа пытанні растлумачце, што такое “ўзбуйненне” БССР, вызначце яго прычыны, прадэманструйце тэратырыяльныя набыткі Беларусі і зрабіце высновы.

## Тэсты для самакантролю

**1. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| 1) 27.10.1917 г.; | А) І Усебеларускі з’езд Саветаў у Мінску; |
| 2) 20.11.1917 г.; | Б) прынятце Радай БНР 3-й Устаўнай граматы; |
| 3) 25.03.1918 г.; | В) Брэсцкі мір паміж Савецкай Расіяй і Германіяй; |
| 4) 2–3.02.1919 г.; | Г) захоп Стаўкі ў Магілёве рэвалюцыйнымі войскамі; |
| | Д) утварэнне КВР. |

**2. Назавіце горад, у якім 15–17 снежня 1917 г. адбыўся І Усебеларускі з’езд ... ?**

**3. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) вызваленне Мінска ад польскіх войскаў; | А) 1.07.1920 г.; |
| 2) загад № 1 Выканкама рады Усебеларускага з’езда; | Б) 10.12.1918 г.; |
| 3) вызваленне Мінска ад германскіх войскаў; | В) 19.02.1918 г.; |
| 4) з’езд Саветаў, які замацаваў перамогу савецкай улады ў Віцебскай губерні; | Г) 19.03.1918 г.; |
| | Д) 11.07.1920 г. |



Репозиторий ВГУ

**4. Суаднясіце:**

1) 2-гі з'езд Саветаў Заходняй вобласці;
2) роспуск І Усебеларускага з'езда;
3) стварэнне ВРК Заходняй вобласці і фронту;
4) захоп Мінска польскімі войскамі;

А) 2.11. 1917 г.;
Б) 14.04. 1918 г.;
В) 8.08. 1919 г.;
Г) 18.12. 1917 г.;
Д) 26.10. 1917 г.

**5. Суаднясіце:**

1) захоп Стаўкі рэвалюцыйнымі войскамі на чале з Крыленкам;
2) КВР;
3) Аблвыкамзах;
4) І Усебеларускі з'езд;

А) кастрычнік 1917 г.;
Б) 20 лістапада 1917 г.
В) чэрвень 1917 г.;
Г) 27 лістапада 1917 г.;
Д) снежань 1917 г.

**6. Суаднясіце:**

1) Маніфест Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада ССРБ;
2) 2-я Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларускага з'езда;
3) пастанова СНК Заходняй вобласці і фронту;
4) урад ЛітБел;

А) абвяшчэнне БНР;
Б) роспуск Усебеларускага з'езда;
В) абвяшчэнне БССР;
Г) курс на арганізацыю камун.

**7. Суаднясіце:**

1) Аблвыкамзах;
2) Белнацкам;
3) ВРК Заходняга фронту;
4) СНК Заходняй вобласці і фронту;

А) аддзел Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей РСФСР;
Б) выканаўчы орган савецкай улады на тэрыторыі Беларусі ў канцы 1917 г.;
В) вышэйшы заканадаўчы орган савецкай улады на тэрыторыі Беларусі ў к. 1917 – к. 1918 гг.;
Г) надзвычайны рэвалюцыйны орган, створаны для падрыхтоўкі і правядзення ўзброенага паўстання на Беларусі.

**8. Суаднясіце:**

1) Рада БНР;
2) 6-я Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б);
3) СНК Заходняй вобласці і фронту;
4) Першы Усебеларускі з'езд;

А) тэлеграма германскаму кайзеру;
Б) разгон першага Усебеларускага з'езда;
В) утварэнне ЛітБел ССР;
Г) стварэнне КП(б)Б.



Репозиторий ВГУ

**9. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) падпісанне сепаратнага міру Расіі і Германіі; | А) акупацыя ЗБ германскімі войскамі; |
| 2) Рыжскі мірны дагавор; | Б) далучэнне ЗБ да Польшчы; |
| 3) стварэнне дэмакратычнай краёвай улады ў Беларусі; | В) раскол БСГ; |
| 4) тэлеграма Рады БНР кайзеру Германіі; | Г) пазіцыя вялікай Беларускай Рады; |
| | Д) пазіцыя Аблвыкамзаха. |

**10. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) I з’езд КП(б)Б; | А) кастрычнік 1917 г.; |
| 2) I Усебеларускі з’езд; | Б) снежань 1917 г.; |
| 3) I Усебеларускі з’езд Саветаў; | В) снежань 1918 г.; |
| 4) II Усерасійскі з’езд Саветаў; | Г) люты 1919 г.; |
| | Д) снежань 1920 г. |

**11. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) 1-я Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларскага з’езда; | А) 31 студзеня 1918 г.; |
| 2) I Усебеларскі з’езд Саветаў; | Б) 25 сакавіка 1918 г.; |
| 3) утварэнне Белнацкама; | В) 21 лютага 1918 г.; |
| 4) 3-я Устаўная грамата Рады БНР; | Г) 2–3 лютага 1919 г.; |
| | Д) 20 лютага 1919 г. |

**12. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) 1-я Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларускага з’езда; | А) 3 сакавіка 1918 г.; |
| 2) стварэнне Рады БНР; | Б) 21 лютага 1918 г.; |
| 3) I Усебеларускі з’езд; | В) 18 сакавіка 1918 г.; |
| 4) падпісанне Брэсцкага міру; | Г) снежань 1917 г.; |
| | Д) 5 сакавіка 1918 г. |

**13. Суаднясіце:**

| | |
|---|---|
| 1) падпісанне Рыжскага міру; | А) 31 ліпеня 1920 г.; |
| 2) другое абвяшчэнне ССРБ; | Б) 18 сакавіка 1921 г.; |
| 3) канчатковае ўсталяванне савецкай улады ў Мінску; | В) 27 кастрычніка 1917 г.; |
| 4) стварэнне КВР; | Г) 15 ліпеня 1920 г.; |
| | Д) 2 лістапада 1917 г. |

**14. Ініцыятарамі склікання I Усебеларускага з’езда былі:**

1) ВБР;
2) БАК;
3) Аблвыкамзах;
4) СНК Заходняй вобласці.



Репозиторий ВГУ

**15. На І Усебеларускім з'ездзе ВБР ставіла пытанне аб:**
1) самастойнасці Беларусі;
2) аўтаноміі ў складзе Савецкай Расіі;
3) захаванні Беларусі ў якасці Заходняй вобласці Савецкай Расіі;
4) аднаўленні федэрацыі з Польшчай.
**16. Першы Усебеларускі з'езд:**
1) паспяхова завяршыў сваю працу;
2) быў разагнаны бальшавікамі;
3) перапыніў работу да ўтварэння БССР;
4) на з'ездзе была ўтворана БНР.
**17. Першая Устаўная грамата была выдадзена Выканкамам Савета Усебеларускага з'езда ... лютага ... года.**
**18. Аб стварэнні Народнага Сакратарыята аб'яўлялася ў:**
1) Першай Устаўнай грамаце;
2) 2-й;
3) 3-й;
4) 4-й.
**19. Прыватная ўласнасць на зямлю касавалася ў:**
1) Першай Устаўнай грамаце;
2) 2-й;
3) 3-й;
4) 4-й.
**20. Незалежнасць БНР была аб'яўлена ў:**
1) Першай Устаўнай грамаце;
2) 2-й;
3) 3-й;
4) 4-й.
**21. Германія:**
1) прызнала БНР;
2) не прызнала БНР;
3) прызнала часткова;
4) адклала гэта пытанне да заканчэння Першай сусветнай вайны.
**22. Актыўны ўдзел у стварэнні БНР прымалі:**
1) З. Жылуновіч;
2) Т. Грыб;
3) І. Варонка;
4) А. Мяснікоў.
**23. Ідэю стварэння Беларускай Рэспублікі на савецкай аснове падтрымлівалі:**
1) З. Жылуновіч;
2) Т. Грыб;
3) І. Варонка;
4) А. Мяснікоў.



Репозиторий ВГУ

**24. ССРБ была абвешчана ... студзеня ... года.**

**25. Старшынёй першага ўрада ССРБ стаў ... (прозвішча).**

**26. Згодна устаноўкам ЦК РКП(б) ССРБ адводзілася роля ... дзяржавы на мяжы з буржуазнай Еўропай.**

**27. Першая Канстытуцыя ССРБ была зацверджана на:**

1) Першым Усебеларускім з’ездзе Саветаў;
2) Першым з’ездзе КП(б)Б у Смаленску;
3) Першым з’ездзе РКП(б);
4) Першым з’ездзе Саветаў СССР.

**28. У склад ССРБ (паведле рашэнняў Першага Усебеларускага з’езда) увайшлі:**

1) Віцебская губернія;
2) Магілёўская;
3) Мінская;
4) Гродзенская.

**29. Другое абвяшчэнне ССРБ адбылося ... ліпеня ... года.**

**30. У выніку другога абвяшчэння ССРБ тэрыторыя яе была зведзена да 6 паветаў ... губерніі.**

## Тэма 11. БССР у гады НЭПа (1921–1928 гг.)

1. *Аднаўленне і развіццё эканомікі БССР у гады НЭПа.*
2. *Грамадска-палітычнае жыццё. Палітыка беларусізацыі.*
3. *Культура БССР у 1920-я гг.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* “ваенны камунізм”, НЭП, камуна, арцель, СНГ, трэст, гаспадарчы разлік, нацыянал-дэмакраты, беларусізацыя, Інбелкульт, “Прэч непісьменнасць”, рабфак, “пралетарызацыя”, “Маладняк”, “Узвышша”, “Полымя”, “Юнгер арбайтер”, “Вызваленне працы”, “Салавей”, “Лясная быль”.

*Асобы:* А. Хацкевіч, С. Некрашэвіч, У. Пічэта, У. Ігнатоўскі, М. Чарот, Ц. Гартны, А. Дудар, М. Зарэцкі, К. Чорны, У. Галубок, Е. Міровіч, Г. Глебаў, Л. Ржэцкая, С. Станюта, А. Ільінскі, М. Чуркін, М. Крошнер, Л. Александроўская, Ю. Тарыч, В. Волкаў, М. Манасзон, Я. Зайцаў, В. Бялыніцкі-Біруля, А. Воінаў.

*Храналогія:* афіцыйнае прыняцце НЭПа, час афіцыйнага зацвярджэння палітыкі беларусізацыі, час стварэння таварыства “Прэч непісьменнасць”, час увядзення абавязковага пачатковага навучання, час адкрыцця БДУ, час адкрыцця Віцебскага ветэрынарнага інстытута, час адкрыцця Інбелкульта, прыняцце 2-ой Канстытуцыі БССР, пераўтварэнне Інбелкульта ў АН, час адкрыцця БДТ-1 і БДТ-2, час пастаноўкі першай беларускай савецкай оперы, час адкрыцця ў Віцебску мастацкага тэхнікума.

Рэпазіторый ВГУ

**Крыніцы:**

1. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост.: И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Мн., 2000.
2. Хрестоматия по истории БССР. 1917–1983 / сост.: А.П. Игнатенко, В.Н. Сидорцов, П.З. Савочкин, А.И. Сидоренко. – Мн., 1984.

**Літаратура абавязковая:**

1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX –XX стагоддзі.
2. Гісторыя Беларусі: у 6-і т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2006. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг.
3. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1995. – Ч. 2.
4. Экономическая история Беларуси: учебн. пособие / под ред. проф. В.И. Голубовича. – 3-е изд. доп. – Мн., 2004.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2003. – Т. 6, кн. 1–2.

**Літаратура дадатковая:**

1. Беларусізацыя. Зб. дакументаў. – Мн., 2004.
2. Бяспалая М.А. Беларуская вёска ў першыя гады НЭПа (1921–1923 гг.). – Мн., 1999.
3. Восстановление народного хозяйства Белоруской ССР. – Мн., 1981.
4. Мірановіч Я. Найноўшая гісторыя Беларусі. – СПб., 2003.
5. Мяснікоў А.Ф. Нацдэмы: Лёс і трагедыя Ф. Шантыра, У. Ігнатоўскага і Я. Лёсіка. – Мн., 1993.
6. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі. 1917–1945 гг. – Мн., 1993.
7. Перед крутым поворотом. Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925–1928 гг.). Отражение времени в архивных документах. – Мн., 2001.
8. Платонаў Р. Палітыкі, ідэі, лёсы. Грамадзянскія пазіцыі ва ўмовах нарастання ідэолага-палітычнага дыктату ў Беларусі 1920–1930-х гадоў. – Мн., 1996.
9. Ходзін С.М. Гісторыя культуры Беларусі ў 1920–1930-я гг. – Мн., 2001.

У першым пытанні ахарактарызуйце стан эканомікі Беларусі на пачатку 1921 года і растлумачце прычыны ўвядзення НЭПа. Прааналізуйце складаныя часткі НЭПа, пакажыце ход яе рэалізацыі, станоўчыя і адмоўныя бакі, растлумачце прычыны згортвання новай эканамічнай палітыкі ў канцы 20-х гг. XX ст.

Репозиторий ВГУ

У другім пытанні ахарактарызуйце стан грамадска-палітычнага жыцця на Беларусі, патлумачце яго асноўную накіраванасць і пакажыце яго асаблівасці ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі СССР. Тут жа дайце тлумачэнне сутнасці палітыкі беларусізацыі. Пакажыце працэс яе ажыццяўлення, выявіце станоўчыя і адмоўныя бакі, ахарактарызуйце дасягненні і растлумачце прычыны згортвання.

У трэцім пытанні пакажыце працэс станаўлення і развіцця культуры Беларусі. Пры гэтым звярніце ўвагу на развіццё адукацыі, навукі, літаратуры і мастацтва. Пакажыце дасягненні і пралікі ў развіцці культуры гэтага часу, адносіны правячай партыі да працэсаў культурнага развіцця і ступень свабоды творчасці ў 1920-ыя гг.

## Тэсты для самакантролю

**1. Вылучэнне мясцовых жыхароў, у першую чаргу беларусаў, на партыйную, савецкую, прафсаюзную і іншую грамадскую работу ў 20-я гг. ХХ ст. атрымала назву ... – .**

**2. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
1) першае узбуйненне БССР;
2) 14 з’езд УКП(б);
3) 2-я Канстытуцыя БССР;
4) другое ўзбуйненне БССР.

**3. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
1) стварэнне АН БССР;
2) стварэнне СССР;
3) выхад у свет першага беларускага мастацкага фільма;
4) стварэнне кінастудыі “Савецкая Беларусь”.

**4. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
1) пачатак НЭПа;
2) другое ўзбуйненне БССР;
3) адкрыццё БДТ-1;
4) афіцыйны пачатак палітыкі беларусізацыі.

**5. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
1) другое ўзбуйненне тэрыторыі БССР;
2) дагавор аб ваенна-палітычным саюзе савецкіх рэспублік;
3) IV Усебеларскі з’езд Саветаў;
4) I Усесаюзны з’езд Саветаў.

**6. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
1) пачатак Кранштацкага мяцяжу;
2) дагавор аб ваенным саюзе паміж РСФСР і БССР;
3) X з’езд РКП(б);
4) IV Усебеларускі з’езд Саветаў.



Репозиторий ВГУ

**7. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
1) IV Усебеларускі з’езд Саветаў;
2) XV з’езд УКП(б);
3) I Усесаюзны з’езд Саветаў;
4) II Берлінская канферэнцыя Рады БНР.
8**. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
1) Арганізацыя Інбелкульта;
2) стварэнне АН БССР;
3) прынясце курсу на індустрыялізацыю;
4) адкрыццё БДУ.
**9. Форма арганізацыі працы, пры якой адбываецца добраахвотнае аб’яднанне людзей для сумеснай арганізацыі працы, гандлю і г.д., – гэта ... .**
**10. Палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР у 1920-я гг., – гэта ...?(тэрмін).**
**11. Палітыка НЭПа ў БССР у 20-я гг. XX ст. прадугледжвала:**
1) нацыяналізацыю прамысловасці;
2) адмену працоўных мабілізацый;
3) увядзенне прамога прадукта абмену паміж горадам і вёскай;
4) адмену ўраўняльнай аплаты працы.
**12. Ці правільна, што: а) НЭП была выклікана страхам бальшавікоў страціць уладу ў краіне; б) антысавецкімі выступленнямі сялян:**
1) правільна а);
2) правільна б);
3) абодва сцвярджэнні правільныя;
4) абодва сцвярджэнні няправільныя.
**13. “Культурная рэвалюцыя “як комплекс мерапрыемстваў у галіне навукі, культуры, адукацыі ў канцы 20-х гг. XX ст. у БССР” уключала:**
1) вылучэнне беларусаў на адказную работу;
2) ліквідацыю непісьменнасці;
3) палітычны плюралізм;
4) паслядоўнае ўвядзенне прынцыпу сацыялістычнага рэалізму.
**14. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
1) аб’яўленне Беларускай ПСР аб “самароспуску”;
2) афармленне ў БССР таварыства “Прэч непісьменнасць”;
3) Берлінская канферэнцыя Рады БНР;
4) дагавор аб утварэнні СССР.


Репозиторий ВГУ

**15. Перасяленне сялян з вёсак на хутары праводзілася ў 20-я гг. XX ст. ў БССР з мэтай:**

1) зніжэння сацыяльнай напружанасці;

2) ліквідацыі цераспалосіцы;

3) павышэння эфектыўнасці с/г;

4) сацыялістычнай перабудовы вёскі.

**16. БелДрэс пачала будавацца ў ... годзе.**

**17. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

1) афармленне ў БССР таварыства "Прэч непісьменнасць";

2) адкрыццё БДУ;

3) стварэнне Першага Беларускага дзяржаўнага тэатра;

4) адкрыццё АН БССР.

**18. У аптовым гандлі ў БССР у сярэдзіне 20-х гг. XX ст. вядучую ролю адыгрывалі прадпрыемствы:**

1) дзяржаўныя;

2) кааператыўныя;

3) прыватныя;

4) замежныя.

**19. Пастаноўка першай беларускай савецкай оперы была ажыццёўлена ў ... годзе. Аўтарам яе з'яўляўся ... (прозвішча).**

**20. Новая эканамічная палітыка ў 20-х гг. XX ст. была дапоўнена рэфармаваннем палітычнай сістэмы (так, не).**

**21. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

1) афармленне ў БССР таварыства "Прэч непісьменнасць";

2) перавод амаль 80% агульнаадукацыйных школ на беларускую мову;

3) адкрыццё Беларускай акадэміі навук;

4) пастаноўка першай савецкай оперы ў БССР.

**22. НЭП праводзілася з мэтай(мі):**

1) ліквідаваць сацыяльную напружанасць у грамадстве;

2) палепшыць палітычную сістэму савецкага грамадства;

3) з дапамогай прыватніка паскорыць аднаўленне народнай гаспадаркі;

4) увядзення шматпартыйнасці.

**23. Асноўнымі задачамі НЭПа ў БССР былі:**

1) выкарыстанне прыватных сродкаў у інтарэсах аднаўлення гаспадаркі;

2) умацаванне саюзу рабочага класа і сялянства на эканамічнай аснове;

3) стварэнне ўмоў для будаўніцтва капіталістычнага грамадства;

4) недапушчэнне капіталістычных элементаў у эканоміку.

Рэпазіторый ВГУ

**24. Асноўнымі прычынамі згортвання НЭПа былі:**

1) імкненне кіраўніцтва краіны поўнасцю ўзяць у свае рукі кіраўніцтва эканомікай;

2) недапусціць далейшага распаўсюджвання “капіталістычных элементаў” у дзяржаве;

3) ціск з боку капіталістычных краін;

4) усведамленне кіраўніцтвам краіны, што НЭП поўнасцю вычарпаў свае эканамічныя магчымасці.

**25. Назавіце горад, дзе была створана кінастудыя “Савецкая Беларусь”.**

**26. НЭП была згорнута, у асноўным ужо ў ... годзе.**

**27. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

1) аб’яўленне Радай БНР аб сваім самароспуску;

2) пачатак правядзення беларусізацыі;

3) далучэнне да БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў;

4) аб’яўленне савецкім урадам амністыі беларускім палітычным і культурным дзеячам, членам беларускіх нацыянальных урадаў і партый.

**28. БССР увайшла ў склад СССР у ... годзе.**

**29. Форма дзяржаўнага будаўніцтва, пры якой дзяржавы, якія утвараюць саюз, падпарадкоўваюцца адзінаму цэнтру і пры гэтым захоўваюць самастойнасць у рашэнні асобных пытанняў унутранай палітыкі, мае назву ... .**

**30. Аўтар рамана “Сокі цаліны”, – ... (прозвішча).**

## Тэма 12. БССР у канцы 20-х–30-я гг. ХХ ст.

1. *Індустрыялізацыя ў БССР і яе асаблівасці.*
2. *Усеагульная калектывізацыя сельскай гаспадаркі: прычыны, ход, вынікі.*
3. *Фарміраванне адміністрацыйна-каманднай сістэмы.*
4. *Культура БССР у 30-х гг. ХХ ст.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* індустрыялізацыя, усеагульная калектывізацыя, “галавакружэнне ад поспехаў”, “год вялікага пералому”, БелДрэс, МТС, кулакі, раскулачванне, арцель, камуна, таталітарызм, СВБ, аўтарытарызм, сталінізм.

*Асобы:* З. Прышчэпаў, М. Аладаў, П. Броўка, Бялыніцкі-Біруля, М. Гікала, У. Галубок, М. Зарэцкі, І. Лангбард, А. Чарвякоў, А. Глебаў, А. Дудар.

*Храналогія:* час зацвярджэння першага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі БССР, гады першай і другой пяцігодак, час заснавання першай МТС, увядзенне ў БССР усеагульнага сямігадовага навучання, час адкрыцця Беларускай дзяржаўнай

Репозиторий ВГУ

кансерваторыі і Беларускага тэатра оперы і балета, філармоніі, рэформа беларускага правапісу, прыняцце 3-й Канстытуцыі БССР, стварэнне ў БССР першых абласцей.

**Крыніцы:**


1. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост.: И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Мн., 2000.
2. Хрестоматия по истории БССР. 1917–1983 / сост.: А.П. Игнатенко, В.Н. Сидорцов, П.З. Савочкин, А.И. Сидоренко. – Мн., 1984.


**Літаратура абавязковая**:


1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX –XX стагоддзі.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2006. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг.
3. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1995. – Ч. 2.
4. Экономическая история Беларуси: учебн. пособие под ред. проф. В.И. Голубовича. – 3-е изд. доп. – Мн., 2004.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2003. – Т. 6, кн. 1–2.


**Літаратура дадатковая**:


1. Адамушка У.І. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. – Мн., 1994.
2. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / І.М. Абрамаў [і інш.]. – Мн., 2000.
3. Касцюк М.П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. – Мн., 2000.
4. Парашкоў С.А. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн., 2003.
5. Міранovіч Я. Найноўшая гісторыя Беларусі. – СПб., 2003.
6. Платонаў Р.П. Беларусь у міжваенны перыяд. – Мн., 2001.


У першым пытанні ахарактарызуйце прычыны, якія выклікалі індустрыялізацыю. Пакажыце, за кошт якіх сродкаў праводзілася індустрыялізацыя, параўнайце яе з аналагічнымі працэсамі ў іншых краінах. Вызначце асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў БССР. Прадэманструйце фактычныя дасягненні і пралікі індустрыялізацыі, зрабіце адпаведныя высновы.

У другім пытанні вызначце неабходнасць суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Ахарактарызуйце яе ход, пакажыце, якімі тэмпамі і з дапамогай якіх сродкаў яна ажыццяўлялася. Звярніце ўвагу на карэнную ломку сацыяльна-эканамічнага ўкладу вёскі ў выніку дадзеных мерапрыемстваў і наступствы гэтага працэсу для сялянства. Зрабіце адпаведныя высновы.



Репозиторий ВГУ

У трэцім пытанні дайце тлумачэнне паняцця “каманднаадміністрацыйная сістэма” і пакажыце працэс складвання яе на Беларусі ў азначаны перыяд. Пры гэтым ахарактарызуйце яе “агульнасаюзныя” рысы і прадэманструйце “беларускую” спецыфіку.

У чацвёртым пытанні ахарактарызуйце узровень развіцця культуры на Беларусі. Пакажыце яе канкрэтныя дасягненні ў галіне адукацыі, літаратуры і мастацтва. Адзначце недахопы і скажэнні. Вызначце ступень уплыву на культуру партыйна-дзяржаўных структур рэспублікі. Параўнайце стан культуры ў БССР і культуру Беларусі часоў РІ. Зрабіце адпаведныя высновы.

## Тэсты для самакантролю

**1. Вынікамі правядзення індустрыялізацыі ў 30-я гг. XX ст. у БССР стала:**

1) ліквідацыя беспрацоўя;

2) адмена картачнай сістэмы;

3) паляпшэнне матэрыяльнага становішча ўсіх слаёў насельніцтва;

4) пераход да інтэнсіўнай эканомікі.

**2. Не абмежаваная ніякімі законамі прымусовая ўлада адной асобы, групы людзей обо партыі, – гэта ... (тэрмін).**

**3. Працэс стварэння буйной машыннай індустрыі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і перш за ўсё ў прамысловасці, – гэта ... (тэрмін).**

**4. Мастацкі метад, які патрабаваў адлюстравання ў літаратуры і мастацтве толькі тых рэалій жыцця, якія былі звязаны з будаўніцтвам савецкага сацыялістычнага ладу ў СССР, – гэта ...? (тэрмін).**

**5. Асаблівасцю правядзення індустрыялізацыі ў БССР было тое, што:**

1) на Беларусі развіваліся галіны перш за ўсё цяжкай прамысловасці;

2) лёгкай;

3) галіны, звязаныя з вытворчасцю высокатэхналагічнага абсталявання;

4) нафтаперапрацоўчыя галіны.

**6. Сродкамі для індустрыялізацыі былі:**

1) замежныя крэдыты;

2) замежныя інвестыцыі;

3) грашовыя паступленні ад экспарту зерня;

4) “займы індустрыялізацыі”.



Репозиторий ВГУ

**7. Першая пяцігодка пачалася ў:**

1) 1925/26 гг.

2) 1927/28 гг.

3) 1928/29 гг.

4) 1929/30 гг.

**8. Выпраўце памылкі. У першай пяцігодцы індустрыялізацыі на Беларусі грашовыя сродкі ўкладваліся ў развіццё наступных галін прамысловасці:**

1) аўтамабільнай;

2) харчовай;

3) дрэваапрацоўчай;

4) нафтаперапрацоўчай.

**9. Правядзенне індустрыялізацыі вельмі хуткімі тэмпамі па прапанове І. Сталіна пад лозунгам "Пяцігодку – у чатыры гады" складае змест паняцця:**

1) мадэрнізацыя;

2) інтэнсіфікацыя вытворчасці;

3) звышіндустрыялізацыя;

4) рэформа.

**10. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| 1) Швейная фабрыка "Сцяг індустрыялізацыі"; | А) Мінск; |
| 2) Завод сельгасмашын; | Б) Віцебск; |
| 3) Цэментны завод; | В) Гомель; |
| 4) Радыёзавод; | Г) Крычаў. |

**11. Першай буйной электрастанцыяй, пабудаванай у БССР, была ... (абрывіятура).**

**12. Курс на калектывізацыю сельскай гаспадаркі быў узяты на ... з'ездзе УКП(б).**

**13. Метады правядзення калектывізацыі:**

1) паступовасць;

2) без насілля над сялянамі;

3) добраахвотнасць;

4) гвалт і запалохванне.

**14. "Год вялікага пералому":**

1) 1928 г.;

2) 1929 г.;

3) 1930 г.;

4) 1931 г.

**15. У насаджэнні хутарской формы землекарыстання, "правым ухіле", абвінавацілі:**

1) М. Гікала;

2) А. Крыніцкага;



Репозиторий ВГУ

3) З. Жылуновіча;

4) З. Прышчэпава.

**16. Першая МТС на Беларусі пачала дзейнічаць у ... (назва мясцовасці).**

**17. Першая МТС на Беларусі пачала дзейнічаць у ...? (годзе).**

**18. У выніку ажыццяўлення індустрыялізацыі:**

1) створана высокаразвітая прамысловасць;

2) вырашана праблема беспрацоўя;

3) рабочыя сталі атрымліваць высокія заробкі;

4) вырашана жыллёвае пытанне.

**19. Адметнымі рысамі грамадска-палітычнага жыцця ў 1930-я гады з'яўлялася:**

1) шматпартыйнасць;

2) выбары дэпутатаў Саветаў на альтэрнатыўнай аснове;

3) парушэнне правоў чалавека;

4) Канстытуцыя забяспечвала недатыкальнасць асобы.

**20. Справа "нацыянал-дэмакратаў", якая была сфабрыкавана супраць беларускай інтэлігенцыі:**

1) справа промпартыі;

2) ... "Саюза вызвалення Беларусі";

3) ... "Саюза творчых работнікаў Беларусі";

4) ... "Саюза нацдэмаў".

**21. Канстытуцыя "перамогшага сацыялізму" была прынята ў БССР у ... годзе.**

**22. У БССР у канцы 20-х – 1930 гг. усталявалася сістэма, якую сучасныя гісторыкі вызначаюць як "... сацыялізм."**

**23. Сярод пацярпелых ад рэпрэсій у канцы 20-х – 1930 гг. былі:**

1) М. Галадзед;

2) М. Гікала;

3) А. Луцкевіч;

4) А. Мяснікоў.

**24. Пазнайце асобу:**

*Яго опера "У пушчах Палесся" прысвячалася барацьбе беларускіх партызан супраць польскіх акупантаў (лібрэта напісана па аповесці Я. Коласа "Дрыгва"). За гэты твор яму прысуджана Сталінская прэмія (прозвішча кампазітара).*

**25. Пазнайце асобу:**

Па праектах гэтага архітэктара пабудаваны Дом урада ў Мінску, тэатр оперы і балета ў Мінску, Дом ЧА ў Мінску (прозвішча).

**26. Тэатр оперы і балета быў адкрыты ў Мінску ў ... годзе.**

**27. Беларуская кансерваторыя пачала працаваць у ... годзе.**

Репозиторий ВГУ

**28. Адна з найлепшых у савецкай драматургіі даваеннага часу камедый, у якой высмейваецца паклёпніцтва, авантурызм, ілжэвучонасць:**

1) "Салавей";
2) "Кветка шчасця";
3) "Хто смяецца апошнім";
4) "Таблетка пад язык".

**29. БДТ-2 працаваў у горадзе ... .**

**30. Беларуская дзяржаўная філармонія была заснавана ў ... годзе.**

## Тэма 13. Становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы

1. *Узровень і асаблівасці прамысловага і сельскагаспадарчага развіцця.*
2. *Палітычнае і нацыянальна-прававое становішча беларускіх зямель.*
3. *Нацыянальна-вызваленчы рух у ЗБ.*
4. *Культура Заходняй Беларусі.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* паветы, ваяводствы, гміны, "крэсы ўсходнія," парцэляцыя, камасацыя, санацыя, ТБШ, БІГіК, БНТ, БПС-Р, "Беларускі партызан", дэфензіва, "працэс 72-х", Беларускі пасольскі клуб, БРА, БСДП, БХД, КПЗБ, Бяроза-Картузская, "пацыфікацыя", БСРГ, "Змаганне".

*Асобы:* А. Станкевіч, У. Жылка, Пестрак, В. Таўлай, М. Васілёк, М. Краўцоў, Б. Тарашкевіч, І. Дварчанін, П. Сергіевіч, Я. Драздовіч, М. Сеўрук, Р. Шырма, М. Забэйда-Суміцкі, У. Пракулевіч, К. Арлоўскі, С. Ваўпшасаў, В. Корж, А. Рабцэвіч, П. Аляксюк, В. Гадлеўскі, С. Мертэнс, А. Славінскі, С. Прытыцкі.

*Храналогія:* час пачатку працы ТБШ і БІГіК, час стварэння КПЗБ, час стварэння БСРГ, час роспуску КПЗБ, пачатак забастоўкі нарачанскіх рыбакоў, стварэнне канцэнтрацыйнага лагера на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

**Крыніцы:**


1. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост.: И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Мн., 2000.
2. Хрестоматия по истории БССР. 1917–1983 / сост.: А.П. Игнатенко, В.Н. Сидорцов, П.З. Савочкин, А.И. Сидоренко. – Мн., 1984.


**Літаратура абавязковая**:


1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX –XX стагоддзі.




Репозиторий ВГУ

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2006. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг.
3. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1995. – Ч. 2.
4. Экономическая история Беларуси: учебн. пособие / под ред. проф. В.И. Голубовича. – 3-е изд. доп. – Мн., 2004.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2003. – Т. 6, кн. 1–2.

**Літаратура дадатковая:**

1. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / І.М. Абрамаў [і інш.]. – Мн., 2000.
2. Кухарев Б.Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг). – Мн., 1975.
3. Ладысеў У.Ф. Шлях да свабоды. З гісторыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. – Мн., 1978.
4. Лазько Р.Р. Перад патопам (Еўрапейская палітыка Польшчы. 1932–1939 гг.). – Мн., 2000.
5. Мірановіч Я. Найноўшая гісторыя Беларусі. – СПб., 2003.
6. Ходзін С.М. Гісторыя культуры Беларусі ў 1920–1930-я гг. – Мн., 2001.

У першым пытанні ахарактарызуйце эканамічную палітыку польскай дзяржавы на “крэсах усходніх”. Пакажыце, з чаго зыходзілі ўлады, вызначаючы эканамічнае развіццё ЗБ, якія галіны народнай гаспадаркі тут развіваліся. Прасачыце дынаміку станаўлення і развіцця рабочага класа, яго колькасны склад, узровень прафесійнай падрыхтоўкі і агульны вес у насельніцтве ЗБ. Прадэманструйце узровень развіцця сельскай гаспадаркі, спробы яе рэфармавання і вынікі гэтых рэформ. Зрабіце адпаведныя вынікі аб узроўні і асаблівасцях развіцця эканомікі ЗБ у 1921–1939 гг.

У другім пытанні ахарактарызуйце становішча беларускай нацыі ў складзе Польскай дзяржавы. Звярніце ўвагу на такія факты, як удзел беларусаў у рабоце дзяржаўных органаў, магчымасць спавядаць пэўную рэлігію, магчымасць абіраць і быць абранымі ў вышэйшыя органы кіравання дзяржавай. Прааналізуйце афіцыйную палітыку польскіх улад у гэтым накірунку. Зрабіце адпаведныя высновы.

У трэцім пытанні пакажыце прычыны разгортвання нацыянальна-вызваленчага руху ў ЗБ. Ахарактарызуйце яго ўдзельнікаў, іх праграмы, формы руху, асаблівасці разгортвання, поспехі і пралікі. Падсумуйце вынікі і зрабіце адпаведныя высновы.

У чацвёртым пытанні ахарактарызуйце стан культуры ў ЗБ. Пакажыце, якія яе жанры былі найбольш развіты. Прааналізуйце



Рэпазіторый ВДУ

дзейнасць найбольш вядомых яе прадстаўнікоў і дайце ацэнку іх укладу ў станаўленне беларускай культуры. Вызначце стаўленне афіцыйных польскіх улад да праблем беларускай культуры і прадэманструйце гэта на канкрэтных прыкладах. Падсумуйце вынікі і зрабіце пэўныя высновы.

### Тэсты для самакантролю

**1. Ці правільна, што нацыянальна-дэмакратычны напрамак у вызваленчым руху ЗБ прадстаўляла:** а) КПЗ; б) ТБШ:

1) правільна а);
2) правільна б);
3) абодва сцвярджэнні правільныя;
4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**2. Ці правільна, што рашэнне аб роспуску КПЗБ было прынята: а) выканкамам Камінтэрна; б) польскімі ўладамі:**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) абодва сцвярджэнні правільныя;
4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**3. Ці правільна, што заходнебеларускія землі, якія паводле Рыжскага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. увайшлі ў склад Польшчы, былі падзелены на: а) ваяводствы; б) паветы:**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) два сцвярджэнні правільныя;
4) два сцвярджэнні няправільныя.

**4. Ці правільна, што ў ЗБ ў канцы 20-х гг. XX ст. назву “Змаганне” мела: а) эсэраўская падпольная арганізацыя; б) фракцыя беларускіх дэпутатаў у польскім сейме:**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) два сцвярджэнні правільныя;
4) два сцвярджэнні няправільныя.

**5. У 20-я гг. XX ст. на тэрыторыі ЗБ нелегальныя формы нацыянальна-вызваленчай барацьбы выкарыстоўвалі:**

1) КПЗБ;
2) ТБШ;
3) ПСР;
4) БСРГ.

**6. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

1) уключэнне ЗБ у склад БССР;
2) стварэнне Інбелкульта;



Репозиторий ВГУ

3) адкрыццё Беларускай акадэміі навук;

4) пачатак пераходу да НЭПа.

**7. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

1) пачатак паходу Чырвонай Арміі ў ЗБ;

2) далучэнне да БССР паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў;

3) XV з’езд ВКП(б);

4) адкрыццё Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

**8. КПЗБ была заснавана ў ... годзе.**

**9. Масавая культурна-асветніцкая арганізацыя, створаная ў ЗБ ў 1921 г., гэта … (абрывіятура).**

**10. Дэманстрацыя сялян у мястэчку Косава Палескага ваяводства (люты 1927 г.), расстраляная паліцыяй, з’ўлялася пратэстам супраць:**

1) нізкай зарплаты;

2) закрыцця беларускіх школ;

3) роспуску КПЗБ;

4) разгрому БСРГ.

**11. Нацыянальна-дэмакратычны напрамак у вызваленчым руху ЗБ прадстаўляла:**

1) КПЗБ;

2) БХД;

3) БПС-Р;

4) БСРГ.

**12. Гістарычная падзея, у час якой адбывалася ўз’яднанне Заходняй і Усходняй Беларусі, гэта:**

1) завяршэнне этапу суцэльнай калектывізацыі ў СССР;

2) пачатак Другой сусветнай вайны;

3) стварэнне Версальска-Вашынгтонскай сістэмы;

4) усталяванне санацыйнага рэжыму ў Польшчы.

**13. Кіраўнікі партызанскага руху на тэрыторыі ЗБ гэта:**

1) К. Арлоўскі; 2) В. Корж; 3) П. Машэраў; 4) К. Мазураў.

**14. БСРГ выступала за:**

1) стварэнне рабоча-сялянскага ўрада;

2) перадачу зямлі мяшчанам;

3) камасацыю;

4) ліквідацыю сістэмы асаднацтва.

**15. Ці правільна, што палітычны і эканамічны рэжым, які быў усталяваны ў ЗБ ў 1926 г., атрымаў назву: а) санацыі; б) пацыфікацыі:**

1) правільна а);

2) правільна б);

3) абодва сцвярджэнні правільныя;

4) абодва сцвярджэнні няправільныя.



Репозиторий ВГУ

**16. Ці правільна, што нацыянальны і сацыяльны прыгнёт у ЗБ у 1921–1939 гг. стаў прычынай: а) паланізацыі; б) эміграцыі:**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) два сцвярджэнні правільныя;
4) два сцвярджэнні няправільныя.

**17. Вызваленчы паход ЧА ў ЗБ і Украіну пачаўся:**

1) 3 верасня 1939 г.;
2) 16 верасня 1939 г.;
3) 17 верасня 1939 г.;
4) 27 верасня 1939 г.

**18. Ці правільна, што польскі ўрад на землях ЗБ пад маркай ліквідацыі цераспалосіцы праводзіў: а) пацыфікацыю; б) секулярызацыю;**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) два сцвярджэнні правільныя;
4) два сцвярджэнні няправільныя.

**19. Ці правільна, што польскі ўрад на землях ЗБ пад маркай ліквідацыі цераспалосіцы праводзіў: а) парцэляцыю; б) камасацыю:**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) два сцвярджэнні правільныя;
4) два сцвярджэнні няправільныя.

**20. Ці правільна, што напрамкам зямельнай рэформы 1920-х гг. у Польшчы і ЗБ была: а) санацыя; б) камасацыя:**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) два сцвярджэнні правільныя;
4) два сцвярджэнні няправільныя.

**21. Ці правільна, што напрамкам зямельнай рэформы 1920-х гг. у Польшчы і ЗБ былі: а) камасацыя; б) парцэляцыя:**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) два сцвярджэнні правільныя;
4) два сцвярджэнні няправільныя.

**22. Ці правільна, што нацыянальны і сацыяльны прыгнёт у ЗБ ў 1921–1939 гг. з'явіўся прычынай: а) нацыянальна-вызваленчай барацьбы; б) асадніцтва:**

1) правільна а);
2) правільна б);
3) два сцвярджэнні правільныя;
4) два сцвярджэнні няправільныя.


Репозиторий ВГУ

**23. Мастак, аўтар шэрагу карцін на касмічную тэму:**
1) Я. Скурко;
2) П. Пестрак;
3) Я. Драздовіч;
4) Ф. Рушчыц.

**24. Ці правільна, што адным з праяў нацыянальнага гнёту насельніцтва ЗБ з боку польскіх улад стала: а) закрыццё праваслаўных цэркваў; б) закрыццё уніяцкіх цэркваў:**
1) правільна а);
2) правільна б);
3) абодва сцвярджэнні правільныя;
4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**25. Аўтарам карцін “Усяслаў Полацкі”, “Беларусы”, “Дарогай жыцця” з’яўляецца:**
1) Ф. Рушчыц;
2) Я. Драздовіч;
3) П. Сергіевіч;
4) В. Ванькові.

**26. Літаратары, якія працавалі ў ЗБ, – гэта:**
1) М. Танк;
2) А. Куляшоў;
3) М. Касцевіч;
4) П. Пястрак.

**27. Працэс засваення адным народам мовы, культуры і другіх этнічных прыкмет іншага народа да поўнага зліцця з ім, называецца ... .**

**28. Ці правільна, што буйнейшымі прадпрыемствамі ЗБ з’яўляліся: а) завод с/г машын у Гомелі; б) дрэваапрацоўчая фабрыка ў Барысаве:**
1) правільна а);
2) правільна б);
3) два сцвярджэнні правільныя;
4) два сцвярджэнні няправільныя.

**29. Большая частка зямлі ў ЗБ належала:**
1) сялянам;
2) купцам;
3) памешчыкам;
4) дзяржаве.

**30. Канцэнтрацыйны лагер у Бярозе-Картузскай быў створаны ў ... годзе.**

Репозиторий ВГУ

## Тэма 14. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны (1939–1945 гг.).

1. *БССР напярэдадні вайны: эканамічны патэнцыял і ступень ваеннай гатоўнасці.*
2. *Напад фашысцкай Германіі на СССР, абарончыя баі на тэрыторыі БССР.*
3. *Акупацыйны рэжым. Калабарацыя на Беларусі ў гады ВАВ.*
4. *Партызанскі рух і падпольная барацьба на тэрыторыі Беларусі.*
5. *Вызваленне Беларусі. Ваенна-палітычнае і стратэгічнае значэнне разгрому гітлераўцаў у Беларусі.*
6. *Вынікі вайны для Беларусі.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* "Барбароса", "Бліцкрыг", "Зялёная папка", "Ост", "новы парадак", "Прыпяцкія балоты", "Балотная ліхаманка", партызанская зона, "Котбус", "СБМ", "рэйкавая вайна" "канцэрт", калабаранты, "Цэнтр", гета, БНС, БЦР, "праведнік народаў свету".

*Асобы:* П. Панамарэнка, П. Калінін, У. Бумажкоў, Ф. Паўлоўскі, М. Шмыроў, П. Машэраў, І. Кавалёў, І. Казінец, Налепка Ян, П. Гаўрылаў, А. Кіжаватаў, А. Фамін, М. Гастэла, М. Раманаў, І. Флёраў, Д. Паўлаў, І. Баграмян, К. Ракасоўскі. Г. Захараў. І. Чарняхоўскі, Г. Жукаў, А. Васілеўскі, Н. Купрыянава, П. Рак, браты Цубы, К. Мазураў, В. Корж, В. Талаш, А. Мазанік, Н. Траян, М. Восіпава, Е. Зенькова, В. Харужая, З. Партнова.

*Храналогія:* падпісанне дагавора аб ненападзе паміж СССР і Германіяй, пачатак Другой сусветнай вайны, пачатак ВАВ, захоп немцамі г. Мінска, абарона г. Магілёва, захоп гітлераўцамі г. Віцебска, першае выкарыстанне кацюш, акупацыя ўсёй тэрыторыі Беларусі, час існавання Віцебскіх (Суражскіх) "варот", стварэнне ЦШПР, стварэнне БШПР, знішчэнне фашыстамі в. Хатынь, знішчэнне В. Кубэ, вызваленне першага раённага цэнтра Беларусі, ... абласнога цэнтра Беларусі, 3-ы этапы "рэйкавай вайны", пачатак аперацыі "Баграціён", вызваленне Віцебска, Мінска, Брэста.

**Крыніцы:**


1. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост.: И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Мн., 2000.
2. Хрестоматия по истории БССР. 1917–1983 / сост.: А.П. Игнатенко, В.Н. Сидорцов, П.З. Савочкин, А.И. Сидоренко. – Мн., 1984.


**Літаратура абавязковая**:


1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX–XX стагоддзі.




Репозиторий ВГУ

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2006. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг.
3. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1995. – Ч. 2.
4. Экономическая история Беларуси: учебн. пособие / под ред. проф. В.И. Голубовича. – 3-е изд. доп. – Мн., 2004.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т.– Мн., 1993–2003. – Т. 6, кн. 1–2.


**Літаратура дадатковая**:


1. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945. – Мн., 2005.
2. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945. Энцыклапедыя. – Мн., 1990.
3. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы ВОВ. – Мн., 1983–1985. – Т. 1–3.
4. Каваленя А.А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць. – Мн., 1999.
5. Літвін А.М. Акупацыя Беларусі. Праблемы супраціву і калабарацыі. – Мн., 2000.
6. Нацистская политика геноцида и “выжженной земли” в Белоруссии (1941–1944). – Мн., 1984.
7. Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941–1944). – Мн., 1995.
8. Освобожденная Беларусь: документы и материалы: в 2 кн. – Мн., 2004–2005.
9. Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. – Мн., 1993.


У першым пытанні трэба ахарактарызаваць сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і ваеннае становішча Беларусі напярэдадні Другой сусветнай вайны. Пры гэтым неабходна засяродзіць увагу на такіх момантах, як стан прамысловасці і сельскай гаспадаркі Беларусі і мерапрыемствы ўлад па падрыхтоўцы гэтых галін н/г да працы ў ваенных умовах. Тут жа трэба звярнуць увагу на мерапрыемствы ваеннага характару, якія праводзіліся ўладамі на выпадак вайны, прааналізаваць іх эфектыўнасць і своечасовасць. Звярніце таксама ўвагу на агульнапалітычныя мерапрыемствы, якія ўлады праводзілі (ці не праводзілі) каб падрыхтаваць насельніцтва да вайны. Зрабіце высновы аб ступені гатоўнасці Беларусі да вайны.

У другім пытанні ахарактарызуйце баявыя дзеянні на Беларусі ў пачатку ВАВ. Растлумачце прычыны няўдач ЧА на першым этапе вайны. Пакажыце мужнасць і гераізм чырвонаармейцаў, цывільнага насельніцтва пры абароне Айчыны. Дайце ацэнку дзейнасці ЧА на пачатковым этапе вайны і зрабіце адпаведныя высновы.

Репозиторий ВГУ

У трэцім пытанні трэба ахарактарызаваць мэты фашысцкіх акупантаў на Беларусі і сродкі, з дапамогай якіх гітлераўцы імкнуліся іх дасягнуць. Прааналізуйце эканамічную палітыку немцаў, адміністрацыйнае дзяленне Беларусі, сацыяльныя мерапрыемствы і мерапрыемствы палітычнага характару. Пакажыце стаўленне фашыстаў да нацыянальнага беларускага пытання. У гэтым жа пытанні растлумачце паняцце "калабарацыя" і дайце характарыстыку дзеянням калабарантаў на тэрыторыі нашай краіны ў гады ВАВ.

У чацвёртым пытанні пакажыце стаўленне беларускага народа да акупантаў. Ахарактарызуйце спосабы барацьбы нашага народа з акупантамі. Вызначце размах народнага супраціву. Адзначце цяжкасці і праблемы. На канкрэтных прыкладах дакажыце, што нашы продкі праяўлялі ў гэтай барацьбе сапраўдную мужнасць і гераізм.

У пятым пытанні пакажыце, калі пачалося вызваленне Беларусі, якія воінскія сілы і сродкі былі пры гэтым задзейнічаны. Ахарактарызуйце таксама ўклад беларускіх партызан і падпольшчыкаў у вызваленне нашай рэспублікі. Вызначце ваенна-стратэгічнае значэнне беларускай наступальнай аперацыі для далейшага ходу вайны.

У шостым пытанні ахарактарызуйце становішча Беларусі пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Звярніці ўвагу на становішча эканомікі, культуры, колькасць насельніцтва. Прааналізуйце ўскосныя страты беларускага народа ў выніку гэтай вайны. Адначасова пакажыце ўклад беларусаў у перамогу народаў свету над фашызмам.

## Тэсты для самакантролю

**1. План "маланкавай вайны" Германіі супраць СССР называўся ... .**

**2. Прататыпам аднаго з герояў рамана К. Сіманава "Жывыя і мёртвыя" генерала Сярпіліна стаў герой абароны Магілёва ...? (прозвішча).**

**3. Другая сусветная вайна пачалася:**

1) 1 верасня 1939 г.;
2) 2 верасня;
3) 3 верасня;
4) 4 верасня.

**4. У пачатку ВАВ так званая шкляная артылерыя ўпершыню была выкарыстана пры абароне горада:**

1) Брэста;
2) Мінска;
3) Гродна;
4) Магілёва.



Рэпазіторый ВГУ

**5. Назавіце горад, абарону якога летам 1941 г. савецкія войскі трымалі 23 дні?**

**6. На пачатку ВАВ камандуючы Заходнім фронтам З. Паўлаў:**

1) загінуў у баі;
2) быў пераведзены ў штрафную роту;
3) быў расстраляны;
4) трапіў у палон.

**7. Напрамак контрудару войскаў Заходняга фронту ў пачатковы перыяд ВАВ, у ходзе якога адбыўся адзін з буйнейшых танкавых баёў, – гэта:**

1) Беласток – Сувалкі;
2) Рагачоў – Жлобін;
3) Сянно – Лепель;
4) Шчучын – Гродна.

**8. Адна з галоўных прычын няўдач ЧА ў баях на тэрыторыі БССР у пачатку ВАВ – гэта:**

1) непадрыхтаванасць да абарончай тактыкі вядзення баявых дзеянняў;
2) 4-разовая перавага нямецкай арміі ў жывой сіле;
3) пераход ЧА да кадравай сістэмы камплектацыі;
4) зрыў плана "маланкавай вайны".

**9. Уся тэрыторыя Беларусі была акупіравана фашысцкімі захопнікамі:**

1) ў чэрвені 1941 г.;
2) ліпені 1941 г.;
3) да пачатку верасня 1941 г.;
4) да пачатку кастрычніка 1941 г.

**10. Камандуючы Заходняй асобай ваеннай акругай у першыя дні вайны – гэта ... (прозвішча).**

**11. Германскі план знішчэння і каланізацыі народаў СССР называўся:**

1) "Вайс";
2) "Фатэрлянд";
3) "Барбароса";
4) "Ост".

**12. Галоўныя мэты і задачы германскай эканамічнай палітыкі ў СССР былі запісаны ў спецыяльных "дырэктывах", якія змяшчаліся ў так званай "..." папцы.**

**13. У абароне сталіцы Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прымала ўдзел 100-я дывізія пад камандаваннем:**

1) палкоўніка Куцепава;
2) генерал-маёра Русіянава;
3) генерала Ватуціна;
4) генерала Чуйкова.



Рэпазіторый ВГУ

**14. Пасля ўз’яднання ЗБ з БССР на новай мяжы будаваліся ўмацаванні:**

1) “лінія Леніна”;
2) “лінія Сталіна”;
3) “лінія Керзана”;
4) “лінія Молатава”.

**15. Назавіце горад, каля якога ўпершыню ў час ВАВ былі выкарыстаны кацюшы?**

**16. У час ВАВ камсамольская падпольная арганізацыя “Юныя мсціўцы” дзейнічала ў:**

1) Віцебску;
2) Оршы;
3) Обалі;
4) Асіповічах.

**17. Адну з самых буйных дыверсій ВАВ здзейсніў на чыгуначным вузле ў Асіповічах у ліпені 1943 г. камсамолец:**

1) У. Амельянюк;
2) Ф. Крыловіч;
3) І. Казінец;
4) К. Заслонаў.

**18. Першы вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў абласны цэнтр Беларусі – гэта:**

1) Віцебск;
2) Магілёў;
3) Гомель;
4) Гродна.

**19. Аперацыю па знішчэнню гаўляйтэра Беларусі Кубэ здзейснілі:**

1) Матусевіч, Казінец, Баран;
2) Бумажкоў, Паўлоўскі;
3) Мазанік, Осіпава, Траян;
4) Харужая, Заслонаў.

**20. Назавіце сучасны абласны цэнтр Беларусі, які быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у лістападзе 1943 г.?**

**21. Камандуючы 3-м Беларускім фронтам у ходзе аперацыі “Баграціён” быў ... (прозвішча).**

**22. Лінія савецка-германскага фронту к лету 1944 г. уяўляла сабой выступ, вядомы як ... .**

**23. ЦШ партызанскага руху быў створаны ў:**

1) лістападзе 1941 г.;
2) студзені 1942 г.;
3) маі 1942 г.;
4) верасні 1942 г.



Репозиторий ВГУ

**24. 40-кіламетровы прарыў у лініі савецка-германскага фронту, які атрымаў назву “Віцебскія вароты”, утварыўся ў:**

1) лістападзе 1941 г.;
2) лютым 1942 г.;
3) верасні 1942 г.;
4) студзені 1943 г.

**25. Кіраўнік падпольнай групы, якая дзейнічала на Аршанскім чыгуначным вузле, гэта ... (прозвішча).**

**26. Кодавая назва Беларускай наступальнай аперацыі ЧА ў 1944 г. – гэта ... .**

**27. Другі этап “рэйкавай вайны” пад назвай “Канцэрт” праводзіўся, калі:**

1) адбывалася Сталінградская бітва;
2) ЧА пачала контрнаступленне пад Курскам;
3) ЧА ўступіла на тэрыторыю БССР;
4) адбывалася Беларуская наступальная аперацыя.

**28. Назавіце горад, каля якога ў час ВАВ знаходзіўся самы буйны на тэрыторыі СССР фашысцкі лагер смерці?**

**29. Партызанскі парад у Мінску, прысвечаны вызваленню сталіцы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адбыўся:**

1) 3 ліпеня 1944 г.;
2) 6 ліпеня 1944 г.;
3) 16 ліпеня 1944 г.;
4) 17 ліпеня 1944 г.

**30. Пры вызваленні Мінска 3 ліпеня 1944 г. першым уварваўся ў горад танк камандзіра ўзвода:**

1) Галавачова;
2) Рака;
3) Шутава;
4) Фролікава.

## Тэма 16. БССР з сярэдзіны 1950-х – канцы 1980-х гг. ХХ ст.

1. *Сацыяльна-эканамічнае становішча рэспублікі.*
2. *Грамадска-палітычнае жыццё.*
3. *Міжнародная дзейнасць БССР.*
4. *Стан культуры на Беларусі ў 1945–1990 гг.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* саўнаргас, сямігодка, меліярацыя, хімізацыя, нацыяналістычная ідэалізацыя мінулага, фармалістычны антынародны накірунак у музыцы, “развіты сацыялізм”, камунізм.

*Асобы:* К.В. Кісялёў, П.К. Панамарэнка, М.І. Гусараў, М.С. Патолічаў, К.Т. Мазураў, П.М. Машэраў, Л.Ф. Цанава, З.І. Азгур,

Репозиторий ВГУ

В.У. Быкаў, К.К. Крапіва, А.А. Куляшоў, А.Р. Жэбрак, В.Ф. Купрэвіч, А.Я. Макаёнак, М.А. Барысевіч, П.В. Саевіч, С.В. Прытыцкі, П.Е. Панчанка, І.П. Мележ, У.С. Караткевіч.

*Храналогія:* пачатак выпуску першых аўтамабіляў на МАЗе, адмена картачнай сістэмы ў БССР, пачатак серыйнага выпуску трактароў на Мінскім трактарным заводзе, зацвярджэнне дзяржаўнага сцяга БССР, уступленне БССР у ЮНЕСКА, стварэнне СНГ БССР, пачатак выпуска аўтамабіляў на БелАЗе, прыняцце Канстытуцыі "развітога сацыялізму", пачатак масавага пераходу да ўсеагульнай сямігадовай адукацыі, адкрыццё манумента Перамогі ў Мінску, адкрыццё мемарыяльнага комплексу "Хатынь", прысваенне Мінску звання "Горад-Герой", 22-я Алімпійскія гульні ў Мінску, адкрыццё першай чаргі Мінскага метрапалітэна, аварыя на ЧАЭС, першыя выбары народных дэпутатаў СССР на альтэрнатыўнай аснове, устаноўчы з'езд БНФ "Адраджэнне, Закон "Аб мовах у Беларускай ССР", прыняцце Вярхоўным Саветам БССР "Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР".

**Крыніцы:**


1. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост.: И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Мн., 2000.
2. Хрестоматия по истории БССР. 1917–1983 / сост.: А.П. Игнатенко, В.Н. Сидорцов, П.З. Савочкин, А.И. Сидоренко. – Мн., 1984.


**Літаратура абавязковая:**


1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX–XX стагоддзі.
2. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1995. – Ч. 2.
3. Экономическая история Беларуси: учебн. пособие / под ред. проф. В.И. Голубовича. – 3-е изд. доп. – Мн., 2004.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993–2003. – Т. 6, кн. 1–2.


**Літаратура дадатковая:**


1. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў/ І.М. Абрамаў [і інш.]. – Мн., 2000.
2. Мірановіч Я. Найноўшая гісторыя Беларусі. – СПб., 2003.
3. Сарокін А.М. На ростанях айчыннай гісторыі: Беларуская вёска: Ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917–1990-я гг.). – Мн., 1999.
4. Снапковский В.Е. Белорусская ССР в ООН (1945–1985 гг.). – Мн., 1985.


Репозиторий ВГУ

5. Снапкоўскі У.Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі 1944–1953 гг. – Мн., 1997.
6. Старонкі гісторыі савецкага грамадства: Факты, праблемы, людзі. – Мн., 1990.
7. Сяргеева Г. Беларуская дыяспара і дзяржаўная палітыка: набыткі і праблемы // Бел. гіст. часопіс. – 1993. – № 2. – С. 72–78.

У першым пытанні ахарактарызуйце асноўныя накірункі развіцця эканомікі БССР у азначаны перыяд. Пакажыце дасягненні, вызначце фактары, якія тармазілі развіццё. Спыніцеся на спробах рэфармавання эканомікі і іх выніках. Паспрабуйце сфармуляваць прычыны крызісу сацыялістычнай сістэмы гаспадарання.

У другім пытанні ахарактарызуйце асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага развіцця рэспублікі. Пакажыце, якія палітычныя сілы вызначалі накірункі развіцця грамадства ў гэты час, наколькі шырока брала ўдел у кіраванні дзяржавай насельніцтва. Параўнайце перыяд “адлігі” і “застою”. Зрабіце неабходныя высновы.

У трэцім пытанні спыніцеся на аналізе міжнароднай дзейнасці БССР. Пакажыце асноўныя накірункі гэтай працы, вызначце ступень самастойнасці рэспублікі ў гэтай сферы і ступень уплыву Беларусі на міжнародныя справы. Зрабіце адпаведныя высновы.

У чацвёртым пытанні ахарактарызуйце асноўныя накірункі развіцця адукацыі, навукі, літаратуры, жывапісу, скульптуры і архітэктуры ў 40–80-х гадах ХХ ст. На канкрэтных прыкладах пакажыце поспехі рэспублікі ў названых складніках культуры. Вызначце і ахарактарызуйце фактары, што перашкаджалі развіццю культуры. Параўнайце сучасны стан беларускай культуры з названым перыядам. Зрабіце адпаведныя высновы.

## Тэсты для самакантролю

**1. Аднаўленне разбуранай нямецка-фашысцкімі захопнікамі народнай гаспадаркі Беларусі пачалося ў ... годзе.**

**2. Мадэрнізацыя прамысловасці БССР у 1950-х – першай палове 1960-х гг. праявілася ў(ва):**

1) высокіх тэмпах развіцця радыётэхнічнай і радыёэлектроннай прамысловасці;
2) укараненні механізацыі і аўтаматызацыі ў вытворчасць;
3) шырокай аўтаматызацыі сферы быту;
4) пераходзе на інтэнсіўны шлях развіцця н/г.

Рэпазіторый ВДУ

**3. Рашэннямі сакавіцкага 1965 г. Пленума ЦК КПСС у галіне аграрнай палітыкі з'яўляліся:**

1) давядзенне цвёрдых планаў дзяржаўных закупак прадуктаў с/г;

2) павышэнне закупачных цэн на с/г прадукцыю;

3) зніжэнне памераў падсобных гаспадарак калгаснікаў;

4) павелічэнне планавых паказчыкаў для с/г.

**4. Асноўным напрамкам развіцця прамысловасці ў пасляваеннай Беларусі ў 1946–1950 гг. быў паскораны рост:**

1) лёгкай прамысловасці;

2) машынабудавання;

3) паліўнай прамысловасці, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў;

4) харчовай прамысловасці.

**5. Для эканамічнага развіцця БССР у IV пяцігодцы было характэрна:**

1) перавага эканамічных рычагоў над адміністрацыйнымі;

2) перавага адміністрацыйных рычагоў над эканамічнымі;

3) заахвочванне прыватнай ініцыятывы;

4) выкарыстанне рынкавых метадаў у кіраванні эканомікай.

**6. Эканамічная рэформа ў СССР у сярэдзіне 60-х гг. XX ст. прадугледжвала:**

1) увядзенне элементаў рынparam эканомікі;

2) пераход ад тэрытарыяльнага да галіновага прынцыпу кіравання эканомікай;

3) увядзенне тэрытарыяльнага прынцыпу кіравання эканомікай;

4) абмежаванне правоў прадпрыемстваў.

**7. Прычынамі замаруджвання тэмпаў эканамічнага развіцця Беларусі на пачатку 80-х гг. XX ст. сталі:**

1) экстэнсіўны шлях развіцця прамысловасці;

2) распыленне капітальных укладанняў;

3) адміністрацыйна-камандная сістэма кіравання;

4) значны рост капіталаўкладанняў у с/г.

**8. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| 1) зніжэнне падаткаў на падсобныя с/г у 2 р.; | А) 1982 г.; |
| 2) пачатак удзелу беларускай моладзі ў асваенні цаліны; | Б) 1953 г.; |
| 3) прыняцце харчовай праграмы; | В) 1984 г.; |
| 4) увядзенне ў строй першай чаргі мінскага метро; | Г) 1956 г. |

**9. Выпуск трактароў на Мінскім трактарным заводзе пачаўся ў ... годзе.**

**10. Да сярэдзіны 1980-х гг. наспяванне крызісных з'яў у эканоміцы БССР паскорыла(і):**

1) аднаўкладная дзяржаўная эканоміка;

2) павышэнне эканамічнай самастойнасці прадпрыемстваў;



Репозиторий ВГУ

3) адміністрацыйна-камандныя метады кіраўніцтва эканомікай;

4) цэнтралізаванае кіраўніцтва прадпрыемствамі.

**11. Дэлегацыя БССР падпісала Статут ААН у:**

1) сакавіку 1944 г.;

2) лютым 1945 г.;

3) красавіку 1945 г.;

4) чэрвені 1945 г.

**12. Адзін з першых сакратароў ЦК КПБ у 1945–1965 гг., выхадзец з Беларусі, – гэта:**

1) Панамарэнка;

2) Гусараў;

3) Патолічаў;

4) Мазураў.

**13. У сувязі з уваходжаннем БССР у склад ААН адбылося:**

1) зацвярджэнне Дзяржаўнага сцяга БССР;

2) прыняцце новай Канстытуцыі;

3) наданне поўнай самастойнасці рэспубліцы ў галіне міжнародных адносін;

4) адкрыццё факультэта міжнародных адносін БДУ.

**14. Курс на мірнае суіснаванне капіталістычнай і сацыялістычнай сістэм быў вызначаны:**

1) на міжнароднай канферэнцыі ў Сан-Францыска;

2) на ХХ з'ездзе КПСС;

3) у Канстытуцыі СССР 1977 г.;

4) у Фултане Чэрчылем.

**15. З'езд КПСС, які прыняў праграму пабудовы камунізму, адбыўся ў:**

1) 1952 г.;

2) 1956 г.;

3) 1961 г.;

4) 1971 г.

**16. Курс КПСС у другой палове 80-х гг. ХХ ст., скіраваны на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця і дэмакратызацыю грамадска-палітычнага развіцця, – гэта ... .**

**17. Кіруючая роля ў савецкім грамадстве ў канцы 1970-х – 1980-я гг., згодна Канстытуцыі 1977 г., належала ... (абрывіятура).**

**18. Група дэпутатаў, погляды якой не супадаюць або супярэчаць думкам парламенцкай большасці ці ўладзе, – гэта ... .**

**19. Новая гістарычная супольнасць людзей, аб узнікненні якой было заяўлена на 24 з'ездзе КПСС і замацавана ў Канстытуцыі 1977 г., – гэта ... .**

Репозиторий ВГУ

**20. Развіццё БССР у 2-й палове 1980-х гг. характарызавалася:**

1) дэсталінізацыяй грамадства ва ўмовах “адлігі”;

2) прыняццем курса на паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця;

3) паступовым наспяваннем застойных з’яў у палітычным і эканамічным жыцці;

4) пераўтварэннем БССР у індустрыяльна развітую рэспубліку.

**21. Суаднесіце:**

| | |
|---|---|
| 1) Шамякін; | А) “Я з вогненнай вёскі”; |
| 2) Адамовіч; | Б) “Глыбокая плынь”; |
| 3) Мележ; | В) “Векапомныя дні”; |
| 4) Лынькоў; | Г) “Канстанцін Заслонаў”; |
| | Д) “Мінскі напрамак”. |

**22. Суаднесіце:**

| | |
|---|---|
| 1) Зайцаў; | А) “Палонных вядуць”; |
| 2) Волкаў; | Б) “Абарона Брэсцкай крэпасці”; |
| 3) Ахрэмчык; | В) “Мінск. 3 ліпеня 1944 г.”; |
| 4) Шыбнёў; | Г) “Парад беларускіх партызан у 1944 г. у Мінску”; |
| | Д) “За родную Беларусь”. |

**23. Аўтарам рамана “Кар’ер” з’яўляецца:**

1) Мележ;

2) Быкаў;

3) Адамовіч;

4) Шамякін.

**24. Быў удастоены сталінскай прэміі за паэму “Сцяг брыгады”:**

1) Грахоўскі;

2) Крапіва;

3) Гілевіч;

4) Куляшоў.

**25. Устанавіце паслядоўнасць:**

1) запуск першага штучнага спадарожніка ў космас;

2) выпуск першага аўтамабіля на БелАЗе;

3) пачатак работы тэлецэнтра ў Мінску;

4) выпуск першага трактара на МТЗ.

**26. Устанавіце паслядоўнасць:**

1) адкрыццё мемарыяльнага комплексу “Хатынь”;

2) прысваенне Мінску звання “Горад-герой”;

3) адкрыццё мемарыяльнага комплексу “Брэсцкая крэпасць-герой”;

Репозиторий ВГУ

4) выхад на экраны мастацкага кінафільма “Канстанцін Заслонаў”.

**27. Аўтар адноўленага крыжа Е. Полацкай – гэта ... .**

**28. Аўтарам п’есы “Заложнікі” з’яўляецца ... .**

**29. Прэзідэнтам АН БССР у 1969–1987 гг. быў ... .**

**30. Перавод 11-гадовых школ на 10-гадовы тэрмін навучання быў ажыццёўлены ў сярэдзіне 19...-х гадоў.**

**31. Манумент у гонар маці-патрыёткі Н. Купрыянавай і яе пяці сыноў, якія ўдзельнічалі ў ВАВ, быў узведзены ў горадзе:**

1) Мінску;
2) Барысаве;
3) Жодзіне;
4) Оршы.

**32. У 1965 г. на тэрыторыі БССР налічвалася ... універсітэтаў.**

## Тэма 17. Рэспубліка Беларусь у 1991–2009 гг.

1. *Абвяшчэнне незалежнасці РБ.*
2. *Эканамічнае і палітычнае развіццё РБ у 1994–2009 гг.*
3. *Беларусь на міжнароднай арэне.*
4. *Дасягненні і праблемы нацыянальна-культурнага адраджэння.*

*Асноўныя паняцці, тэрміны, назвы:* Рэспубліка Беларусь, СНД, дэнансацыя, ратыфікацыя, інфляцыя, фермерства, Канстытуцыя РБ 1994 г., парламенцкая рэспубліка, прэзідэнцкая рэспубліка, Вярхоўны Савет РБ, Прэзідэнт РБ, “вертыкаль”, сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка, рэферэндум, рэферэндумы 1995 і 1996 гг., Нацыянальны сход, Палата прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі, Супольнасць Беларусі і Расіі, Саюз Беларусі і Расіі, Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, дзяржаўны суверэнітэт, унітарная дэмакратычная сацыяльна арыентаваная прававая дзяржава.

*Асобы:* М. Дзямянцей, С. Шушкевіч, М. Грыб, С. Шарэцкі, В. Кебіч, З. Пазняк, А. Лукашэнка, В. Елізар’еў, М. Пташук, Я. Батальёнак, А. Кузьміч.

*Храналогія:* прынясце Вярхоўным Саветам рашэння аб змене назвы БССР на РБ, прыняцце Закона “Аб дзяржаўным сцягу РБ”, і “Аб дзяржаўным гербе РБ”, падпісанне пагадненняў ў Віскулях, прыняцце Канстытуцыі РБ, першы рэферэндум у РБ, другі ..., трэці... .

**Крыніцы:**

1. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост.: И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец. – Мн., 2000.



Рэпазіторый ВДУ

**Літаратура абавязковая:**

1. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX –XX стагоддзі.
2. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мн., 1995. – Ч. 2.
3. Экономическая история Беларуси: учебн. пособие / под ред. проф. В.И. Голубовича. – 3-е изд. доп. – Мн., 2004.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т.– Мн., 1993–2003. – Т. 6, кн. 1–2.

**Літаратура дадатковая:**

1. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / І.М. Абрамаў [і інш.] – Мн., 2000.
2. Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. – Мн., 2003.
3. Мірановіч Я. Найноўшая гісторыя Беларусі. – СПб., 2003.
4. Парашкоў С.А. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн., 2003.

У першым пытанні ахарактарызуйце працэс станаўлення дзяржаўнага суверэнітэту РБ. Пакажыце рух за дзяржаўны суверэнітэт. Звярніце ўвагу на Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце 1990 года, змену назвы краіны, белавежскія пагадненні, стварэнне СНД, прыняцце Канстытуцыі РБ, выбары першага Прэзідэнта РБ, дзяржаўную сімволіку.

У другім пытанні дайце характарыстыку асноўных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі. Пры гэтым звярніце ўвагу на: эканамічнае становішча РБ у першай палове 1990-х гадоў, пошук шляхоў пераходу да рынкавай эканомікі. Растлумачце сутнасць беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Пакажыце змены ў матэрыяльным становішчы насельніцтва. Вызначце накірункі знешнеэканамічнай дзейнасці краіны. Растлумачце сутнасць маладзёжнай палітыкі РБ.

У трэцім пытанні спыніцеся на аналізе знешнепалітычнай дзейнасці РБ. Прааналізуйце працэс фарміравання і знешнепалітычныя накірункі дзейнасці нашай краіны. Пакажыце дзейнасць Беларусі ў ААН. Ахарактарызуйце ўзаемаадносіны Беларусі і Расіі, Беларусі і краін Еўрасаюза, Беларусі і Кітая, Беларусі і краін Лацінскай Амерыкі, Беларусі і краін Блізкага Усходу.

У чацвёртым пытанні дайце характарыстыку развіцця навукі, адукацыі, беларускай літаратуры, выяўленчага, тэатральнага і музычнага мастацтваў. Параўнайце маючыяся здабыткі ў гэтай сферы з папярэднім этапам. Зрабіце адпаведныя высновы.

Рэпазіторый ВДУ

## Тэсты для самакантролю

**1. Рыначныя рэформы ў Беларусі ў 2-й палове 1990-х гг. характарызуюцца:**

1) стварэннем буйных прыватных капіталаў;

2) дзяржаўным рэгуляваннем эканомікі;

3) неабмежаванай прыватызацыяй;

4) дэмантажом калгасна-саўгаснай вытворчасці.

**2. Абясцэньванне грошай у выніку выпуску іх у абарачэнне без забеспячэння неабходнай колькасцю тавараў і падзенне пакупной здольнасці грошай – гэта ... .**

**3. Выбары Прэзідэнта ў РБ праводзіліся ў:**

1) 1992 г.;

2) 1996 г.;

3) 2001 г.;

4) 2002 г.

**4. Апошнія прэзідэнцкія выбары ў РБ адбыліся ў:**

1) 2004 г.;

2) 2005 г.;

3) 2006 г.;

4) 2007 г.

**5. СНД быў утвораны ў ... годзе.**

**6. Канстытуцыя РБ была прынята … (месяц і год).**

**7. Назва нашай краіны "Рэспубліка Беларусь" была зацверджана:**

1) 19 верасня 1990 года;

2) ...1991 г.;

3) ...1992 г.;

4) ...1993 г.

**8. Рэспубліканскі рэферэндум на конт дзяржаўнага статута рускай мовы, новай дзяржаўнай сімволікі (герба і сцяга), эканамічнай інтэграцыі з Расіяй, правоў Прэзідэнта адбыўся ў ... годзе.**

**9. Першы рэферэндум у РБ адбыўся ў ... годзе.**

**10. Другі рэферэндум у РБ адбыўся ў ... годзе.**

**11.Устанавіце правільную паслядоўнасць:**

1) Падпісанне дагавора аб стварэнні Садружнасці РБ і РФ;

2) Перанос святкавання Дня Незалежнасці ў РБ з 27 на 3 ліпеня;

3) Прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэці БССР);

4) Дэнансацыя дагавора аб утварэнні СССР.

**12. Саюз Беларусі і Расіі быў створаны раней за першыя выбары Прэзідэнта ў РБ (так, не)?**



Репозиторий ВГУ

**13. Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі была створана ў ... годзе.**

**14.Трэці рэферэндум у РБ быў праведзены ў ... годзе.**

**15. На трэці рэферэндум у РБ былі вынесены пытанні:**

1) Змяненні ў Канстытуцыі РБ, звязаныя з парадкам правядзення выбараў Прэзідэнта РБ;
2) Прыняцце новай рэдакцыі К. РБ;
3) Падпісанне дагавора аб утварэнні СНД;
4) Дзяржаўнай сімволікі.

**16. Прыкметамі прававой дзяржавы з'яўляюцца:**

1) роўнасць усіх перад законам;
2) існаванне ў дзяржаве ўрада;
3) існаванне Прэзідэнта;
4) абавязковае выкананне ўсімі дзяржаўнымі органамі законаў.

**17. Адзінай крыніцай улады ў РБ з'яўляецца:**

1) Прэзідэнт;
2) урад;
3) парламент;
4) народ.

**18. Згодна новай рэдакцыі Канстытуцыі РБ галавой дзяржавы з'яўляецца:**

1) Прэзідэнт;
2) урад;
3) парламент;
4) народ.

**19. Прадстаўнічы і заканадаўчы орган улады ў РБ – гэта:**

1) Прэзідэнт;
2) урад;
3) парламент;
4) народ.

**20. Выканаўчую ўладу ў РБ ажыццяўляе:**

1) Прэзідэнт;
2) урад;
3) парламент;
4) народ.

**21. Раздзяржаўленне, перадача часткі аб'ектаў з дзяржаўнай уласнасці ў прыватную – гэта ... .**

**22. Мадэль сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі прадугледжвае:**

1) Улік таварна-грашовых адносін;
2) адмову ад рыначных адносін;
3) неўмяшальніцтва дзяржавы ў эканамічныя працэсы;
4) жорсткае дзяржаўнае кіраўніцтва эканомікай.



Репозиторий ВГУ

**23. Накірункам сацыяльна-эканамічнага развіцця РБ у 1991–2005 гг. з’яўлялася:**

1) увядзенне рыначных цэн;

2) адмова ад рыначных цэн;

3) пяцігадовыя планы развіцця н/г;

4) шматгадовыя планы развіцця.

**24. Накірункам грамадска-палітычнага развіцця РБ у 1991–2005 гг. з’ялялася:**

1) складванне аднапартыйнай сістэмы;

2) фарміраванне шматпартыйнасці;

3) ліквідацыя прынцыпу падзелу ўлады на судовую, заканадаўчую і выканаўчую;

4) ліквідацыя прафсаюзаў.

**25. Знешнепалітычны курс РБ у 1991–2005 гг. прадугледжваў:**

1) шматвектарнасць знешняй палітыкі;

2) арыентацыя толькі на Расію;

3) спыненне ўсякіх кантактаў з ЗЕ;

4) арыентацыю пераважна на краіны Блізкага Усходу.

**26. Дзень Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба РБ адзначаецца кожны год:**

1) у другую нядзелю красавіка;

2) ... мая;

3) ... чэрвеня;

4) ... ліпеня.

**27. Першым Героем РБ стаў:**

1) П. Пракаповіч;

2) У. Карват;

3) А. Лукашэнка;

4) У. Шчэрба.

**28. Форма дзяржаўнай пабудовы, пры якой тэрыторыя дзяржавы не мае ў сваім складзе федэратыўных адзінак, а падзяляецца на адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі называецца ... .**

**29. Прававая прыналежнасць асобы да пэўнай дзяржавы называецца ... .**

**30. БРСМ быў створаны ў:**

1) 2000 г.;

2) 2001 г.;

3) 2002 г.;

4) 2003 г.

Репозиторий ВГУ

# ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ

## III семестр

1. Тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел, органы кіравання і суды на Беларусі ў выніку далучэння да РІ ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.
2. Сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы і першыя пераўтварэнні ў галіне культуры і асветы на Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. на Беларусі.
3. Канфесійная палітыка РІ на Беларусі ў к. XVIII – пачатку XIX ст.
4. Расійска-французскія адносіны і палітычная сітуацыя ў заходніх губернях РІ напярэдадні вайны 1812 г.
5. Пачатак вайны 1812 г. Баявыя дзеянні на Беларусі летам 1812 г.
6. Акупацыя Беларусі войскамі Напалеона. Французскі акупацыйны рэжым.
7. Насельніцтва Беларусі і яго адносіны да Напалеона ў гады акупацыі: пазіцыі шляхты, мяшчанства, сялянства.
8. Ваенныя дзеянні на Беларусі восенню 1812 г. Вынікі вайны для Беларусі.
9. Грамадска-палітычны рух на Беларусі ў першай чвэрці XIX ст.
10. Паўстанне 1830–1831 гг. у Літве і Беларусі: мэта, праграма, дзеянні, вынік.
11. Грамадска-палітычны рух на Беларусі ў 30–50-я гады XIX ст.
12. Палітычная лінія царскага ўрада на Беларусі ў першай чвэрці XIX ст.
13. Палітычная лінія царскага ўрада на Беларусі ў 30–50-х гг. XIX ст.
14. Сельская гаспадарка на Беларусі ў першай палове XIX ст.
15. Прамысловасць на Беларусі ў першай палове XIX ст.
16. Шляхі зносін, гандаль, фінансавая сістэма на Беларусі ў першай палове XIX ст.
17. Гарады і мястэчкі на Беларусі ў першай палове XIX ст.
18. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы і яго праявы на Беларусі ў першай палове XIX ст.

Репозиторий ВГУ

19. Гістарычныя ўмовы развіцця культуры на Беларусі ў першай палове XIX ст.
20. Народная адукацыя і навука на Беларусі ў першай палове XIX ст.
21. Літаратура, музыка і тэатр на Беларусі ў першай палове XIX ст.
22. Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва на Беларусі ў першай палове XIX ст.
23. Адмена прыгоннага права. Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 г.
24. Ваенная, земская, судовая, гарадская, цэнзурная, школьная рэформы на Беларусі.
25. Развіццё сельскай гаспадаркі ва ўмовах усталявання капіталізму на Беларусі ў другой палове XIX ст.
26. Развіццё прамысловасці і рост гарадоў на Беларусі ў другой палове XIX ст.
27. Транспарт, гандаль, фінансавая сістэма на Беларусі ў другой палове XIX ст.
28. Паўстанне 1863–1864 гг. у Беларусі і Літве: прычыны, ход, вынікі.
29. Сялянскі і народніцкі рух на Беларусі ў 60–90-х гг. XIX ст.
30. Рабочы і сацыял-дэмакратычны рух. Пачатак прапаганды марксізму на Беларусі ў другой палове XIX ст.
31. Фарміраванне беларускай нацыі: гістарычныя умовы, сутнасць працэсу, вынікі (XIX – пачатак XX ст.).
32. Асвета, пачатковая і сярэдняя адукацыя на Беларусі ў другой палове XIX ст. – 1914 г.
33. Станаўленне беларускай літаратурнай мовы, развіццё мастацкай літаратуры на Беларусі ў другой палове XIX ст. – 1914 г.
34. Жывапіс, архітэктура, горадабудаўніцтва на Беларусі ў другой палове XIX ст. – 1914 г.
35. Музыка, тэатр на Беларусі ў 60-х гг. XIX ст. – 1914 г.
36. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы на Беларусі ў 1900–1914 гг. Сталыпінская аграрная рэформа.
37. Развіццё прамысловасці на Беларусі ў 1900–1914 гг.
38. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. у Беларусі.
39. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг.

Репозиторий ВГУ

40. Грамадскі рух на Беларусі ў 1907–1914 гг.
41. Першая сусветная вайна на тэрыторыі Беларусі (1914–1917 гг.)
42. Лютаўская рэвалюцыя на Беларусі. Змены органаў улады.
43. Беларускі нацыянальны рух пасля падзення самаўладдзя (люты–верасень 1917 г.).
44. Усталяванне савецкай улады на Беларусі (кастрычнік 1917 – студзень 1918 г.).
45. Першыя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя пераўтварэнні савецкай улады на Беларусі.
46. Палітыка савецкай улады ў нацыянальным пытанні. Першы Усебеларускі з'езд.
47. Ваенная інтэрвенцыя Германіі на Беларусі.
48. Польска-савецкая вайна на тэрыторыі Беларусі.
49. Утварэнне беларускай дзяржаўнасці падчас нямецкай акупацыі. Утварэнне БССР.
50. Стварэнне СССР. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР у 1921–1927 гг.

## IV семестр

1. Эканамічнае і палітычнае становішча на Беларусі на пачатку 20-х гадоў ХХ ст.
2. Тэрыторыя і насельніцтва БССР у пачатку 20-х гадоў. Нацыянальны склад насельніцтва.
3. Увядзенне новай эканамічнай палітыкі ў БССР: яе мэта і сутнасць.
4. НЭП на тэрыторыі БССР: ажыццяўленне, асаблівасці, вынікі.
5. Асноўныя тэндэнцыі ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі ў 20-х гг. ХХ ст. і іх характарыстыка.
6. Палітыка беларусізацыі: мэты, сутнасць, ажыццяўленне.
7. Культурнае жыццё ў БССР у 20-я гады ХХ ст.
8. Індустрыялізацыя ў БССР: неабходнасць, сутнасць, сродкі на ажыццяўленне.
9. Развіццё прамысловасці на Беларусі ў к. 20-х – 30-я гады ХХ ст.

Репозиторий ВГУ

10. Суцэльная калектывізацыя сельскай гаспадаркі на Беларусі: неабходнасць, сутнасць, метады ажыццяўлення.
11. Суцэльная калектывізацыя сельскай гаспадаркі на Беларусі: ход, асаблівасці, вынікі.
12. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў канцы 1920-х – 1930-я гг.
13. Культура БССР у 1930-я гады.
14. Асноўныя рысы беларускага савецкага грамадства канца 30-х гадоў.
15. Заходнебеларускія землі ў складзе Польскай дзяржавы: тэрыторыя, склад насельніцтва, тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел, органы кіравання.
16. Эканамічнае развіццё Заходняй Беларусі у складзе Польскай дзяржавы.
17. Нацыянальная палітыка польскіх улад у ЗБ у 1921–1939 гг.
18. Культура Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы.
19. Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР.
20. БССР напярэдадні нападу Германіі на СССР.
21. Нападзенне фашысцкай Германіі на СССР. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі БССР у чэрвені–жніўні 1941 года.
22. Устанаўленне акупацыйнага рэжыму. Тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел Беларусі. Сістэма акупацыйных органаў і мясцовай улады на акупіраванай немцамі тэрыторыі.
23. Партызанскі рух на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
24. Падпольныя арганізацыі і барацьба з акупантамі ў Мінску, Магілёве, Віцебску, Оршы, Скідалі, іншых раёнах Беларусі.
25. Пачатак вызвалення тэрыторыі Беларусі ў канцы 1943 г. – пачатку 1944 г.
26. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён».
27. Аднаўленчыя мерапрыемствы на вызваленай тэрыторыі Беларусі ў гады вайны.
28. Удзел беларускага народа ў разгроме фашысцкай Германіі і Японіі. Беларусы на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у еўрапейскім руху Супраціўлення. Эвакуіраваныя жыхары Беларусі ў савецкім тыле.

Репозиторий ВГУ

29. Людскія, матэрыяльныя і культурныя страты Беларусі ў час Другой сусветнай вайны.
30. Прамысловасць на Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.
31. Сельская гаспадарка на Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.
32. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў 1945–1955 г.
33. Выхад БССР на міжнародную арэну. 1945–1955 гг.
34. Матэрыяльнае і бытавое становішча насельніцтва Беларусі ў пасляваенныя гады. 1945–1955 гг.
35. Аднаўленне і развіццё культуры на Беларусі ў 1945–1955 гг.
36. Становішча ў сельскай гаспадарцы рэспублікі ў 1955–1985 гг.
37. Структура прамысловасці і яе развіццё на Беларусі ў 1955–1985 гг.
38. Спробы эканамічных рэформ на Беларусі ў 1955–1985 гг.
39. Грамадска-палітычнае жыццё і яго асаблівасці на Беларусі ў 1955–1985 гг.
40. Культурнае жыццё рэспублікі ў 1955–1985 гг.
41. Сацыяльна-эканамічнае становішча рэспублікі ў 1985–1990 гг.
42. Грамадска-палітычнае развіццё і яго асаблівасці ў БССР у 1985–1990 гг.
43. Станаўленне незалежнай Рэспублікі Беларусь. 1990–1994 гг.
44. Станаўленне прэзідэнцкай палітычнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь.
45. Міжнародная дзейнасць Рэспублікі Беларусь. 1991–2009 гг.
46. Сацыяльна-эканамічная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь. 1991–2009.
47. Сучасная палітычная і эканамічная мадэль беларускай дзяржаўнасці.
48. Культурныя працэсы ў Рэспубліцы Беларусь. 1991–2009 гг.
49. Нацыянальныя адносіны ў Рэспубліцы Беларусь, пошук шляхоў вырашэння праблем нацыянальных меншасцяў.
50. Беларускае замежжа.

Рэпазіторый ВГУ